# МІФЫ І ЛЕГЕНДЫ
## Ад Нёмана да Буга

**Міфы і легенды ад Нёмана да Буга**

Рэдактар
Міраслава Лукша

Пераклады:
Мацей Халадоўскі, Кася Кравец, Сяржук Кузьняцоў, Міраслава Лукша, Андрэй Мялешка, Вітаўт Руднік, Аляксей Шота

Графічная і эдытарская апрацоўка:
Барташ Грабоўскі

Карэктура
Рэната Чыжэўская

Здымкі
Марэк Далецкі

Публікацыя сфінансаваная са сродкаў

**Публікацыя выдадзеная ў рамках праектаў:**

Інвентарызацыя і прамоцыя традыцыйных страў і легендаў ды мікракосмас прыроды Беласточчыны і Гродзеншчыны ў супрацоўніцтве з Цэнтрам інфармацыйнай падтрымкі грамадскіх ініцыятыў “Трэці Сектар”

Згуртаванне „Uroczysko”; Agencja ECO-PARTNERS
вул. Пілсудскага 58
16-030 Супрасль
www.uroczysko.pl

ISBN

Супрасль 2007

## Мы з Вялікага княства

Марыяж Вялікага княства Літоўскага і Польскай Кароны працягваўся больш за чатыры стагоддзі. Першая дзяржава з'яднанай Еўропы. Над Нёманам і Бугам у Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў народы дамаўляліся па-старабеларуску, па-літоўску, па-сярэднепольску, ведалі царкоўнаславянскую і габрэйскую мовы. Русіны, палякі, жмудзіны, яўрэі, татары, люд просты і шляхетны пад еўрапейскай, прагрэсіўнай уладай шляхецкай дэмакратыі і законамі Літоўскіх Статутаў жылі тут, ствараючы матэрыяльнае дабро і культуру, змагаючыся за свае звычайнае, людскае шчасце – любоў, дабро, згоду ў сям'і і грамадзе, дабрабыт у родзе і народзе. Сумленна будаваўшы, араўшы і сеяўшы, абараняўшы, навучаўшы ведаў і веры, лечыўшы цела і дух. Весяліўшыся і смуткаваўшы, у адпаведны час. Шукаўшы праўды і гаварыўшы пра знойдзеную. Абараняўшы ад ворагаў. Панаваўшы. Кожнаму дадзенае заданне. Таму, хто ломіць людскае і Боскае права будзе аддадзена належным чынам. Дабро вернецца двойчы. Той хто мячом ваюе, ад мяча і згіне. Суцеха гэта духу смуткуючаму, гэтыя праўды нашых Дзядоў, і навука для спадчыннікаў. Не адно для напаміну ці страху, каб былі верныя слову і веры, ды яшчэ і для яднання люду. На памяць аб гісторыі, традыцыі, аб супольных карэннях, аб месцы, з якога ніколі не выйшла самае страшнае зло – захопніцкая напасць на іншы народ. Там, дзе бачылі чалавека нават у нявольным ці ашалелым...

Наша кніга з'яўляецца плёнам конкурсу, сарганізаванага ў 2007 г. Згуртаваннем „Uroczysko" з Супрасля, аднаго са святых месцаў духа Вялікага княства. Ціхая праца руплівых сучасных шукальнікаў праўды і легенды (43 працы з Польшчы, 1 з Берліна і 9 з Беларусі) хай стане іхнім і нашым унёскам у старадаўнюю скарбніцу.

**Міра Лукша**

**Рафал Сянко**
**Златарыя**

Златарыя гэта малая мясцовасць паміж Тыкоцінам і Беластокам. Жыццё там плыве крыху павальней. У Златарыі ёсць касцёл, школа і аддзяленне пошты. Рака Супрасль мае тут вусце ў Нарву. Багны Нарвы і лясы, што пасля пераходзяць у Кнышынскую пушчу, даюць Златарыі своеасаблівы клімат і красу. Гісторыя, якую вам раскажу, звязана з назвай нашай вёскі і людзьмі, якія пражывалі тут, ды і не толькі.

Здарылася гэта летам, вельмі даўно таму, калі цыганы вялі качэўны вобраз жыцця. Адзін з табараў спыніўся ў ляску, каля Карыціна. Вяскоўцы, даведаўшыся аб гэтым, сталі паспешліва заганяць жывёл у абора, хаваць курэй і маліцца, каб нязваныя госці хутчэй пакінулі іх паселішча. Увечары цыганы палілі кастры, танцавалі, чутна была прыгожае іграннe на гітары і вельмі хвалюючы жаночы спеў. Гэты спеў вельмі ўразіў Ілью.

Ілья быў яўрэем, які жыў у Карыціне. Вёў ён карчму, займаўся таксама гандлем. Часта ездзіў у Тыкоцін, дзе пражывала яго найбліжэйшая сям'я. Ілья быў чалавек працалюбівы, адукаваны ў мове і пісьме, вельмі цікавы свету. Аднойчы, калі вяртаўся з Тыкоціна, пачуў гук гітары, а пасля спеў. Нейкая сіла цягнула яго ў бок цыганскага табара. Падумаў: „Толькі на хвілінку пабачу, хто так прыгожа спявае, і вярнуся дахаты”.

Цыганы дазволілі Ілью сесці ля вогнішча і пачаставалі яго печанай бульбай. З другога боку кастра танцавала і спявала чорнавалосая жанчына. Ілья слухаў і глядзеў як зачараваны. „Хто гэта такі?” – спытаўся ў сядзячага побач мужчыны. Той глянуў на Ілью сур'ёзна і дапытліва. Сказаў, што гэта дачка караля цыганоў ды ўжо пара, каб Ілья вяртаўся дахаты. Яўрэй уздыхнуў, устаў і падаўся ў свой бок. Не спаў усю ноч, думаючы аб цыганцы.

Цыганку, якою захапіўся Ілья, звалі Ізменай. Была яна, як ужо ведаеце, дачкой цыганскага караля. Твар яе быў цёмнаскуры, аздоблена была каштоўнасцямі. Проста, яе краса захапляла. Аднак, нутро Ізмены было ўбогае. Не ўспрымала яна нічога ўсур'ёз, усе смяялася. Нічога яе не цікавіла, апрача сябе самой. Лёгка было яе захапіць. Ілья шукаў кантакту з дзяўчынай. Ведаў, што не можа адкрыта прасіць яе рукі. Быў толькі простым жыдом. Мусіў пайсці на хітрыкі. Стаў дапамагаць цыганам у паладжванні табару, дастаўляць ім харчы. За свае паслугі браў сімвалічную аплату. Сустракаючыся з цыганамі, расказваў ім розныя

гісторыі. Удавалася яму гэта вельмі спраўна. Аднойчы падышла да яго Ізмена і папрасіла, каб расказаў ёй штосьці аб сабе і сваіх брацццях яўрэях. Ілья падумаў, што трапляецца нагода. Сказаў, што зробіць гэта вельмі ахвотна, ды заўтра зрання, бо сёння мусіць паладзіць воз. Загадаў Ізмене, каб тая прыйшла да ўсходу сонца над раку Супрасль. Дзяўчына дала згоду.

Назаўтра ў дагавораным месцы Ілья чакаў Ізмену. Прыйшла. Ілья стаў расказваць аб сабе і сваім асяроддзі. Дзяўчына ўслухалася адкрыўшы рот. Спыніў аповед у самым цікавым месцы. Не зважаючы на просьбы Ізмены, не хацеў працягваць расказ. Сказаў, што кончыць яго, калі дзяўчына паедзе з ім у Тыкоцін праз пару дзён. Была згодная. Ілья забараніў ёй каму-небудзь расказаць на тэму планаванай паездкі. Праз пару дзён мелі сустрэцца ў тым самым месцы і ў тую саму пару. Яўрэй рашыў выкрасці дзяўчыну нават супраць яе волі. Прага мець Ізмену не давала яму разумна думаць. Планаваў уцячы з ёю далёка на ўсход Расіі – там пачаць новае жыццё з каханай. Накіраваўся да вядомага ліхвяра Леві. Папрасіў у яго даць пазыку пад свой дом. Ліхвяр даў Ілью дзва цяжкія зліткі золата, якія той меў вярнуць праз два месяцы. Ілья запрог чацвёрку коней у воз, загрузіў на яго самыя неабходныя рэчы.

У дагавораны час Ілья пасадзіў Ізмену на воз і рушыў у бок броду на Супраслі. Не заехалі, аднак, далёка, калі з боку лесу пачулі нейкі гоман. Ілья адвярнуўся і ўбачыў, што цыганы выбраліся на паляванне. Рашыў спакойна ехаць далей – не павінны яго спыніць. Раптам Ізмена гвалтоўна абярнулася і гучна прывітала сваіх супляменнікаў. Яны пазналі каралеўну і сталі набліжацца ў яе бок. Ілья, убачыўшы, што адбываецца, раптоўна пагнаў коней. Цыгане дадумаліся, што тут штосьці не ў парадку. Пачалі клікаць Ілью, каб спыніўся. Той не рэагаваў. Цыганы спусцілі гончых сабак і самі сталі пешкі даганяць воз. Ілья павярнуў за ўзлесак, на хвіліну губляючы пагоню. Саскочыў з воза, заткнуў рот Ізмене і разам з ёю і зліткамі золата пагрузіўся ў вадзе. Крыкнуў на коней, і яны пабеглі колькі сілы наперад. Пагоня мінула іх. Ілья стаў памалу перапраўляцца праз раку. Раптам пачуў за сабою голас: „Вылазь з вады!” Думаў, што аслухаўся і плыў далей. Хтосьці крыкнуў: „Вылазь з вады, бо застрэлю цябе!”. Ілья адвярнуўся і ўбачыў на беразе караля цыганоў. Ужо нічога больш не мог страціць. Плыў далей. Раптам прагучаў гул выстралу і Ілья адчуў страшэны боль пад левай лапаткай. Вада стала барвовай. Ізмена прабавала вырвацца з абдымкаў Ільі. Той, аднак, хоць траціў сілы, трымаў яе з усяе моцы. Калі апускаліся на дно, у сонцы бліснула золата, якое Ілья забраў з сабою. Утапіліся абое. Цыганскі кароль, убачыўшы, што адбылося, толькі глыбока ўздыхнуў і вярнуўся ў табар. Не ратаваў дачкі, паколькі страшэнна баяўся вады.

Кароль цыганоў як адзіны ў табары ўмеў пісаць. Спісаў усю гісторыю і даў свайму намесніку загадаўшы, каб пасля яго смерці перадаў гэты перг амент тыкоцінскаму рабіну. Праз пару дзесяткаў гадоў тыкоцінскі рабін атрымаў кур'ерскую пасылку з далёкай Турцыі, а ў ёй быў згаданы пергамент. Распаўсюдзіў ён гісторыю на ім спісаную сярод яўрэяў, а яны мясцовасць, у якой пражываў быў Ілья, сталі называць Златарыяй. Гэтую гісторыю расказаў мне патомак тыкоцінскага рабіна, пару ладных гадоў таму.

**Канстанты Казлоўскі**
## Дзе Плоскай вада рве берагі

На заходніх ускраях Гарадоцкай гміны ў прытоках Плоскай змяшчаецца поўныя красы даліна. З аднаго боку апіраецца яна ў рад стромых марэнавых пагоркаў, са своеасаблівым мікракліматам у выніку добрага сонечнага абагравання. Аколена яна з усіх бакоў лясамі Кнышынскай пушчы багатымі ў ягады і грыбы, да нядаўнага часу была аазісам цішы і спакою. Сёння гэты ідылічны вобраз часткова псуюць міжнародныя грузавікі, што мчацца па шляху Беласток  Ваўкавыск. Незалежна ад гэтага заблукаўшы сюды вандроўца, што паставіць сваю палатку на беразе Плоскай, можа разлічваць на тое, шото знойдзе тут чыстую ваду, багатую ў стронгу. Падыхае свежым паветрам, прасякнутым пахам мяты і свежага сена. А ўвечары, калі запалае вогнішча, а змрок ахіне зямлю  пачуе прыгожую легегду, што ад вякоў паўтараецца ў пошуме дрэў і чаратоў  пра генезіс Каралёвага Мосту.

Сонца кранала ўжо верхавіны дрэў, калі полы шатра расхінуліся і паказаўся ва ўсёй сваёй постаці і хвале кароль Зыгмунт Аўгуст. Найперш злюстраваў зрокам абоз, у якім пацягвалася перадвячэрняя мітусня. Служба рыхтавала вячэру, упраўлялася з конямі. Ніжэй абозу расцягвалася багонная даліна,  у цэнтры якой вілася рэчачка. Не была яна шырокай, ды вельмі мулістай і не была прыгоднай для коннай пераправы. Аўгуст загадаў, каб на працягу мінаючага пасляпоўдня і ночы быў узведзены тут мост. Паспешліва сазвалі сюды навакольных дрывасекаў. Іх рады падмацавала значнай частка службы і пахолікаў каралеўскай світы. Цяпер з боку ракі далятаў водгалас udараў дзесяткаў сякер. Заўтра па гэтым мосце кароль пераправіцца на другі бок, каб запаляваць на буйнога звера. Шмат тыдняў ішоў па лясах і барах шукаючы яго слядоў. Забіў дзесяткі аленяў, ласёў, дзікоў, ды ніколі не мог натрапіць на след тура. Так вельмі хацеў асачыць гэтага звера, бо ж гэта якраз прыдало б хвалы і бляску ўсім ловам. Толькі тут на ўсходніх ускраінах знайшлі адбіткі капыт аграмаднага быка. Дзесьці там, у багонных нетрах мае сваё логава гэты некаранаваны пан і ўладальнік лясоў. Кароль правёў зрокам па стромкім пасе пагоркаў на супрацьлеглым баку даліны. Пакрыты яны былі густым хваёва-яловым дрэвастоем, пратыканым дубінай, грабінай і бярэзінай. Пасля захаду сонейка гэты лес выглядаў шэра ды змрочна.

Ужо заўтра пасярод гэтых дрэў адбудзецца сустрэча двух каралёў і даканаецца лёс аднаго з іх. Пад-над рэчкай і багнамі ўзнялася белая як малако імгла,

павольна перасоўваючыся ў напрамку абозу. На месцы пабудовы моста запалалі вялікія кастры, асвятляючы нахлынаючы морак.– Пара ўжо на вячэрнюю малітву, вячэру і спачын, – падумаў Аўгуст, накіроўваючыся да найвялікшага шатра ў абозе.

Бледным світанкамі гончыя сабакі пайшлі ў лас. Яшчэ не падняліся спавівы мглы, што ахутвалі даліну, калі лоўчы разам з нагонкай іаграмаднай сворай псоў пераправіліся на другі бок ракі. Яго заданнем было знайсці след звяра, выгнаць за багны на вышэйшы, сухі груд і асачыць яго. Гукам рога меў паведаміць караля аб выкананні задання. Пры мосце праца працягвался. Канчалі класці памост з цясаных дубовых камлёў. На стомленых тварах людзей віднела радасць. Бо хоць мост не быў самавіты, ды збудаваны быў салідна.

Сонца падымалася ўсё вышэй, абліваючы даліну залацістым ззяннем. Здаровае паветра ранка перапоўненае было пахам багны перамяшаным з араматам квецця і траў. Кароль аднак не звяртаў увагу ані на красу наваколля, ані на багонныя пахі. Нервова праходжваўся паміж шатром і канём, якога трымаў напагатове пахолік. З заклапочаным чалом услухоўвася ў водгаласы з супрацьлеглага боку даліны. Там аднак панавала ціш, якую ледзь каламуціў далёкі, ледзь чутны брэх сабаак. Час няўмольна праплываў, а сігналу не было. Аўгуст прысеў на пяньку, які прыкаціла служба, прыкрытым дзічай скурай. Заплюшчыў павекі і чакаў. Дзесьці ў глыбі душы пачынаў яго ўдручаць неспакой, што ловы не здзейсняцца. Сонца ўздымалася ўсё вышэй, кідаючы на замлю ўсё цяплейшае праменне. Быў гожы вераснёўскі дзень. Раптам рог прамовіў.

– Па конях! Трубіць выязнога! – загадаў кароль і не чакаючы пацверджання сігналу ў некалькіх скоках дабег да свайго аграмака. Без падмогі пахоліка ўскочыў на конскую спіну і галопам рушыў к масту. Ударылі падковы аб дубовыя камлі. Стомленыя дрывасекі сагнулі спіны ў паклоне, ды кароль гэтага не бачыў. А за ім у няладзе галопам мчалася ягоная світа.

Выгнаны са свайго логава і асачаны ў падножжа пагоркаў тур рыхтаваўся да абароны. Быў гэта здаровы, дзесяцігадовы бык карычневай масці са светлай смугой уздоўж хрыбта. Схіліў вялікі кучаравы лоб узброены ў больш чым на паўметра выгнутыя наперад рогі. Пагрозіва рыкаючы, гроб пярэднімі раткамі так энергічна, што зямля разам з подшытам узлятала высока ўверх. Крывавымі вачыскамі ўважліва сачыў за кожным рухам акаляючых яго сабак і людзей. Гэтых першых, што ўсчыналі вялікі гам, звер меў за нішто. Сабакі былі падобныя да ваўкоў, з якімі сустракаўся досыць часта і не раз пратрапаў ім скуру. Жах наводзілі на тура постаці людзей. Да гэтага часу не меў з імі ніякага кантакту. Ды інстынктыўна адчуваў, што з іх боку чакае яго найбольшая пагроза.

Аўгуст асадзіў аграмака ў месцы. Тое, што ўбачыў, было заадно цудоўнае і жахлівае. Тур змагаўся за жыццё. Атакуючыя яго псы браў на свае доўгія рогі і падкідваў уверх, радзіраючы прытым ім жываты так, што выпадалі вантробы. А тых, што не трапілі на рогі, дабіраючыся быку да гарляка, бязлітасна таптаў раткамі. Чутны быў хруст ламаных касцей і сквавытанне канаючых жывёл. Паспешліва нарыхтавалі да стрэлу цяжкую рушніцу, якую замацавалі на падстаўцы ўбітай у зямлю. Кароль меціў доўга, памаленьку зводзячы курок. Раптам адчуў моцны ўдар ствала ў плячо, а постаць звера засланіла шэрае воблачка дыму. У момант выстралу тур адбіваўся ад чарговай атакі раз'юшаных сабак, таму раптоўна апусціў галаву, пасоўваючыся на два крокі ўперад. З-за гэтага выстрэленая куля трапіла яго ў спіну, балюча параніўшы. На светлай смузе выступіла чырвоная крывавячая стужка. Рык

жаху і болю, шматкроць адбіты рэхам ад пагоркаў, праляцеў па даліне. Тур, наперакор логіцы, замест спрабаваць уцёкаў, рашыў атакаваць сваіх праследнікаў. Як таран рушыў на людзей. З мызы ляцелі яму шматкі пены, з-пад ратак грудкі зямлі, а ўсё, што апынулася на яго шляху знішчанае ваялілася пакотам. Не было часу нанава завесці рушніцу. Аўгуст вышарпнуў з-за пояса пісталеты з пазалочаныямі рукаяткамі і не меціўшы двойчы стрэліў. Прагучалі таксама стрэлы каралеўскай аховы. Звер спавальнеў, хіснуўся, сілай імпэту зрабіў яшчэ пару крокаў і зваліўся. Укленчыўшы на пярэдніх нагах, паклаў сваю цяжкую галаву так, быццам даваў чэсць пераможцу.

Шматкроць рэха паўтарыла голас рогу, што апавяшчаў памыснае завяршэнне ловаў. Твар караля шчасна прамяніўся. На складзеных з яловых жэрдак валоках цягнулі буйнага быка. Уязджаючы на мост, Аўгуст спыніўся. Уважліва агледзеў мост ды рухам далоні паклікаў к сабе пісара і хранікёра ў адной асобе.

– Цешыцца маё сэрца ўдалым паляваннем і знакамітай працай маіх падданых пры пабудове, – сказаў. – Сапраўды бачу, што гэты мост варты караля, таму даю загад, каб служыў агульнаму дабру. А паколькі гэта каралеўскі мост, таму даю прывілею пабору мыта за праезд. А ўладальнікамі чыню будаўнікоў, людзей працоўных. Хай так будзе запісана навекі.

XXX

Праз амаль сто гадоў праз Аўгустаў мост праязджаў іншы кароль Ян III Сабескі. Пры рачулцы распаложана было ўжо невялікае паселішча з карчмой, у якой падарожнікі маглі адпачыць і пажывіцца. У гонар каралеўскага праезду і папасу мясцовасць назвалі Янаполем. Толькі праз наступныя стагоддзі ўспомнілі, што мост на рацэ Плоскай служыў двум каралям. Каб не паменшыць вялікасці ні аднаго з іх, памянялі назоў мясцовасці на Каралёвы Мост, значыць, мост каралёў.

*Пачутае ў шасцідзесятыя гады ў Пачатковай школе ў Каралёвым Мосце ў настаўніцы.*

**Тамаш Здрайкоўскі**
**Бераг**

Гледзячы на ўсё гэта праз прызму сённяшніх дзён, мяркую, што я павінен быў доўга задумвацца над прыняццём даверанага мне тады пасланніцтва. Калі б хтосьці зычлівы распавёў мне хаця б адну частку прыгодаў, якія я меў перажыць, лёсы склаліся б напэўна інакш. Адну з гісторый не забудуся, мабыць, да канца жыцця. Ледзь я паспеў выехаць з гушчароў, а ўжо настала ноч. Аніякіх прыдарожных корчмаў ці нават звычайных хат, дзе можна было б папрасіць заначаваць у добрых людзей, навокал не было. Таму я прывязаў каня ды распаліў вогнішча не беразе ракі. Здаецца, што Бугам яе ў гэтых мясцінах клічуць. І тады вялікі жах мяне ахапіў, бо ўбачыў агромністую, цёмную постаць. Вось у мой бок ідзе шыракаплечы мужчына. Сэрца маё амаль спынілася, бо столькі ж я ў сваёй Брандэнбургіі наслухаўся пра бандытаў з гэтых мясцін, што едучы з тузінам людзей павінен баяцца, а што ўжо казаць, калі адзін… Аднак якую ж вялікую палёгку я пачуў праз хвіліну, убачыўшы, што незнаёмец гэта манах, пасоўваючыся вольным крокам у маім накірунку. Калі ён быў ужо дастаткова блізка, а полымя асвятляла яго шэрую манаскую расу і даўгую бараду, а азваўся:

Сальвэ! я цешыўся ўдвая, бо гэта ня толькі не злачынца, але напэўна яшчэ чалавек валодаючы лацінскай мовай, веданне якой у кляштарах абавязковае. Ад гэтага часу мы размаўлялі менавіта на гэтай мове.

Вітай! адазваўся манах раўнадушна.

Можа хочаце, Ойча, сесці ля майго вогнішча? Ноч надыходзіць, а вы ідзешце адзін, да гэтага ані мяча, ані нічога каб абараніцца я ў вас не бачу.

Манах кіўнуў галавой і сеў побач, мабыць нават на мяне не паглядзеўшы. Не адгукаўся зашмат, праўду кажучы пакуль не казаў нічога. Нязручна было так сядзець моўчкі, я ўслухоўваўся толькі ў трэск палаючых дроваў і водгаласы птушак з-над Буга. Каб перапыніць маўчанне, я коратка прадставіўся.

Дзіўна, Ойча, што такой позняй парою самі падарожнічаеце. Што тычыцца мяне, дык еду я з пасланніцтвам з маёй айчыннай Брандэнбургіі, а накіроўваюся далёка, бо ажно за Нёман. Калі вас убачыў, сэрца ледзь не выскачыла з грудзяў, я быў гатовы любыя грошы паставіць на тое, што гэта бандыт, які хоча мяне абрабаваць і забіць, смяяўся я шчыра. Аніякай рэакцыі; ён сядзеў таксама нязрушаны, як і на пачатку.

Зноў хвіліна маўчання, і я думаў, што зараз пакладуся спаць. Я не бачыў іншай

магчымасці правесці гэты вечар з настолькі маўклівым таварышам. Дзесці далёка ў лесе завыў воўк.

Вам нястрашны, Ойча, ваўкі? спытаўся я з іроніяй.

Не ваўкоў, а ваўкалакаў тут трэба баяцца… нарэшце прамовіў манах, а голас яго быў моцны і ўпэўнены.

Ваўкалакаў? Якіх ваўкалакаў? Гэта ж толькі паганскія байкі і духоўны ў іх ня верыць? спытаўся я здзіўлены.

Вы там, на захадзе, не разумееце, што кожны край мае свае гісторыі, свае аповеды. Нешта, што ў вас здаецца бессэнсоўным, у нас відавочнае з простай прычыны яно проста існуе. Шмат людзей на ўласныя вочы бачыла, шмат было ахвяраў ваўкалакаў. Таксама нямала людзей сталася ахвярамі стрыгі. Прывіда з мноствам зубоў палюе ноччу, робіць засады на падарожных, а калі якога звядзе з дарогі, кідаецца на яго і бязлітасна з'ядае. Апошняе, што бачыць няшчасны рады вострых як шпількі зубоў, вельмі шматлікіх у яе зяпе. Падобны цяжкі канец мае спячы, якога спаткае змора. Спачатку душыць яго, потым, пакуль не паспеюць уцячы рэшткі жыцця, раздзірае грудзі і прагна віпівае кроў. Для перасцярогі людзі шэпчуцца паміж сабой пра гэтыя стварэнні. Яны павінны асцерагацца, памятаючы аб чакаючых небяспека, ён задумаўся на момант і дадаў: Homines historias creant, historiae homines creant. Я распавяду табе нешта, незнаёмча, можа зразумееш духаў, дрэмлючых у гэтых старонках ды і навучышся, як жыць трэба.

Дык вось у Хлапкове, вёсцы без ніякіх асаблівых прыкмет, што ляжыць паміж прытокамі Бугу і ракі Точнай, непадалёк ад шматлікіх у тых краях багнаў і забалацяў жыла калісьці ведзьма. У адрозненні ад іншых чараўніц яна не была старой і брыдкой, а была маладой ды прыгожай. Праўда, людзі яе баяліся, паколькі яна карысталася магіяй, але і чыста людзкія пачуцці таксама ведала. Аднойчы закахалася яна ў юнака з вёскі, што была паблізу. Той быў вельмі спрытны і хуценька вырашыў выкарыстаць сітуацыю на сваю карысць. Ён казаў маладой чараўніцы, што кахае яе, што яна з'яўляецца для яго мэтай яго існавання. У хуткім часе выпрасіў у яе адвар, які меў працягнуць яго маладосць і прыгажосць ды сам тым часам далей патаемна сустракаўся з іншымі жанчынамі. Так яны жылі нейкі час, але чараўніца, паколькі не была дурніцай, хутка рассакрэціла праўдзівыя памкненні каханага і зразумела, што адбываецца за яе плячыма. З-за гэтага выгнала яго з хаты. З таго часу зрабілася яна злой і ўсё больш падобнай да ўсіх іншых пачварных ведзьмаў.

Праз якія год ці два пасля гэтага даведалася яна, што яе былы каханы бярэ шлюб. Зараз яна мела магчымасць адпомсціць за яго падман, здраду і і выкарыстанне чарадзейных сілаў. Знайшла яна ў старых кнігах, якія заўсёды маюць скураную, прасмаленую вокладку і напісаныя незразумелай мовай чараўнікоў, прыдатны праклён.

Пачала здзяйсняць рытуал. Зняла пас, якім падпярэзвалася і доўга заклінала яго, шэпчучы ў трансе старажытныя формулы. Акрамя таго, накруціла лыка з ліпы і доўга трымала ў вары ў катле.

У рэшце надыйшоў дзень вяселля. Усе выдатна весяліліся, маладая пара танцавала. Згорбленая чараўніца, перапранутая ў старую жанчыну далучылася да натоўпу вясельных гасцей. Папырскала на іх вадой з кацялка. Толькі раз зірнула ў вочы таму, хто ёй здрадзіў. Мужчына знерухомеў на хвіліну ці то зрушаны кепскім прадчуваннем, ці то з-за таго, што адгукнулася яго сумленне, калі рэшткі сумлення

яшчэ заставаліся ў яго душы. Ведзьма хутка, аднак, адвяла вочы і пайшла пад хату маладых, каб скончыць распачатае.

Перад парогам паклала свой пас. Калі апошні з вясельнікаў перакрочыў парог, здарылася страшная перамена усе пераўтварыліся ў ваўкалакаў. Кінуліся прэч у такім выглядзе і тры гады жылі ў дзічы, палюючы на жывёлаў і крадучы людзей. Пры поўні месяця цярпелі яны найгоршыя пакуты, паколькі ў гэты час абуджаліся ў іх рэшткі чалавечага.

Пасля трох гадоў пакарання, слушнага альбо не, не мне пра гэта меркаваць, знайшлі пасярод глушы хату чараўніцы. Вылі яны так жалосна, пакуль тая не выйшла і не паабяцала, што зноў пеатворыць іх у людзей. Зняла з сябе кажух, вывернула яго на левы бок, па чарзе накрыла кожнага і тыя зноў пачалі выглядаць так, як перад скрашным праклёнам.

Калі дайшла чарга да маладога, таксама яго накрыла, аднак не ўсяго, пакінуўшы непрыкрытым хвост. І прамовіла тады: “Ты, той, хто калісьці здраджваў мне і выкарыстоўваў, хто выкарыстоўваў магію для сваёй пыхлівасці, няхай табе застанецца такі хвост, каб помніў пакаранне, якое панёс і каб сваёй жонцы ніколі не здраджваў, а клапаціўся пра яе як найвялікшае дабро”.

Сказаўшы гэта, адвярнулася і зачыніла дзверы свае хаты. Адныя кажуць, што ў канцы ў рэшце рэшт адчаравала яму той хвост, іншыя што стрымала сваё слова і ён усё жыццё мусіў хаваць той ганебны напамін і адчуваць вялікі сорам. Гэтага, што тут доўга гаварыць, нават я сам не ведаю.

Цікава, Ойча, распавядаеце. Калі гэта праўда, дык тая зямля павінна моцна адрозніваецца ад нашай. Мудрым з'яўляецца сэнс тваіх словаў, адказаў я з павагай да яго асобы. І я маю каханую, там, у маім месцы. Кахаю яе такім вялікім каханнем, як Рамэо кахаў Джульету. Не ведаю, ці чулі вы пра тую гісторыю, напісаў яе адзін ангелец, які…

Гэта сумнае каханне, перапыніў манах.

Ойча, вы чулі пра яго? здзівіўся я.

Гэта сумнае каханне, паўтарыў. Калі кахаеце адзін аднаго так як Рамэо і Джульета. Каханне поўнае болю і таямніц, каханне акропленае крывёй, каханне салёнае ад слёз.

Над ракой Нёман, крыху на ўсход ад Коўні, у Румшышках, зноў пачаў свой аповед, таксама мела месца адна прыгожая гісторыя. Маладая паненка, вельмі прыгожая і з добрага, багатага дому, патаемна сустракалася з рыцарам. Яны кахалі і былі адзін для аднаго ўсім светам. Дзяўчына аднак баялася распавесці пра гэтае пачуццё бацькам, бо ведала, што тыя планавалі яе будучыню і мелі намер аддаць за паніча, такога ж багатага, з шляхецкім туталам, але страшнага як чалавека. Уся ваколіца ведала, што ён мае схільнасць да азартных гульняў, празмерна любіць поўную чару, а да людзей ставіцца як да прадметаў без душы і пачуццяў. Ён быў супрацьлегласцю рысаў рыцара.

Паненка часта ўцякала ноччу з дому. Хутка стала відавочным, што яна ўжо цяжарная. Бацька з маці не маглі гэтага перанесці. Стварылі для яе пекла. Запалоханая і закранутая да глыбіні душы дзяўчына выбегла з плачам з дому, крычала, што хутчэй Нёман пацячэ ў іншы бок, чым яна пойдзе за прызначанага ёй бацькамі мужчыну. Людзі, якія не цярпелі супраціву і не мелі ў сэрцы ані кахання, ані літасці, паставілі дачку перад касцельным судом.

За пралюбадзейства, за пагарду да святынь, якія напэўна магла дапусціць,

быў вынесены прысуд: смерць.

Пачуўшы прысуд, маці расплакалася, а бацька толькі моцна сьціснуў далоні, але нават не міргнуў вокам, не прызнаючы больш гэтую дзяўчыну за сваю дачку. Дзяўчыну павінны былі зашыць ў мех разам з сабакам, катом і змяёй, што было сімвалам падзення і кінуць у Нёман.

Ужо увечары на беразе ракі стаяла звязаная дзяўчына. Побач стаяў кат у каптуры, які закрываў яго твар, і рыхтаваўся да выканання прысуду.

У гэты момант пачуўся тупат капытаў. Скача рыцар, каханы дзяўчыны. Чорная зброя, збоку вялізны меч. Саскочыў з каня, адштурнуў ката так, што той баяўся нават паварушыцца. Разрэзаў шнуры, якімі былі звязаныя рукі каханай. Узяў залаты пярсцёнак, гледзячы ў вочы, надзеў яго ёй на палец. Затым другі такі самы падаў дзяўчыне. Яна з шалёна грукаючым сэрцам, з дрыжыкамі ў далонях надзела залаты пярсцёнак на палец рыцара.

Той паглядзеў на ўсіх і голасна прамовіў: “Ад гэтага часу мы заручаныя гэтымі пярсцёнкамі  сімвалам шлюбу. Хто захоча паставіць пад сумнеў нашу таямніцу, няхай на таго спадзе боскі гнеў. У вас жа, жорсткія бацькі, нягодныя такой цудоўнай дачкі, забіраю яе”.

Зазірнуў яшчэ раз у вочы жонкі. Усміхнуўся. Праз імненне тая кіўнула галавой у знак таго, што гатовая. Яны адвярнуліся і скокнулі ў імклівую раку. Вада ўспенілася і яны зніклі ў глыбіні. З той пары час ад часу над ракой чуваць выццё сабакі, мяўканне ката і шык змяі. У цяплейшыя ночы відаць прывіды закаханых, якія лёгка асвечаныя месяцам прагульваюцца ўздоўж берага Нёмана. Дзяўчынап трымае на руках немаўля.

Мяне аж дрыжыкі ўзялі, як пачуў гэтую гісторыю. Я зірнуў на раку, воды якой плылі непадалёк. Падалося, што я нават бачу там кагосьці, але гэта, напэўна, былі толькі мае фантазіі і бляск месяца, які адбіваўся ад паверхні вады, што плыла зараз нязвыкла спакойна.

Ведаеце, Ойча, шмат гісторый пра тутэйшых людзей. З маёй каханай не ёсць так, як з той дзяўчынай. Калі думаю пра гэта, то мне падаецца, што яны былі проста нешчаслівыя як Белерафонт, які пакутаваў з-за жорсткага лёсу, бо гэта справа выпадку. Апроч таго, нашыя бацькі з намі ў згодзе і горача падтрымліваюць нас, цешацца з нашага шчасця. А яна… не здрадзіў бы я ёй ніколі. Яна адна з найпрыгажэйшых, пра што тут казаць! Найпрыгажэйшая дзяўчына, пра якую толькі можна марыць. Яе харастово і лёгкасць. Яна…

Адстудзі свой пал, хлопча. Хопіць ужо таго вылівання мёду. Прыгажосць мінае, а часам нават уводзіць у здман, памятай пра гэта. Летуценнікі, якія будуюць у галаве палацы, не ведаюць, што старасць як праўда  яе прыход гасіць пахі, цьміць колеры,  памятай.

Я адчуў сябе няёмка. Можа, і сапраўды занадта разышоўся са сваімі развашаннямі. Не ведаў, як паводзіць сябе ў гэты момант. Запанавала цішыня. Я сканцэнтраваўся на спаленым да паловы палене і рабіў выгляд, што пачынаю яго папраўляць. Вогнішча было добра складзенае, але я па такой тырадзе з боку манаха не меў я ідэі наконт працягу размовы.

Магчыма, Ойча, чулі вы штосьці пра схаваныя тут скарбы?  сказаў я ў канцы, можа крыху з неахвотай.  Шмат пра іх размоваў, нават у маёй краіне.

Канечне, чуў. Мала таго, ведаю нават дзе яны і як выглядаюць тыя скарбы, прыгажэйшыя, чым можа сабе іх уявіць чалавечая сквапнасць.

Чаму тады іх не возьмеце? Маглі б тады мець усё, чаго пажадаеце, Ойча. Што вас стрымлівае?  запытаў я ў здзіўленні і можа крыху ў чаканні чарговага апавядання.

Ты ведаеш напэўна вядомую сярод вандроўнікаў фразу пра тое, што багацце шчасця не дае. Распавяду табе яшчэ адну гісторыю. На ўскрайку Кнышынскай пушчы, на захад ад Крушынян, каля ракі Нятупа, жыў пчаляр Якуб. Не любіў ён кампаніі з іншымі людзьмі, можна сказаць, што баяўся людзей. Ведаў, што можа разлічваць толькі на сябе, давяраць толькі сабе. Як гэта бывае з многімі занадта недаверлівымі, падазронымі і замкнутымі людзьмі, ён спакушаўся на ўсялякія добрыя рэчы. Яго вялікая сквапнасць гаварыла сама за сябе.

Аднойчы на ўзгорку непадалёк ад дома убачыў ён тампліера. Цяжка сказаць, адкуль ён узяўся ў гэтых ваколіцах. Некаторыя кажуць, што іх ордэн, забаронены тыранам Філіпам *IV*, схаваў у гэтых мясцінах вялікія скарбы, але не тыя, якія я бачыў, бо мае ў параўнанні са скарбамі тампліераў то драбяза.

Іншыя апавядалі, што недабіткі Ордэна Храма ўцякалі, каб схавацца паміж сваімі братамі шпітальнікамі. Невядома чаму тут быў гэты чалавек. Ва ўсялякім разе ў вочы адразу кідаліся прыгожы рыцарскі рыштунак і доўгі белы плашч з чырвоным крыжом. Відаць было, што чалавек гэты хутка памрэ. Якуб хацеў кінуцца рыцару на дапамогу, але ў імгненне вока сквапнасць перамагла ў яго сэрцы. Ён вырашыў дачакацца, пакуль тампліер аддасць Богу душу. У рэшце рэшт, і так наўрад ці ён быў бы ў стане дапамагчы рыцару. Зробіць яму хоць хрысціянскае пахаванне. Сабе забярэ толькі прыгожы і дарагі рыштунак, бо навошта яму класціся ў труну разам са сваім першым уладальнікам, калі можа яшчэ добра паслужыць, быць замененым на добры грош.

Хутка рыцар памёр, пчаляр падбег, зняў рыштунак з цела. Перад ім ляжаў прыгожы ўладальніка, які, нягледзячы на малады ўзрост, перажыў шмат бітваў, пра што сведчылі шнары на твары. Якуб хацеў надзець на сябе рыштунак, але той быў замалы. Нягледзячы на гэта, пчаляр неяк уціснуўся. Калі зашпіліў апошнія зачэпкі, адчуў, як ахоплівае яго гарачка. Сарваў замкі, спрабаваў рваць бляхі з нагрудніка, але рыштунак не атрымлівалася скінуць. Якуб сканаў у страшных пакутах на вяршыне пагорка, побач з тампліерам. Калі хмары не засланяюць неба і ззяе поўня, чуваць крыкі абодвух. Змагаюцца за рыштунак, а водгалас бітвы разносіцца над наднарвянскімі мурагамі.

І ты хочаш намякнуць, што я быццам бы ахвотны паласціцца на каштоўнасці. Хіба чалавек, які мае такую моцную патрэбу ў павучанні іншых, не мог стаць кімсьці іншым, чым манах,  дадаў я можа крыху іранічна, бо той не адказаў. Пасля хілiннай цішыні я паспрабаваў змяніць тэму.  Гэтыя землі напраўду хаваюць шмат цудаў, скарбаў і легендаў. Вы, Ойча, прытрымліваецеся ўсяго, пра што кажаце? Я выклаў усю маю гісторыю, а вы маўчыце, нават словам не ўзгадаеце пра тое, чаму ў адзіночку цёмнымі начамі вандруеце праз лясы. Ці да сваіх братоў па ордэну? Ці кудысьці так? А можа самі з'яўляецеся часткай гэтых легендаў і толькі прывідам?  Я засмяяўся, чакаючы, што ён зробіць тое самае, але манах не быў у гуморы альбо не зразумеў майго жарту наконт яго таямнічасці.   Дазволь распавесці мне табе зараз пра штосьці. Магчыма, ты ведаеш гэтую гісторыю. Я сам пачуў яе непадалёк адсюль, каля старога закінутага кляштару.

На паляне на ўскрайку лесу стаяў вялізны дуб. Людзі ставіліся да яго з вялікай пашаанй, бо, па-першае, быў ён векавым, па-другое, з ім было звязана

мноства легендаў. Адна з іх апавядае пра манаха, можа быць нават вельмі падобнага да цябе, дадаў я з усмешкай. Манахі з гэтага кляштару ўспрацівіліся аднойчы загадам касцёла і збеглі са свайго храма разам з абатам і адракліся ад аскетычнага ладу жыцця. Іх лёсы, за выключэннем аднаго манаха, невядомыя. Той жа быў знойдзены мёртвым непадалёк ад купецкага шляху. Напэўна, напалі на яго рабаўнікі ды забілі, палічыўшы, што мае той каштоўнасці. Калі ж аказалася, што анічога каштоўнага той не меў, выкінулі яго цела якраз у гэтым месцы.

За знявагу над сваімі абетамі быў ён асуджаны на зганьбаванне і вечнае блуканне. Праўдападобна, у гэтым дубе прабывала яго душа, якой не дазволена было патрапіць на той свет. Калі ён выходзіў з ямы паміж карэннямі, то здаваўся маленькім, але калі выпростоўваўся, то ростам пераўзыходзіў найвышэйшага з мужчын. Звычайна апрануты ён быў у акрываўленую і прабітую на грудзях манаскую расу. Выйшаўшы, моўчкі прагульваўся. Як шмат у вас з ім супольных рысаў! укалоў я таварыша, але ён сапраўды не быў схільны да жартаў з самога сябе. Дык вось, манах моўчкі крочыў да ракі, пагружаўся ў ваду, змяншаўся ў памерах і знікаў у глыбіні.

Аднойчы нейкі вандроўнік убачыў яго і, уражаны такой дзіўнай з'явай, ускрыкнуў: “Кожны дух Пана Бога ўсхваляе!”. Манах прыпыніўся, паглядзеў на чалавека, схіліў галаву ды адказаў: “I я ўсхваляю!” і ўмомант знік, перанесшыся ўрэшце на іншы бераг. Ніхто яго больш не бачыў. Застаўся пасля яго толькі кавалак белага матэрыялу, я скончыў аповед амаль шэптам і з вялізнай цікавасцю чакаў рэакцыі майго суразмоўцы.

Так... уздыхнуў ён, можа гэта праўда, а можа толькі людзі распавядаюць усялякія байкі. Можа праўда, можа не, скончыў ён з цяжкім уздыхам.

Манах устаў, пакрочыў у кірунку ракі, да якой ад майго вогнішча было ўсяго ў пару кроках. Увайшоў у яе па пояс, пачаў змяншацца ў памерах. Праз хвіліну вада ўспенілася, утварыўся вір і манах знік. Гэтага я ўжо вытрымаць не змог. Схапіўшы свае клумкі, кінуўшы вогнішча ды недаедзеныя харчы, ускочыў я на каня ды пагнаў яго галопам. Аніякія ваўкі не былі мне ўжо страшныя. Толькі б апынуцца ў горадзе, у карчме, сярод людзей! Жывых людзей, бо прывідаў і дзіўных гісторый я меў ужо на доўгі час наперад удосталь.

Гэтыя гісторыі былі пачутыя мной ад сваякоў ды знаёмых у ваколіцах Аўгустова ды КузніцыБеластоцкай

*Гэтыя гісторыі былі пачутыя мной ад сваякоў ды знаёмых у ваколіцах Аўгустова ды Кузніцы-Беластоцкай.*

**Тамаш Ліпаман**
**Пазначаны дзік**

Дня 27 верасня Лета Божага 1752, кароль Польшчы Аўгуст III Сас арганізаваў у Белавежскай пушчы вялікае паляванне. І дагэтуль, у Палацавым парку ў Белавежы, паміж сажалкамі стаіць абеліск з пясчаніку, усталяваны ў памяць аб тым паляванні.

Паляванне, тое, зрэшты, па сённяшніх мерках хутчэй трэба было б назваць разнёй.

Было забіта 42 зубры, 13 ласёў, 2 казулі, не лічачы дзікоў. Так пазначана на мемарыяльным абеліску. Спецыяльна прывезеныя каралеўскія егеры пры дапамозе аблавы, у якой удзельнічала каля тысячы чалавек, месяцамі заганялі звера на адмыслова прыгатаваныя ў лесе загоны, якія па сённяшні дзень завуцца Аўгустоўскім Садам.

Шмат звера загінула падчас загонкі ў пастку, яшчэ больш – месяцамі чакаючы прыбыцця яго каралеўскай мосці. Сас разам з жонкай – Марыяй Юзэфай, якая па словах сучаснікаў быў брыдкая як грэх смяротны , уладкаваліся ў адмысловай альтанцы, пад якой праз вузкі праход праганялася дзічына.

Яе мосць сама забіла палову з 42 зуброў і шмат іншых жывёлінаў, у перапынках слухаючы французскія рамансы.

Аб адным з дзікоў, на спіне якога віднеўся выразны чорны крыж, я збіраюся Вам распавесці.

Аўгуст Сас, прывыклы паляваць да захад ад Эльбы, першы разу сустрэўся з такім асабліва памечаным дзіком. Калі егеры патлумачылі яму, што і для Белавежы такі звер з'яўляецца асаблівым, кароль пачаў распытваць мясцовых і ў выніку пачуў ад аднаго з загоншчыкаў – Леха Байко – такое вось апавяданне.

Калісьці даўно, па запрашэнні Конрада Мазавецкага, прыбыў у Польшчу Тэўтонскі ордэн. Рыцары Марыі павінны былі абараняць ад прусаў паўночныя рубяжы Мазовіі, а пасля навяртаць у хрысціянства плямёны балтаў. На практыцы, аднак, яны займаліся рабаўнічымі паходамі, пашыралі тэрор і папаўнялі ўласныя багацці.

Падчас аднаго з такіх паходаў чатыры рыцары ў белых плашчах з чорнымі крыжамі патрапілі ў Белавежскую пушчу. У той час быў гэта бязлюдны край. У малакалькасных хутарах можна было, аднак, сустрэць апошніх яцьвягаў і некалькі мазаўшан, якія замест земляробства аддалі перавагу паляванню і пчалярству.

Рыцары ордэну, наталіўшыся мясцовымі кабетамі, алянінай, калачамі і моцнымі мядамі вырашылі зрабіць што-небудзь для збаўлення мясцовага насельніцтва. Нагода прадставілася сама па сабе.

Ад аднаго з злоўленых "языкоў", які зрэшты сканаў, бо быў прабіты мячом (што было для крыжакоў, як сёння мы б сказалі, стандартнымі паводзінамі) рыцары даведаліся, што на рацэ Лутоўні жыве самотная старая знахарка – Ксантыпа.

Старая вяла пустэльны вобраз жыцця, служыла ранейшым багам, збірала травы, апрацоўвала дары пушчы і калі было трэба займалася варажбой, лячэннем ран, замаўляннем хваробаў, адным словам, выконвала функцыі мясцовага лекара.

Крыжакі рушылі да аддаленага ўрочышча поўныя імпэту, які не збілі нават знакі, што яны сустрэлі па дарозе.

Ні мёртвая сойка, што ляжала папярок лясной просекі, ні крык кугакаўкі ў самы поўдзень, ні нават від святога вужа ў залатой кароне не астудзілі іх запалу.

Крыжакі прыбылі на Лутоўню на захадзе, перад магічнай ноччу Купалы, падчас якой згодна адвечным славянскім вераванням чараўніцтва мае асаблівую моц. Прыбылі яны з аголенымі мячамі, каб адразу адправіць Ксантыпу наўпрост у гаспадарства Перуна.

Жанчына, аднак, хоць і была ў веку, ды не была пазбаўленая асцярожнасці, патрэбнай каб выжыць у лясным гушчары, поўным дзікага звера. Перш чым халоднае лязо кранулася яе грудзяў, яна вымавіла адпаведныя заклінанні і ператварыла рыцараў у чатырох дзікоў, якія на памяць аб гэтай падзеі былі азначаныя чорнымі крыжамі.

Старэйшыя людзі ў Белавежы не памятаюць, калі за апошні час удавалася забіць дзіка з крыжам на спіне. У гміне аднак гавораць, што яшчэ прынамсі адзін такі звер ходзіць у белавежскім нерушы. Яго бачылі некалькі год таму паблізу Месца Моцы ў квартале 495.

Гавораць таксама, што калі ён будзе забіты, вернуцца ранейшыя багі на чале з Лесавідам. Колькі ў гэтым праўды, цяжка казаць, але праўда тое, што два гады таму ў паселішчы Грушкі, насупраць надлясніцтва Броўск, з'явілася драўляная статуя Лесавіда.

**Сільвія Русіняк**
**Пра чалавека, які не пайшоў у неба, а і ў пекле не хапіла месца для яго...**

Некалькі гадоў таму, калі я яшчэ была малая, мая бабуля расказала мне адну гісторыю. Я спачатку думала, што будзе яна такой гісторыяй якіх шмат. Дык не была гэта звычайная казка, якую дарослыя расказваюць дзецям перад сном. Вядома, верыла я тады ў надзвычайныя з'явы, варожак, гномаў і прывіды як тыповая малеча. Было там шмат рэчаў незразумелых для мяне інтэрпрэтавала я іх па-свойму, бачыўшы вачыма дзіцяці. Расказ выклікаў ува мне вялікія эмоцыі калі я хацела выйсці з пакоя, ахопліваў мяне страх, ноччу мучылі кашмары... ды толькі нейкі час. Пасля аб ёй я забылася. Аднак гэтая гісторыя праз гады прыгадалася мне нанова. З-за звычайнай цікаўнасці хацела я даведацца чагосьці больш аб гэтым, бо казалі, што падзеі, пра якія чула даўно таму, здарыліся ў сапраўднасці...

Усё пачалося пад канец саракавых гадоў мінулага стагоддзя, пад лесам непадалёк вёскі Галёнкі, у Бранскай гміне, Бельскага павету. Сярод дрэў стаяла там малая драўляная хатка, наўкол былі сціплыя гаспадарчыя будынкі пасярод спакою лесу і ідылічнага краявіду. Як на той час, гэта быў салідны дом. Пражывала ў ім адна сям'я: бацька, маці ды чатырох сыноў. Галаву сям'і звалі Язафатам. Аднак быў гэта чалавек, які не верыў ні ў Бога, ні ў ніякую іншую вышэйшую моц. Затое меў вялікую ўмеласць быў адборным стральцом. Заўсёды трапляў. Аднойчы, мабыць, ад цікаўнасці, зайшоў у касцёл. Намеціўся ў Прычасце... і стрэліў. З раненай чашы стала плысці кроў (паводле іншай версіі Язафат прычасціўся, прасля хутка выйшаў з касцёла, дастаў з рота аплатак і тады яго прастрэліў). Страляў таксама ў крыж. Неўзабаве памёр.

Пахаванне адбылося звычайна як у кожнагага прыстойнага чалавека па жаданні жонкі па-каталіцку, хоць памерлы не быў веруючым. Пасля пахавальнай імшы і ўсіх неабходных абрадах сям'я, сябры і суседзі з навакольных вёсак падаліся на трызну абед ва ўшанаванне памерлага. Ніхто не прыкмеціў, што магіла не зусім закапаная... Было ўжо позна, цемра спавіла ўсю ваколіцу, таксама і хатку пад лесам. Жонка падрыхтавала багаты стол для прыбылых гасцей. На стале стаяла больш за дзесяць розных страў, а таксама былі хлеб і крыж. Незалежна ад таго, што на піры панавала добрая атмасфера, ніхто не спадзяваўся, што з гэтага дня ў гэтай малой вясковай хаце пачнецца сапраўднае пекла. Людзі былі заняты размовамі, а тут раптам... Штосьці зашапацела.

Шапаценне было далікатнае, амаль нячутнае, рабілася ўсё мацнейшым і гучнейшым. Наканец пачулі толькі брынчанне падаючага посуду. Са стала з грукатам зваліўся ўвесь посуд, дзіў: разам з абрусом! Падумаў бы хто вецер, ды на стале засталіся хлеб і крыж, някранутыя, стаялі так, быццам пад імі зноў ляжаў абрус. І гэта было прадказанне таго, што адбудзецца неўзабаве...

Толькі пра нейкі час людзі, што прыходзілі на могільнік, прыкмецілі, што ў магіле Язафата ёсць дзіра. „Лісіная нара!" падумалі і засыпалі яе. Аднак кожны дзень яма аднаўлялася і немагчыма было яе закапаць. Наступныя пару тыдняў мінула спакойна, хоць жонцы цяжка было сабрацца пасля смерці гаспадара. З гэтай пары яна адна мусіла ўпраўляцца, займацца жывінай, даеннем кароў, абедам для дзяцей... Дзеці не маглі яшчэ пасабляць у гаспадарцы, паколькі былі замалыя. Час ад час у дапамагаў ёй Гаёвы, які часта прахаджваўся па лесе і заходзіў да яе дахаты, паколькі здаўна сябраваў з усёй сям'ёй.

У адну нядзелю Гаспадыню запрасілі на хрэсьбіны да суседзяў і пакінула яна дзяцей пад апекай сваёй меншай сястры, якую раней аб гэтым папрасіла. Дзяўчына мела заняцца найменшымі дзецьмі. Вечарэла, дзяўчына гуляла з малечамі. Раптам пачула далікатнае стуканне, здавалася, з-за акна. Падышла, зірнула, аднак не ўбачыла нікога. Паклала малых спаць, сам накрылася радзюжкай і легла на скрыпучую канапу.

Калі пастукалі другі раз, сястра Гаспадыні кінула вокам на ніколі не адбіваючы гадзін гадзіннік з маятнікам з зязюлькай, што вісеў на знішчанай пабеленай сцяне. Даходзіла восьмая гадзіна. Жанчына прыгадала сабе, што ў гэтую гадзіну мела сустрэцца са сваім нарачоным. Падумала, што гэта якраз ён стукае ў акно, каб яна выйшла да яго. Не хацела выходзіць цяпер, ноччу. Ведала ж гісторыю свайго швагра. Паклікала:

Не гарэзнічай, уваходзь, ідзі ў хату, тут пасядзім!

Не ведала, што робіць таму што ад тае пары запрасіла духа Язафата дахаты. Стары, папсаваны гадзіннік, які ад гадоў не выдаў з сябе ніводнага гуку, растам стаў біць. Ды біў з гукам такім злавесным і пранікліўым, што дзяўчына ўсвядоміла сабе сваю памылку і адчула, што неўзабаве адбудзецца штосьці страшнае. Ад таго часу ў доме сталі тварыцца розныя дзіўныя рэчы. Часта былі чутны нечалавечыя водгукі, прадметы самі мянялі сваё месца... І не было на гэта ніякай рады.

Аднойчы Гаёвы заседзеўся крыху ў сям'і Язафата, а паколькі было ўжо досыць позна, рашыў у іх пераначаваць. Аднак не хацеў быць цяжарам для радзіны ў дзесяць асоб.

Ой, суседка, не хачу вам рабіць клопату, пайду, пасплю ў вашай стадоле. У вас і так у хаце людзей многа, нашто яшчэ і я...

Не ідзі, цяперака ноччу на падворку садом і гамора! Лепш кладзіся на падлогу і спі, раіла гаспадыня.

Гаёвы ўпёрся і не зважаючы на просьбы гаспадыні не хацеў начаваць у хаце. Не ведаў, што жанчына мела на думцы і сказаў без роздуму:

Не, нашто ж усё гэта, мне і там добра будзе.

І пайшоў. Было цёмна. У ідэальнай цішы цыкалі цвыркуны. Не глядзеў у асыпанае зоркамі неба, на месячную поўню і падворак апавіты месячным сяйвом. Думаў аб тым, каб хутчэй заснуць, адпачыць пасля працы. Урэшце ўбачыў невялікі будынак пад саламянай страхой. Адчыніў вялікія скрыпучыя вароты і ўвайшоў у сярэдзіну. Там было зусім цёмна. Хацеў знайсці месца на спычын навобмацкі, ды

знайшоў у кішэні запалкі.

Запаліў адну запалку і асвяціў нутро стадолы. Стаялі тут машыны, збожжа ў мяшках, але былі таксама стораны на сена. Без роздуму зайшоў у адну і ўлёгся на мяккім пахучым сене. Праз момант заснуў, аднак не спаў цвёрдым сном, якім спяць у бяспечным месцы. Раптам пачуў дзіўны стукат з кутка памяшчэння. Запаліў запалку і ўбачыў, што сячкарня замахваецца колам, хоць побач няма нікога, што ўвёў бы яе ў дзейнасць, а сям'я ж спіць у хаце. Дадумаўся, аднак, ад чаго ўсё гэта і з палам стаў адмаўляць малітву „Анёл Панскі...” за душу пакойніка. Сэрца біла яму моцна, ды вось машына стала набліжацца да яго! Шалёна фуркочучы стала ўзбірацца на сена. Спынілася блізка гаёвага, паўпрытомнага ад страху. Была ўжо як рукой падаць. Калі хацела яго крануць, сарваўся з месца і колькі сілы ў нагах памчаўся дахаты. Разбудзіў усіх і расказаў гаспадыні, што адбылося. На тое яна сказала:

Я ж табе гаварыла, каб туды не ішоў. Дома ў нас святы спакой, а на загуменні ён усё шалее. Кладзіся тут, ля печы, зараз прынясу табе радзюжку ці плед.

Гаёвы не прамовіў больш ні слова. Лёг на падлогу і спрабаваў заснуць. А тут раптам з кошыка выскачыла бульбіна і давай каціцца ў бок спячага. Ён ухапіў першую рэч якая была пад рукой (была гэта дзіцячая цацка) і з усяе моцы кінуў у бульбіну, якая ўрэшце спынілася. Гаёвы пацёр вочы, думаў, што гэта толькі благі сон. Ушчыпнуўся не, не сон гэта г э т а адбываецца сапраўды! Спалоханы чалавек ужо не хацеў спаць у цёмным памяшканні, асветленым толькі месячным святлом. Рашыў запаліць газоўку, што стаяла на драўляным стале пакрытым блеклым гафтаваным у кветкі абрусом. Нафта была за прыпечкам. Падышоў, хацеў узяць бутэльку з нафтай у рукі, ды бутэлька сама звалілася на падлогу. Удадатак, дзіва не разбілася! І таго яшчэ не хапала: стала каціцца ў яго бок! Не была завінчаная, не мела корка, ды нафта з яе не вылівалася... Зусім выведзены з сябе гаёвы ўцёк з гэтага дому і колькі сілы ў нагах папёр у вёску. Рашыў ніколі ўжо не наведваць гэтага месца, хоць вельмі любіў візіты ў сваіх сяброў.

Прывялі сюды нават войска, каб даследаваць, што такое адбываецца ў гэтым доме. Ды нават і адважных жаўнераў ахапіў жах. Калі ўвайшлі ў кухню, сталі каля печы. А тут раптам з-над печы з вялікім грукатам высунуліся дымнікі. Аднаму з вайскоўцаў зляцела шапка. Ды ён яе нават не падняў і разам з усімі ўцёк, не хаваючы свайго ляку. Гаспадыня стаяла як укапаная. Праз хвіліну дайшла да вываду: душа страшыла толькі чужых, ніколі не кранула яе ці дзяцей.

Нервы жонкі Язафата былі як сталёвыя. Турбавала яе, што ўласны муж палохае ў іх уласным доме, ды пераносіла ўсё з сапраўды стаіцкім спакоем. Баялася за сябе, за дзяцей, а найбольш пераймалася тым, што Язафат не збаўлены. Была яна вельмі добрай, веруючай жанчынай. Часта таксама ў час, калі карміла жывёлу, дапамагаў ёй чорны вялікі сабака, які прыходзіў невядома адкуль. Браў у мызу вядро і паслухмяна памагаў гаспадыні насіць сена і ваду для кароў. Пасля інцыдэнту з войскам справай зацікавілася прэса, прыехалі журналісты, распытвалі гаспадыню. Яна аднак неахвотна адказвала на пытанні. Запрасілі таксама эгзарцыста спецыяліста па выганянні нячыстай сілы. Той у сваю чаргу загадаў, каб адправілі імшу ў тую саму пару ў дзевяці розных касцёлах. Так і зрабілі. Тады стары гадзіннік стаў біць ізноў Язафат пакінуў дом. Дзіра ў магіле таксама прапала...

Мінула некалькі гадоў. Двух мужчын з суседняй вёскі прыехалі ў лес па дровы. Так склалася, што гэта былі сваякі Язафата. Спыніліся тут і рашылі зайсці да

крэўных. Пакінулі воз з драўнінай і коньмі на падворку, дзе пасвіліся козы, а самі пайшлі ў хатку. Час мінуў маланкава, як бывае пры сустрэчах з даўно нябачанай раднёй. А тут раптам і поўнач  час збірацца ды вяртацца ў сваю вёску. Падзякавалі гаспадыні за гасціну, можа і небагатую, ды чым хата багата, выйшлі на падворак, а тут... коні стаяць прывязаныя да коз адной вяроўкай. Выклікала гэта вялікі смех думалі, што гэта работа гарэзлівых хлопцаў. Аднак гаспадыні не было да смеху. На яе паморшчаным твары,  ізноў, праз пару гадоў гармоніі і палёгкі, паявіўся неспакой.

Яна ведала, што муж вярнуўся.

Стаяла прыгожая летняя ноч. Іншы пляменнік Язафата выбраўся з таварышамі на прагулку па лесе. Стаяла ціш, не зварухнуўся ні адзін лісток. Хоць гадзіннік біў ужо начныя гадзіны, было светла,  месяц у поўні быў як аграмадны ліхтар. Мілы спакой надзяліўся і шпацыруючым па лесе. Праходзілі якраз ля палоскі пшаніцы. Аж тут раптам сарваўся гвалтоўны вятрыска. Схапіў іх шапкі, закалыхаў голлем дрэў, завіраваў у збожжы, не даваў ісці, мала хапала, а панёс бы іх у паветра. Працягвалася гэта няпоўную мінуту і сціхла, быццам бы нічога не было. Ноч была такая ж прыгожая, як да віхуры. Мужчынам здалося дзіўным, аднак адразу ўгадалі, што было прычынай гэтай з'явы.

Бачыш, так цяпер дзядзька танцуе,  сказаў першы.

Другі нічога не сказаў, глянуў толькі ў папрамку доміка ў лесе і прыспешыў крок. Ведаў, што гэта было дзеянне духа.

Праз пару гадоў мой прадзед падвозіў быў жонку Язафата. Пытаўся ў яе пра сітуацыю, якая мучыць яе ўжо гадамі і з'яўляецца сенсацыяй для навакольных вёсак. Маўчала момант, пасля сказала, што дома ў яе спакойна, ды на панадворку так, як было. Чорны сабака далей пахаджвае пад домам, без прычыны ўзрываецца вецер, дзіўна паводзяць сябе жывёлы...

Сёння ў месцы тае хаты няма нічога. Ніхто там не жыве, разбурылі будынкі, сляды гэтай гісторыі амаль зусім сцертыя. Наколькі пару дзесяткаў гадоў таму выклікала яна зацікаўленне людзей, нават прэсы, сёння ніхто ўжо аб ёй не памятае. Час замёў усе сляды. Толькі старэйшыя людзі, што памятаюць былыя часы,  могуць што-небудзь сказаць на гэтую тэму. Ды гавораць яны неахвотна. Можа, гэты аповед не быў зусім аўтэнтычным, можа, было ў ім маленькае зернейка праўды... гэтага ніхто не ведае. Магчыма, быў ён творам народнага ўяўлення ці плётак, якія перадаваліся адны ад адных. Легенда кажа, што Язафат да сённяшняга дня мучыцца на зямлі, не можа знайсці патолі. А ўсё з-за вельмі меткага вока. За тое, што страляў у Крыж і Прычасце, не ўпусцілі яго ў рай, нават пасля стольскіх гадоў бадзяння па зямлі.

А і ў пекле месца таксама для яго не было. Цяпер, калі ў час прыгожага надвор'я раптам сарвецца вецер, у наваколлі кажуць, што гэта дух Язафата надалей танцуе ў збожжы. Цяпер гэтая гісторыя для мяне не такая жудасная, якой мне была тады, калі я яе пачула першы раз. Некаторыя кажуць, што ўзнікла яна для нагоды „палохання неслухмяных дзетак”, што не слухаюцца бацькоў. Мой прыклад даказвае яе паспяховасць. Не хацела б я, аднак, каб слых пра яе прапаў, таму пераказваю яе іншым.

*На аснове апавяданняў бабулі  Аліны Залеўскай з роду Чарняўскіх.*

**Тамаш Пётр Краўчук**
**Татка, чапаная**

Тадэвуш ведаў шмат багатых людзей у Кнышыне, і сам паходзіў з заможнага сялянскага роду. Меў трох старэйшых братоў, якія вучыліся ў вялікіх гарадах. Ён як наймаладзейшы меў атрымаць у спадчыну ад бацькоў усю гаспадарку.

Бацька хлопца, так як і маці, ужо не былі маладымі людзьмі. Тадэвуш назіраў за бацькамі сваіх равеснікаў і ведаў, што большасць з іх была значна маладзейшай за яго бацькоў. Аднак ніколі не хапала яму адвагі спытацца, чаму так. Ды і не мела гэта для яго гэта вялікага значэння. Бацькі яго кахалі і толькі гэта было важным.

Калі можна было меней інтэнсіўна працаваць на гаспадарцы, бацька Тадэвуша займаўся кавальскім прыкладным і мастацкім рамяством, аказваючы паслугі ўсей кнышынскай супольнасці, для панскага двара і касцёла. Да кавальскага рамяства меў ён ад нараджэння вялікую здольнасць і жаданне, і часта ім займаючыся, вырабляў умелай рукой вельмі прыгожыя рэчы: стрэлы, мячы, сякеры, засаўкі, завесы, замкі і вісячыя замкі, акоўкі на скарбовых скрыні, крыжы, флюгеры, балюстрады і краты, а таксама акоўваў вазы, брычкі, сані і падкоўваў коней.

Тадэвуш вельмі часта дапамагаў бацьку ў працы ў полі, пасабляў ён таксама і ў кузні, але хутчэй з наганяю чым ад вялікага жадання. У кузні заўседы дапамагалі бацьку яго браты, якія бывалі ў Кнышыне ў перапынках паміж навукай, і тады Тадэвуш атрымоўваў любімага карага каня і ехаў у Кнышынскую пушчу, у гай – даўні каралеўскі звярынец альбо на ўзгорак пад лесам, адкуль захапляўся прыгожымі краявідамі і панарамай каралеўскага Кнышына. З цягам часу бацькі Тадэвуша рабіліся ўсе багацейшымі ў перажытыя гады і ўсе слабейшымі са здароўем. Няўхільна збліжалася тое найгоршае, што чакае кожнага чалавека: “хто нарадзіўся павінен памерці”.

Захараваў бацька і Тадэвуш доўгія месяцы гаспадарыў сам, гаспадарыў добра і ўсе лепей у яго атрымлівалася гаспадаранне. Неўзабаве стаў ен гаспадаром ужо назаўседы, бо хутка яго бацька памёр. Браты пажаніліся, утварылі ўласныя сем’і і толькі Тадэвуш заставаўся яшчэ без жонкі, і не вельмі з гэтым спяшаўся. Маці яму мыла і варыла, у яго былі ўласныя грошы і ўласная свабода, таму што маці шмат на яго не крычала, хоць і часта памінала, каб не наведваў шмат карчмаў, таму што можа згубіць там апроч грошаў яшчэ і здароўе, красу ды маладосць, і ніводная

маладая жанчына не захоча стаць яго жонкай. Але Тадэвуш быў хлопец прыгожы і карыстаўся поспехам у дзяўчат. У час забаў і гулянак з танцамі дзяўчаты спаборнічалі паміж сабою за права запрасіць яго на белы танец, прычым запрашалі часам па тры адразу.

Праз нейкі час Тадэвуш апавядаў маці аб чарговай дзяўчыне, якая паводле яго падыходзіла на жонку і гаспадыню. Аднак жа маці мела заўседы іншую думку: то недастаткова гаспадарлівая дзяўчына, то распусная, то не з такой заможнай сям'і паходзіць, то кароў даіць і за хатай сачыць няздольная; словам, ніводная яму не падыходзіла, хоць, шчыра кажучы, і падабаліся яму кожная, але не хацеў ён крыўдзіць маці, якую любіў і шанаваў. І заставаўся далей нежанатым. Але час не стаіць на месцы, а бяжыць наперад. Праходзілі дні, месяцы, гады. Аказалася, што ён ужо перабраў усіх кнышынскіх дзяўчат і не было адпаведнай сярод іх для яго, таму што маладзейшыя дзяўчаты усе больш паглядаюць на маладзейшых кавалераў.

На жаль, маці таксама рабілася ўсе старэйшай, і яе здароўе псавалася, таму маладая і здаровая жанчына ў хаце станавілася ўсе больш патрэбнай. Нават маці казала ўжо, што для яе было бы лепей, калі б сын ажаніўся раней.

Дык вазьмі і паспрабуй ажаніцца цяпер – без сватоў не атрымаецца  Хаця і раней, калі ён быў маладзейшы,  дык усе карысталіся дапамогай сватоў.

Згодна з польскай  народнай традыцыяй, малады чалавек ніколі не прасіў рукі дзяўчыны ў яе бацькоў сам, але рабіў гэта праз свата, які быў салідным і гаваркім суседам альбо сваяком. Гэты народны звычай сёння існуе толькі ў некаторых рэгіёнах Подляшча, і гэта ўсе што засталося ад даўняй традыцыі польскай шляхты. Не можна было абганяць едучай світы сватоў, гэта лічылася не бяспечным і абразлівым. Адсюль паходзіць старае выслоўе: "Не выязджай перад сватоў, не будзь разумней сваіх гадоў". Без сватоў не было польскага шлюбу. Сват, якога таксама называлі райкам, у час вяселля вадзіў рэй і прамаўляў. Быў вясельным старастам.

Пад уплывам нялёгкага, амаль што крытычнага становішча ў хаце, Тадэвуш звярнуўся да вядомага райкі – Міхала, які ўжо не аднаму хлопцу дзяўчыну і не адной дзяўчыне хлопца высватаў. Не адну пару ён злучыў, а ўжо як яны жылі пасля ў шлюбе, залежыла толькі ад іх саміх. На далейшае жыцце маладых сват ужо не меў уплыву. Можа таму ён і жыў сам адзін, а можа таксама, як Тадэвуш, не звяртаў увагу на час і поры года і аб пастаяннай жанчыне для сябе не думаў, хоць з-за сваей сватоўскай прафесіі і ведаў сотні жанчын.

Звычаі райкаў і сватаўства былі зацверджаны ў якасці традыцыі паўсямесна ў кнышынскай супольнасці і не толькі там. Гэта быў польскі нацыянальны звычай.

-- Ведаеш што, Тадэвуш, есць у мяне для цябе падыходзячая дзяўчына, – абвясціў райко -- Міхал, – здаровая, працавітая, такая, якая табе патрэбна.

-- А ці мае яна які-небудзь пасаг? Бо трэба трохі падцягнуць маю гаспадарку.

-- Мае, мае, а калі мы патаргуемся, то яшчэ і больш дадуць. Гэта ўжо мая справа. Толькі я буду гаварыцьь, а ты часам мне падтаквай.

-- Гарэлку возьмем?

-- А як жа ж  Што гэта за райкі без гарэлкі

Селі яны ў брычку і світа сватаў запрэжаная ў парай прыгожых коней з гонарам і з фантазіяй адправілася ў дарогу. Стаяла жніво. Неба біла ў вочы блакітам. Смарагдавы небасклон, на якім не было нават наймнейшай хмурынкі,

расцягнуўся з усходу на захад, з поўначы на поўдзень. Толькі каля самага гарызонту неба трошкі сівела і блакіт губляў сваю глыбіню. Каля вільчака вежы кнышынскага касцёла, амаль невідочны ў святле сонца, віднеў бледны месяц. Калі пражмурыць вочы, то можна было нават пабачыць на ім моры і кратэры. Дзень быў сонечны, але сімпатычны паўночны ветрык авяваў прахалодай твар і гуляў валасамі, шамацеў лістотай прыдарожных дрэў. Перад выездам да будучай нявесты, райко сказаў Тадэвушу:

-- Мы схаваем гэтую літроўку ў ляшку жыта. Калі ўсе пойдзе добра, і мы дамовімся, ты выйдзеш з хаты і прынясеш бутэльку.

І вось яны ўжо стаяць перад хатай і дзверы чаканым гасцям адчыняе рука гаспадара, таму што райко ніколі не прыязджаў без папярэджання. Быў ён тут ужо некалькі дзен раней і аб усім, альбо амаль аб сім дамовіўся.

-- Няхай будзе пахвалены... – складна сказалі яны разам на павітанне.

– На векі вечныя... – адказаў хор.

У пакою былі яшчэ тры жанчыны: маці, сватка і суседка, а таксама тая найважнейшая дзеля якой быў увесь гэты візіт.

-- Дык сядайце, просім. Сёння вы – нашы госці. Што за справа вас прывяла да нас?

-- Мы так сабе ў госці ехалі – пачынае мову райко. – І вось гэтай зяленай сцежкай прыехалі да вас, бо можа вы штосці для нас маеце, і можа нам гэта прадасце.

-- А што ж вы купіць хочаце, можа нам скажаце? – далучаецца да гутаркі сваціха Стаха.

-- Гэтаму вось кавалеру каня да пары хочам купіць.

-- Каня на продаж не маем.

-- Можа быць і карова, абы толькі нестарая і каб была здаровая.

-- Не Каровы на продаж таксама не маем.

-- То можа вы ялоўку маеце і нам яе прадасце?

-- Можа і маем Але яна яшчэ маладая і шмат каштаваць будзе, – аб'яўляе сватка.

-- Патаргуемся. А купца я прывез такога, які аб грошах не клапоціцца. Таму я вам скажу ў рэшце, па што мы да вас прыехалі. Мы прыехалі да вас у райкі, таму што маеце дачку на выданне, а яму патрэбна жонка і гаспадыня ў хаце. Бацька памёр, маці яго, слабая, не можа шмат дапамагчы, і яму аднаму гаспадарыць цяжка. А яшчэ хачу сказаць, што дачка ваша яму вельмі даспадобы прыйшлася і напэўна будзе для яе добры. Шанаваць яе будзе, на руках насіць, і нічога бракаваць ёй не будзе

– Наша Кася адзіная ў сям'і і не пойдзе за абы-каго.

– Ну што вы тут кажаце? Я абы-каго сюды не прывёз А Тадэвуш гэта добры хлопец і добры гаспадар, мае вялікую гаспадарку і пабудовы. Ці ж не відаць, які ён прыгожы? Ён вельмі шчыры, верны і шляхетны. Падыходзіць да ўсіх спраў разважна і сур'езна. Заўседы стараецца даць добрую раду і дапамагчы калі патрэбна. Ён вельмі аддана дому, маці, сям'і. Заўседы лагодны, ураўнаважаны, справядлівы, мае правадырскія здольнасці. Не аддае зашмат увагі вопратцы, але заўседы выглядае элегантна. Любіць прыроду, таму яго гаспадарка заўсёды прыгожая і багатая ўраджаем. Ён хлопец адкрыты і шчыры, не церпіць хлусні і крывадушша. Заўсёды стараецца займацца чымсьці карысным, але рэдка застаецца

задаволены вынікамі сваёй працы, таму што хацеў бы, каб тое, што робіць, было яшчэ лепшым, найлепшым. Не чакае ад жыцця шмат багацця і раскошы. Усе, што набывае ў сваёй гаспадарцы, набывае шчырай працай, як гаварыць прыслоўе: "Толькі шчырая праца людзей багаціць". З'яўляецца ён хлопцам вельмі тактычным і далікатным, ніколі нікому не дакучае, не з'яўляецца цяжарам, лепш сам штосьці згубіць, чым кагосьці падвядзе. Не любіць грубасці і дрэннага выхавання. Такі вось наш кавалер

– А наша дзяўчына як лясная маліна, кроў з малаком, не вада, а ў дадатку прыгожая і маладая, – дэкларуе сваціха. – Працавітая як пчолка, кланяйцеся маці, каб вам яе аддала

– Тады мы ласкава просім, – райко падыходзіць і цалуе маці руку. – Маці дарагая, прымі ў зяця гэтага юнака.

Услед за райкам і Тадэвуш становіцца на калені перад маці і цалуе яе руку:

– Дарагая маці, не рабіце мне прыкрасці, не адмаўляйце, вельмі прашу вас, і Касю за жонку мне аддайце, а пасагу колькі дасцее, то і добра, абы толькі была жанчына ў хаце.

– Так і ў Касі трэба ж спытацца, ці хацела б за цябе замуж, – адказвае Касіна маці. – Кася, як табе гэты кавалер? Пойдзеш за яго?

У Касі заззялі і шырока расплюшчыліся вочы, пачырванелі ружовыя шчочкі і яна радасна усклікнула:

– Так, маці, так Нават ужо сення я б хацела быць яго жонкай. І не хачу ўжо больш чакаць нікога іншага, бо напэўна лепшага не знайду А ён прыгожы і добры, мне вельмі падабаецца

Хвіліна маўчання і наступае вялікая палёгка ў хаце, сярод тых што прыехалі і сярод тых, што чакалі.

-- Няхай так і будзе. Згода, – кажа маці.

– Згода, – рэхам паўтарае бацька.

Заручыны адбыліся. Райко кіўнуў галавой Тадэвушу, каб прынсс тое, што было схавана ў жыце. Тадэвуш выйшаў з хаты, а за ім следам выйшла і дзяўчына. Дайшлі яны да месца, дастаў Тадэуш бутэльку і моцна здзівіўся, таму што яна была няпоўная, як ён пакінуў яе, а толькі напалову поўная.

А было гэта так. Калі яны хавалі бутэльку ў жыце, падглядзелі іх пастушкі, і як толькі зніклі райкі ў хаце, дасталі яны бутэльку і палову выпілі.

Вярнуўся Тадэуш з дзяўчынай дахаты, у адной руцэ трымаючы яе руку, а ў другой бутэльку. Развеў рукі і сказаў райку:

– Татка, пачатая

– Не можа быць, хто пасмеў

Вялікая разгубленасць запанавала ў хаце, усе змоўклі. Але першая адгукнулася сваціха:

– Аб чым вы гаворыце, я ж яе добра з дзяцінства ведаю Гэта добрая, спакойная і прыстойная дзяўчына

– Аб чым вы гаворыце Трымайце мяне, бо я за сябе не адказваю Яна заўседы ў хаце і нікуды за гаспадарку не выходзіць. Толькі ў кожнае свята ездзіць з намі ў касцёл у Кнышыне, – стаў бараніць дачку знерваваны бацька. – У звыклыя дні дапамагае нам ў працы. Так, было тут двое райкаў, але да заручын не дайшло І дарэмна вы такое кажаце У яе нікога няма, ні з кім яна не спатыкалася і дагэтуль не спатыкаецца. Кажу гэта, з рукой на сэрцы, як Бог мне мілы. Гэта велькі сур'езны

паклёп, і я яго не магу слухаць. Калі вам мая дачка не падабаецца, дык едзьце сабе да іншай, а маю дачку я крыўдзіць не дам і нічога дрэннага сказаць пра Касю не дазволю. І гэтыя заручыны, якія мы так згодна і хутка зладзілі, можам таксама хутка разарваць.

Усчаўся вялікі гоман, шум, хаос. Кожны казаў ад сябе: бацька, маці, сваціха, суседка. Толькі маладыя стаялі моўчкі. Навошта гэты гам, гэтыя крыкі, калі не ў тым справа?

З вялікай праблемай сутыкнуўся сват. Такога з ім яшчэ ніколі не было. Усе яго старанні маглі ў адну хвіліну марна прапасці. І што ж гэта такое? Няўжо ж няўдача? Гэта было недапушчальна і не ў яго стылю. „Нашто мне патрэбна галава”, – як казаў ён часам голасам вясельнага старасты, і сказаў скромную прамову, што мае месца невялікае непаразуменне. Не аб дзяўчыне, а аб бутэльцы гаворка. Узяў ён ад юнака тую пачатую бутэльку і ветліва перапрашаючы, паставіў на стол. Другую, толькі поўную, паставіў на стол бацька, а маці заставіла стол ежай. Нядаўні крык ператварыўся ў шчыры смех. А гучней за ўсіх смяялася сваціха і набліжалася да свата. Пасля першай і другой чаркі ўсім зрабілася лягчэй, а пасля наступных у хаце было ўжо зусім весела.

Заручыны аказаліся значна больш плённымі, бо сталі рыхтаваць два вяселлі замест аднаго. Другое вяселле будзе свата і сваціхі, таму што сваціха аказалася таксама асобай вольнаю, удавою, і да таго ж вясёлай удавіцай. Вельмі вясёлай

**Тамаш Ліпаман**
**Сыч**

Даўным даўно, калі па дарогах вандравалі рыцары ў зброі, а людзі былі падобныя да волатаў, паляваў у белавежскіх лясах на вялікага звера малады князь. Юнак вызначаўся вялікай фізічнай моцай і яшчэ большай адвагай. Карацей кажучы, на мядзведзя ён хадзіў, узброены толькі ў драўляную піку з жалезным наканечнікам. Адной чэрвеньскай ноччу паляўнічы адпачываў пасля ўдалых ловаў над рэчкай Лутоўняй, калі ў промнях узыходзячага месяца убачыў дзяўчыну неверагоднай красы, якая купалася ў хвалях пушчанскай крыніцы.

Маладыя спадабаліся адно аднаму і хутка паміж заквітнела вялікае каханне.

Аксана не бачыла свету за каханым, а княжыч з запалам прыносіў да яе хаты забітых зуброў, мядзведзяў, тураў і аленяў, што ў тыя часы было роўна вялікім пацверджаннем кахання, як сёння кошыкі чырвоных ружаў сярод зімы.

Справа ішла б сабе найхутчэй сваім упартым шляхам і ўсю аповесць можна было б скончыць сакраментальным "жылі доўга і шчасліва", калі б да справы не ўмяшалася адна вядзьмарка, якая валодала не толькі ведамі ўжывання ўсялякіх зёлак у чарадзейскіх мэтах, але і перадаванымі з пакалення ў пакаленне таемнымі ведамі, якія дазваляюць заклінаць адну рэч у другую згодна пажаданню. Ксантыпа, бо так вядзьмарка называлася, жыла з незапамятных часоў на паляне над рэчкай Лутоўняй, з усіх бакоў абсаджаную пракавечнымі дубамі. Векавая жанчына займалася збіраннем зёлак, навядзеннем праклёнаў, прыгатаваннем усялякіх лекаў і атрут, а таксама іншымі рэчамі, уласцівымі ейнай прафесіі.

Ксантыра наогул была задаволена пустэльніцкім жыццём, спакоем ляснога закутка і таварыствам дзікіх звяроў, якіх спрадвеку жыло шмат у белавежскім краі. Яе спакой аднак рассыпаўся ў шматкі ў момант, калі яна спаткала палюючага ў пушчы князя. Старая вядзьмарка загарэлася да маладога хлопца пачуццём свежым, як маёвы ветрык і разам з тым магутным, як зімовая завіруха.

Ксантыпа явілася перад князем то ў выглядзе даўганогай лані, то сарны з заплаканымі вачыма, каб хутка перастварыцца ў гожую дзеву з выдатным, пругкім бюстам. Іншым разам з'яўлялася як паветраная русалка, якая вабіла нячулага княжыча спевамі такімі чыстымі і вабнымі, як ягады малінаў з кроплямі ранішняй расы.

Усялякія залёты стараватай чараўніцы скончыліся аднак поўным правалам,

бо, як апавядалася раней, княжыч быў безнадзейна закаханы ў Аксану, дзяўчыну маладую і вельмі прыгожую.

Калі вычарпаўся ўвесь рэсурс закляццяў і чараў, Ксантыпа прызнала сябе пераможанай і найхутчэй дазволіла б каханкам зведваць зямное шчасце, калі б не фатальнае спатканне з маладым князем у вілах Лютоўні і Нараўкі. Паляўнічы, убачыўшы аднойчы вядзьмарку ў ейнай сапраўднай маршчыністай постаці, згорбленай, з барадаўкамі на твары і з крукам сядзеўшым на яе плячы, вырашыў далучыць Ксантыпу да астатніх звяроў, якімі княжыча тая апошнім часам адарыла.

У гарачым гневе ўзяў шырокі размах , каб трапіць старой чараўніцы сваёй драўлянай дзідай проста ў сэрца. Ксантыпа, хоць ўжо і была векавой, не была аднак пазбаўленая спрыту, неабходнага да выжывання ў Пушчы, поўнай дзікіх звяроў. Перш чым халоднае вастрыё дакранулася да яе грудзей, здолела вымавіць адпаведнае закляцце і ў імгненне вока ператварыла гарачага княжыча ў лясную мыш.

Раз'юшанай вядзьмарцы, аднак, не было дастаткова такой помсты і каб яшчэ больш замацавацца ў сваёй перамозе, ператварыла прыгожую Аксану ў сыча, які – як вядома – каб выжыць, мусіць есці ўсялякіх лясных і палявых мышэй.

Ад тых часоў кожны сыч перасцерагае ўсялякіх мышэй, кратоў, андатраў сваім пагукваннем, каб выпадкам не з'есці каханага княжыча, ператворанага ў лясную мыш. Легенда кажа, што злыя чары страцяць моц, калі за сто гадоў чалавек не ссячэ ў Белавежскай пушчы ні аднаго старога дрэва.

Ці засталося нам толькі жыць надзеяй, што Аксана і Княжыч будуць у далёкай будучыні біблейскімі Адамам і Евай?

**Альжбета Андрулевіч**
**Златарыя**

Кожная прыстойная легенда, таксама як і тая, што распавяду я, пачынаецца словамі “даўным-даўно…”. Гэта таму, што дзеянне адбывалася ў тыя часы, калі кожны парог і кожная клямка мелі свайго бога. Жыў тады князь Сабеслаў, які ў адзіноце выхоўваў сына Рудзяна.

Рудзян быў вясёлым і шляхетным маладым чалавекам. Усе дзяўчаты з навакольных двароў, якімі валодаў князь, былі закаханыя ў княжыча. Але ён не адказваў на іх пачуцці, і працягваў шукаць тую адзіную.

Аднаго дня Рудзян са сваёю світаю паехаў на паляванне. Доўга шукаць здабычу яму не давялося, бо навакольныя пушчы былі поўныя звяр’я. Толькі ўехалі яны паміж дрэў — сябры Рудзяна ўпалявалі некалькі зайцоў. Ды і сам князь вельмі прыемна бавіў час.

Было ўжо цёмна, калі Рудзян са світаю вяртаўся ў горад. Раптам штосьці зашапацела ў хмызняку. Князь прыглядзеўся і ўбачыў прыгожую сарну з залатым хвастом. Загадаўшы сябрам вяртацца, ён памчаўся за зверам, які таксама яго ўбачыў і спужаўся. Князь перaследаваў сарну, пакуль не зрабілася зусім цёмна. Сарна кудысьці знікла, а князь заблукаў ў цемры і моцна спужаўся, бо ў лесе было дзіўна ціха і спакойна. Блукаючы, Рудзян стараўся ўспомніць, як сюды трапіў. Раптам ён убачыў постаць, якая стаяла над забітай сарнай, і пад’ехаў да яе. Перад ім стаяла блакітнавокая дзяўчына з залатой сплываючай на плечы касой. Сэрца Рудзіяна забілася хутчэй.

— Магла б ты падказать мне дарогу з лесу? Я заблукаў, даганяючы гэтую сарну.

— Тваё імя Рудзян, праўда? — запытала дзяўчына, гледзячы яму проста ў вочы. — Я чакала цябе.

— Ты? Дзеля чаго? Чаму ў лесе? — здзівіўся князь.

— Маё імя Златарыя, я нарачоная князя Кнышына. Ты павінен мне дапамагчы. Так было напісана ў зорках, – сказала паненка, падыходзячы да Рудзяна.

— Чым я магу дапамагчы? — з гэтымі словамі князь спешыўся.

— Кнышын — гэта люты чалавек і мае ён страшныя планы. Мы не можам тут размаўляць. Ідзі за мною — дзяўчына ўзяла Рудзяна за руку і павяла за сабою.
Яны дайшлі да маленькай хаткі, ў якой палілася святло. Рудзян пакінуў каня і ўвайшоў са Златарыяй у хату. Там дзяўчына распавяла яму ўсё ад пачатку. Златарыю

выкраў Кнышын. Забараніў ёй бачыцца з сям'ёй, пакуль яна не прысягне, што стане яго жонкаю. Златарыя спачатку не згаджалася, але калі Кнышын пагразіў, што заб'е ўсіх яе родных і ўсіх людзей у месцы, дзе яна жыла, дзяўчына змяніла рашэнне. Але не гэта было найгоршым. Кнышын быў як сам д'ябал. Ён быў моцна раззлаваны на князя Сабеслава і яго сына Рудзяна. У хвіліну слабасці Кнышын распавёў Златарыі, што з'яўляецца зводным братам Рудзяну, і што князь Сабеслаў пазбыўся яго з маці, падазраючы, што не быў ягоным сынам. Кнышын хацеў быць адзіным уладаром, але цяперашні князь і яго сын яму перашкодзілі. Маці Кнышына, даведаўшыся аб планах сына, пракляла яго. Кнышын дзеля ўласнай бяспекі зачыніў маці ў лясной хатцы. Златарыя трапіла туды ж за спробу уцячы ад Кнышына, дзе і даведалася аб планах будучага мужа. Маці Кнышына загадала ёй уцячы і паведаміць аб небяспецы Рудзяну і яго бацьку. Яна дала дзяўчыне каробачку, па якой Сабеслаў мог пазнаць, ад каго яна ёсць. Унутры быў ліст, дзе апісвалася ўсё, што здарылася.

Выслухаўшы гісторыю, Рудзян вырашыў як мага хутчэй паведаміць аб усім бацьку. Ён ускочыў на каня і ўзяў з сабою Златарыю. Выязджаючы з лесу, яны пачулі страшнае скавытанне. Рудзян прыспешыў каня. Златарыя ўбачыла зграю сабак і іншых стварэнняў, што праследавалі іх, і ўскрыкнула. Рудзіян спыніўся ў першай мясцовасці, якая трапілася ім на шляху, і ўвайшоў у адну з хат, просячы прытулку. Гаспадары прытулілі маладых і выслухалі іх гісторыю пра тое, што здарылася, і потым пабеглі да суседзяў за дапамогай.

Вакол хаты, дзе схаваліся Рудзіян і Златарыя, чутны былі страшныя стогны і скавытанні. Златарыя сказала, што існуе толькі адзін спосаб, каб Рудзян бяспечна трапіў ў горад і папярэдзіў бацьку аб небяспецы. Ён павінен быў мець на руках кроў дзяўчыны без граху і заган. У хаце нявінніцай была толькі Златарыя. Рудзян не хацеў на гэта пагадзіцца, бо дзяўчына завалодала яго сэрцам. Златарыя таксама хацела ратаваць Рудзяна, бо закахалася ў хлопца. Са слязьмі на вачах убіў князь нож ў сэрца дзяўчыны. З яе цела паплыла барвовая кроў, у якой хлопец змачыў рукі. Князь выбег з хаты, ускочыў на каня і паскакаў, ахоўваны крывёй каханай.

Сабеслаў учыніў расправу над Кнышынам, а яго маці зноў узяў да сябе. Але Рудзян не мог знайсці сабе месца ад жалю.Урэшце сэрца яго не вытрымала і разарвалася ад роспачы і болю. Цела князя знайшлі ў рацэ. Вада ў ёй была рудая. Таму вёску, якая была непадалёку, Сабеслаў назваў Рудою Рэчкай. А вёску, з якой паходзіла каханая Рудзяна, ён назваў у гонар дзяўчыны Златарыяй. Целы маладых пахавалі на гары, якая знаходзілася паміж дзвюма гэтымі мясцовасцямі. Вёску ж, у якой Рудзіян знайшоў дапамогу, вызваліў ад падатку і назваў Воля Ратавецка, у гонар выратавання сына.

А гаспадарам, якія прыгарнулі Рудзяна, даў цэлую мясцовасць, у якой можна знайсці золата і ў гонар залатога сэрца назваў яе Залатой Вёскай. А пушчу, у якой Рудзян пазнаёміўся са Златарыяй, назваў пушчай Кнышынскай, каб памятаць пра зайздрасць Кнышына.Сам жа Сабеслаў вярнуўся ў свой град. Там таксама зрабіў змены. Загадаў людзям вырабляць дахоўкі з гліны і крыць імі хаты. Іх выкарыстанне садзейнічала таму, што дым выносіўся над хатамі. Свой град Сабеслаў назваў Чорнай Вёскай. Пазней, калі па прыкладзе Мешка прыняў хрост, збудаваў касцёл і змяніў назву града з Чорнага на Касцёльны. Праз нейкі час князь памёр, а яго цела пахавалі побач з Рудзянам і Златарыяй.

Да нашых дзён там пануе спакой і ніхто там не шкодзіць. У Чорнай Вёсцы Касцёльнай надалей вырабляецца гліна, а рэчка, у якой Сабеслаў знайшоў цела

Рудзяна, увесь час плыве пры Рудой Рэчцы і Златарыі, злучае іх, як каханне з’яднала князя і дзяўчыну.

Гэтую легенду распавяла мне прабабуля Феліцыя Вільчэўская, якая ўжо не жыве. Мне тады было каля 10 гадоў, і тады мяне моцна зацікавіла тая гісторыя. Напісала яе для таго, каб таксама і ішыя, хто яшчэ яе не знаді, даведаліся пра Рудзяна і Златарыю.

**Таццяна Трафімчык**
**Легенда пра Ўслонім-гарадок**

# Р

Радзіма пачынаецца з легенды
Пра горад каля ціхае ракі,
Якую захавалі нашы дзеды
І любяць успамінаць бацькі.
Яе мы ўсім сэрцам палюбілі
І слухаем захоплена заўжды
Легенду пра знаёмыя мясьціны,
Пра горад Слонім, родны, дарагі.
Яе паведаць вам мы будзем рады,
Радзіму апяяць, зямельку, бор,
Людзей, шляхоў – дарог прысады.
Дык пачынайма думак перабор
Было ўсё гэта ў лясах дрымучых,
Якія на прастор зямлі
Праз сонечны абсяг шырокі
Ля Шчары-рэчкі праляглі
Прыйшоў сюды з дружынай княжыч,
Убачыў лона пышных траў,
Якая прыгажосьць навокал, —
У духмянасьць лугу ён ўпаў.
А рэчка Шчара хвалі несла,
Яна шумела ў чаратах,
Было ад траў і кветак цесна.
Высокім быў лясісты дах.
Вось княжыч кажа да дружыны:
— Тут будзем горад будаваць,
Ўслонім назвай, бо карціны
Прыроды лона ўкруг ідаць.
І стаў расьці Ўслонім – горад,
Рубанцы — хаты гандляроў,
А церам князя ноччу ў зорах
Сваціў ля Шчары між лясоў.

Скрозь слава князя забуяла.
Сюды за далямі палёў
Па Нёмане плыло нямала
Тавараў гоцкіх з-за бароў.
З Царграда ехала багацце,
Плылі на вёслах караблі,
І нашым людзям было шчасьце,
Хто жыў на ўслонімскай зямлі.
Вывозілі яны па Шчары
Звярыны скуры, воск і мёд,
Кудзелі серабрыстай хвалі
Плылі па жоўтых грэбнях вод.
Дрыгавічы ля шчырай рэчкі
Далёка славу прыняслі,
Бо смелымі былі ў сечы
І ордаў шмат перамаглі.
За Бугам сінім на прасторы
Мазурскай беднае зямлі
Жылі князі ў галечы, у горы,
Галодныя ў іх палі.
Яны не раз на Ўслонім- горад
Ішлі дружынаю сваёй,
Бо данімаў іх люты голад,
Як саранчы той дзікі рой.
Але быў моцны горад Слонім,
Яго ім сілаю не ўзяць.
І ворагі на Шчары лоне
Рашылі хітрасьць паказаць.
Даслалі падарункаў многа,
Каб адарыць дружыну ўсю,
Купалу каб забылі бога,
Чужынцам прадалі душу.
Прывезлі бочкі хмелю, мёду,
Віно- салодкае пітво,
Услонімцы чужому Богу
Кляліся цемраю начной,
Купалле-свята не спраўлялі,
Стаяў святы гай ў цішыні,
І “баба” — статуя маўчала,
Крыніцы плакалі ўначы.
Плямёны мазурскія напалі,
Дружыну хмельну пасяклі,
У градзе хаты запалалі,
У сечы слонімцы ляглі.
З тых пор легенда засталася,
Як горад наш згарэў ў агні.
На новым месцы збудаваўся

Ля Шчары водаў у цішыні.
Радзіма наша пачалася
З паданняў, сэрцу дарагіх,
Радзіма з намі засталася,
І не забыць нам дзён былых,
Калі род даўні, дрыгавіцкі
Куточак родны абжываў,
Які цяпер нам самы блізкі,
Хоць прашчур тут усё пачынаў.
Ды ўваскрасае дух былога,
І слава даўняя жыве
У промнях сонца залатога,
Ў духмянай прашуміць траве,
І кажуць, раз у год на Купалле
З пажарышч слонімскіх былых
З мячом убачыць можна князя
Які шукае душ сваіх.
І той, хто верны Беларусі,
Сустрэне князя ля ракі
І палка скажа: “Я клянуся
Уваскрэснуць славаю зямлі,
Быць верным сонечнай Радзіме,
Служыць Багам святым сваім ”
І князь тады цябе абдыме,
Мы з ім удалеч паляцім.
Князь меч уздыме, каб у сэрцы
Біць моцна-моцна тым людзям,
Забыў хто родны кут і месцы,
З якіх пачаўся край і сам.
Радзіма пачынаецца з легенды
Пра горад каля ціхае ракі,
Якую захавалі нашы дзеды,
А нам далёка несці ў вякі.

**Генрык Цыпрыян Конкаль**
**Над Прэголай і Нёманам**
***(Фрагменты)***

Быў разгар 1933 года. Гарачыня клалася залатымі плямамі сонца на ўскрайку белага надрэчнага пяску і танцавала міражамі над відочнымі на супрацьлеглым беразе пусткамі. Яны сядзелі ўтраёх на плоскім беразе Нёмана, заглядзеўшыся ў лянівую плынь ракі, заслухаўшыся ў чарговы ўжо аповед свайго бацькі. Янка, якая нядаўна адсвяткавала свой дзевяты дзень нараджэння і яе меншая сястра Марыянна, народжаныя ў Лідзе, куды іх тату, якога называлі Татуськам, перанеслі з далёкай Варшавы на прафесійную службу ў II Авіяцыйным палку. Тут Татуська сустрэў сваю Оленьку і працяглае шчасце звянчала пара распешчаных „анёлкаў”. Шчасце кончылася з пачаткам надышоўшай ад усходу буры.

Сёння Татуська меў дзень свабодны ад службы, таму пайшлі як часта бывала напрасткі праз ваенны пасёлак у бок наводзячых жах руінаў крыжацкага замка, адкуль праз лугі да ракі, дзе знайшлі чысты кавалак пяску без водарасцей, абломкаў сітнягу і трысця, на якім расклалі шэры вайсковы плед.

Аб чым сёння будзеш расказваць, Татуська? зашчабятала Марыянна, яую ўсе называлі Мышкай.

Аб крыжаносцах, дачушка. Аб крыжаках і лёсе нашых продкаў.

А што такое плёдкаў? праляпятала Марыянна.

Не ходзіш у школу? укінула свой каменьчык Янка. Продак гэта наш дзедка Мацяеўскі і бабуля з Варшавы.

Не, гэта не зусім так, дачушка, усміхнуўся Татуська. Калі вернемся дамоў, зраблю вам даклад на гэтую тэму... Добра?

Пагадзіліся ахвотна, дык, каб не марнаваць часу і паслухаць чарговы татаў аповед. Гарачыня наводзіла лянівасць, дык рашылі на хвіліну ўскочыць у ваду.

Татуська! Мы толькі на хвілінку? азвалася Янка, сцягваючы з косаў вялікія блакітныя стужкі.

Толькі ножкі намачыць? дадала меншая.

Пачнеш, як вернемся? упрошвала Янка і пацалавала бацьку ў непаголеную шчаку.

Зважай на Мышку! кінуў бацька бягучым дочкам.

Пазней было сапраўды пазней, сонца ўскарабаскалася на „дванацаць”,

нават птушкі перасталі спяваць, а дрэвы схаваліся ў плямах уласнага ценю. Плыткая ў гэтым месцы рака напоўнілася крыкам, смехам і плюскатаннем, якога не пасаромеўся б нават сам бегемоцік з-над Лімпопа.

Сядайце. Можа, хочаце паесці? Мама падрыхтавала вам свежыя скібкі хлеба з маслам  і лісцем салаты?   бацька дастаў з кошыка загорнуты ў белае палатно хлеб.

Не трэба было заахвочваць. З далёкіх месцаў даляцеў гарачы вецер, запахацела зжатай пшаніцай, жытам, хлебам...

Сядайце ціхенька і слухайце....

Ага!  адказалі дзяўчаткі згодна і ўселіся на пледзе.

XXX

Над Распудай і Прэголай зноў начамі свяцілі водсветкі пажараў. У дзень па-над дрэвамі пушчы клубіліся дымы падсветленыя чырванню пажарышч. Выклікалі трывогу і асцерагалі аб крыжацкім паходзе. Хто не паспеў схаваца ў пушчу, гінуў. Пад неба ўзлятаў крык вырэзванага пад корань люду, які маліў літасці, якой не ведалі рыцары ў белых плашчах. Вялікі магістр ордэна Конрад вон Тырберг вёў у трох часцях жалезныя харугвы на зямлю Кімен і Меруніўкі. А трох бакоў на зямлю Яцьвягіі, якую звалі таксам Судовіяй. Ішлі яны хуткім маршам ўздоўж шырока разлітай у багны ракі, каб дайсці да сухога шляху. За імі, на дзень дарогі, цягнуўся галоўны абоз з махінамі для здабывання гарадоў і ваенным абсталяваннем. Коні гразлі ў млаках і багнішчах. Правальваліся аж па жываты. Атрады кнехтаў вялі толькі два дзесяткі закаваных у жалеза рыцараў ордэну ў белых плашчах. На плашчах віднеў чорны крыж. На галовах жалезныя, быццам гаршчкі, шлемы з вырэзанай шчылінай у форме крыжа, праз якія відаць неспакойныя, разбеганыя па баках вачыскі. Вецер развяваў каляровыя плюмажы. Пры поясах вісяць падцягнутыя, простыя, доўгія двухручныя мячы. На шыі мізэрыкордыі ўкладзеныя ў звяно рыцарскага ланцуга. На левым плячы плоскія, прастакутныя белыя шчыты. Усё аздабляе чорны крыж. Спераду бегла сотня кнехтаў апранутых у шэрыя, па калені, сукні. На сукнях сеткавыя кальчугі. Галовы накрытыя плоскімі шлемамі з заслонай для аховы караку і бокаў твару. Пры баку кароткі меч і кайстры з ежай. У лапах даўгое кап'ё.

Куна з Герцберга сядзеў вярхом на вялікім, цяжкім і чорным як смоль кані, што граз у млацы па  утавыя косткі; бывала, што правальваўся па жывот. Куна злаваўся, шарпаў каня, праклінаў багну, дарогу, уцякаючых жмудзінаў і прусаў, аж чутна было на вярсты і тады сам комтур мусіў яго цімхамірыць. Спяшаліся, каб раптам дабегчы град у Меруніўках. Ужо трэці дзень гналіся за правадырамі, Скурдам і Едутам, якія пасля бітвы, у якой прусы паклалі пару кнехтаў, адскочылі ў пушчу. Прапалі. У гразі адзначаўся відны здалёк след, заплыты вадой, ад іх пераходу. Ішлі гэтым следам, упэўненыя, што раней ці пазней дастануць прусаў. Пад „Шэскім пагоркам” правадыры люду красіма, кірсны і галіндаў  прайгралі наступную бітву, у якой загінула шмат добрых прускіх ваяроў. Правадыры выбралі благое месца для правядзення бітвы.  Плоскі, голы пагорак не дазваляў падысці крыжакоў, а ў правадыроў не было зашмат сілы, каб разарваць шчыльныя, наёжаныя кап'ём рады кнехтаў. Правадыры, калі не хапіла важака Скуманда, што пайшоў у Літву, шмат гадоў вялі безнадзейнае

змаганне з крыжацкім нашэсцем. Ваяроў усё меншала. Насельніцтва паселішчаў, якія знішчыла полымя, брацця ордэну бралі ў путы. Моцных і здаровых. Рэшту - пад меч. Не хацелі браць у палон. Часу не хапала. Краіна абезлюдзела. Пусташэла. На месцы люднай краіны станавілася пустэча. Пажарышча пакрывала пушча.

У крыжаносны паход, аб'яўлены папам Кліментам IV, прыбывалі новыя атрады з Брандэнбургіі, а нават з далёкай Турынгіі. Ад Каралеўца, Лідзбаргу, Балгі і Эльбланга ішлі ўзброеныя атрады, каб кінуць палякаў на калені. Люд ішоў у няволю ці пад меч. Засталіся толькі судовы і надары, што адпіралі крыжаносцаў. Важак бартаў, Дзіван, загінуў ад мяча. Монтэ, што вёў натангаў, аддаў жыццё ўзяты на кап'ё. Апошні правадыр пагезан, Гляпэ, страціў жыццё зняты кап'ём з каня. Вялікае прускае паўстанне патанула ў крыві. Прыйшла чарга на Яцьвягію

Гарадок у Меруніішках быў распалажаны паміж двума азёрамі над рэчкай, якой назвы наезнікі не маглі вымавіць. Гарадок быў драўляны, абаронены толькі зямным валам, над якім вышчэрваў зубы падвойны частакол. Над брамай расселася вежа. Моцная. Сасновыя калоды пахлі яшчэ жывіцай. Вузкі мост праз багністую раку разабралі. Скурда быў упэўнены, што ніхто не пяройдзе праз млакі і раскіданыя вакол гарадка дрыгвянікі. Над палісаднікам відаць было галовы абаронцаў, вастрыё кап'я і бусакоў. У гарадку трывала напятая ціш перад бітвай. Чакалі. Жанчыны і дзеці даўно пайшлі ў пушчу, засталіся адно ваяры, падросткі і грамада недалужных старэчаў. Ведалі Едут і Скурда, яцвяжскія правадыры, што раней ці пазней трэба будзе пакласці галовы. Войны пазначаныя паразамі працягваліся ледзь не год. Надзеі і падмогі ніадкуль.

Сонца апусцілася за пушчу. Наступіла ноч, напоўненая шэлестам з-над ракі. З гарадка было відаць ідучыя праз раку паходні, што клалі на ваду хісткія чырвоныя поблескі. Уздоўж ракі, праз якую ў цемры перакідалі новы мост, чутны быў стукат тапароў.

Ранішнія туманы завалаклі раку шэрасцю, закрылі мост і падышлі пад насцярожаны гарадок, прыглушвалі крокі падходзячых пад палісаднік кнехтаў. Неба на ўсходзе пачало ружавець. Ад лугоў нёсся пах варанай у крыжацкім абозе стравы. Раптам пануючую цішыню разбудзіў крык. У бок гарадка бегла гарамада кнехтаў, перад якімі гналіся дзесяткі палонных прусаў. У лапах бусакі, дзіды і лесвіцы. Паўз палісаду паляцеў крык.

Гарадок паддаўся пасля непрацяглага, роспачнага супраціву. Ніхто з абаронцаў не прасіў літасці. Пераможаная Яцьвягія ляжала пад нагамі рыцараў ордэну. Завяршылася агнём і мячом праведзеная хрыстыянізацыя прусаў. З выгнання вярнуўся Скуманд. У краіне запанаваў спакой. Крыжакі ўзрасталі ў моц. Пыхлівыя і непераможныя жалезныя атрады пайшлі на Літву. На Інфлянты...

**Тамаш Ліпаман**
**Аповед пра белавежскія курганы**

У Белавежскай Пушчы ёсць помнікі матэрыяльнай культуры, гісторыя якіх пачынаецца на некалькі стагоддзяў раней за тыя часы, што апісваюць гісторыкі. Адносіцца да такіх месцаў, між іншым, урочышча званае Замчышчам, а таксама больш за паўтысячы курганаў.

Раней гісторыю гэтых лясных пагоркаў звязвалі з таямнічым народам Яцьвягаў, і нават Готаў. Замчышча ў сваю чаргу, размешчанае ў 2,5 км на поўнач ад „Шляху каралеўскіх Дубоў", называлі замкам Баторыя, і распавядалі, у сваіх руінах замак хавае вялікія скарбы.

Гэта месца наведвала між іншымі Эліза Ажэшка, шукаючы натхнення для рамана „Ad Astra". Хутчэй за усё натхненная гэтым месцам, ўнесла яна на старонкі раману наступнае апісанне Замчышча.

„Гэта быў замак Кунігасаў, літоўскіх князёў – высакародных, магутных і мужных, якія разносілі звон зброі перамогі ад міндалевых гаёў з-над Дняпра да усеяных бурштынам узбярэжжаў Балтыйскае мора. І гучала зброя, і палявалі яны на буйнога звера ў пушчы. Ды й цяпер, як заспяваюць у budniczych вёсках пеўні, паўстаюць з ўзараных барсукамі і дзікамі друзаў замчышча і імчацца ў лес здані паляўнічых атрадаў.

Голасна тут тады становіцца – усюды бляск, рух, галасы. За Кунігасам, які свеціцца ў цемры беллю гарнастая, едуць на пекна убраных канях баяры – рыцары ў рысіных чапках, з дзідамі, што блішчаць ў святле паходняў"

Генрых Сянкевіч, наведаўшы тое ж самае урочышча даў менш волі сваім творчым фантазіям, і прдставіў нам такое апавяданне аб сваім вандраванні:

„Сёння гэта гурбы велізарных валуноў, паміж якімі растуць стогадовыя дрэвы. Часам ляска уторкнутая тут паміж двума камянюкамі раптоўна праваліцца, нібы у нейкае сутарэнне; часам глеба прасядзе пад нагамі, альбо зверне на сябе увагу чатырохсценны дол, акантаваны камянямі – бачныя сляды будоўлі – але нічога болей".

Адна са шматлікіх легенд пра гэта месца расказвае пра гісторыю з пачатку XIX стагоддзя.

Максіміліян Мядзведзь, заблукаўшы ў лесе, вымушаны быў правесці ў ім ноч. Калі пад яго нагамі правалілася зямля, зваліўся ён у брукаваную яму запоўненую вялікімі скрынямі з залатымі і срэбранымі манетамі ды застаўленую

парослымі мохам бутэлькамі. Як апавядаюць людзі ў тых мясцінах, выпіўшы змесціва адной з прыгаданых бутэлек, запаў Максіміліян у такі глыбокі сон, што любыя звесткі аб знойдзеным скарбе пажадаў перадаць толькі сваёй будучай жонцы.

Аб далейшых лёсах скарбу хронікі маўчаць, а гэта можа азначаць, ці то тое, што Макс добра ажаніўся, ці тое, што Замчышча насамрэч – гэта ніякія не руіны нейкага там замку.

Легенда гэтая, аднак, пабудзіла многіх шукальнікаў скарбаў, якія параскопвалі гэты фрагмент грады натуральнага паходжання ўздоўж і упоперак, нішчачы большасць падземных артэфактаў.

У год 2003 Лабараторыя Вывучэння Сысуноў разам з Інстытутам Археалогіі і Этналогіі Польскай Акадэміі Навук правяло ў раёне Замчышча чарговыя раскопкі.

Знойдзеныя ў зямлі срэбраныя, алавяныя і бронзавыя скроневыя кольцы, гліняныя чарапкі, а таксама вызначэнне узросту знаходак вугляродным метадам з дапамогай ізатопаў дазволіла зрабіць здагадку, што гэта зусім не руіны замка польскага элекцыйнага караля, які задаў туркам у бітве пад Венай.

Белавежская-варшаўскія навукоўцы выявілі, што так званае Замчышча з'яўляецца нічым іншым, як даўнімі могілкамі Дрыгавічоў.

Пасля атрыманні гэтай, новай інфармацыі, я даведаўся у Інтэрнэце на старонках Вікіпедыі, што:

Дрыгавічы – гэта усходнеславянскае племя. Назва іх паходзіць ад слова дрыгва – багна. Жылі яны па берагах Прыпяці і Сожа (прытокі верхняга Дняпра) у Беларусі. Галоўны горад – Тураў над Прыпяццю. Ад Турава паходзіць назва Тураўскага княства, у якім кіравалі князі, залежныя ад Кіева. Апошні раз пра княства летапісы згадваюць у 1149 годзе.

Падчас далейшых пошукаў у сетцы я даведаўся, што паселішчы Дрыгавічоў размяшчаліся па берагах рэк і на палянах пасярод лясоў. Займаліся яны паляваннем і збіральніцтвам. З лясных борцяў збіралі мёд, выпальвалі драўняны вугаль і дзёгаць. З балотнай руды атрымлівалі жалеза для прыладаў працы і зброі.

Знаёмства з чарговымі тэкстамі аўтарства актыўных у Сетцы месцічаў і вясковых жыхароў, абудзіла ў маёй памяці гісторыю, якую пераслаў я на старонку Зялёных Брыгадаў. А была гэта рамантычная легенда, пачутая мною шмат гадоў таму ад аднаго белавежскага браканьера Гембаля.

Васіль нарадзіўся ў першы дзень XI стагоддзя, у Берасці, у сям'і князёў Тураўскіх. Дзіцячыя гады і юнацтва яго прайшлі ў засваенні майстэрства палявання на буйнога звера і ва удасканальванні ваеннага мастацтва. Вырас ён прыгожым, рослым маладым чалавекам і храбрым рыцарам. Даваў сабе рады аднолькава добра і ў полі і ў бары, у нетры якога, як распавядаюць, любіў адпраўляцца адзін, узброены кароткай дзідай з крохкай каванай бронзы, якой аднолькава добра паляваў як дзікоў, так белавежскіх мядзведзяў.

Прыгадаць тут варта, што ў часы Васіля мядзведзяў у белавежскіх лясах было шмат, чым пушча гэтая адрозніваецца ад вядомай нам сёння.

Аднак, сапраўдным захапленнем Васіля былі не мядзведзі, а дзеўчыны, якія ліплі да маладога князя нібы пчолы да мёду. Ды і што ў гэтым дзіўнага, калі вырас Васіль мужчынам прыгожым, дужым, мужным, ды да таго ж і заможным?

Насалоджваўся князь зямнымі радасцямі, выбіраючы найпрыгажэйшых паводле свайго густу, ды часу аддаваў тым асалодам не менш, чым паляванню на

дзікага звера.

І бегла б, пэўне, жыццё яго лёгка і бесклапотна, калі б аднойчы не прыбыла да двара Васіля русінка Рэгнеда.

Старэйшай на некалькі гадоў паненцы вельмі спадабаўся прыгожы маладой чалавек, і не прайшло шмат часу, як стала яна першай наложніцай будучага уладара Берасцейскай зямлі.

Досыць прадбачлівая жонка не абмяжоўвала князя ў яго шматлікіх раманах. Аднак, паступала так толькі да пэўнага часу.

Адным травеньскім днём Васіль адправіўся ў бясконцы гушчар Белавежскай пушчы паляваць на дзікоў. Сустрэў ён у той дзень на беразе ракі Нарэўкі дзеўчыну небывалай прыгажосці.

Была гэта Праслава, дачка мясцовай вядзьмаркі Ксантыпы. Праслава, якая з'яўлялася ва ўсёй сваёй красе пры поўні, так якая зацьміла княжычу свет, што сталі яму нямілымі ні ласкі Рэгнеды, ні прывабнасць яго іншых каханак.

Закаханыя вочы маладога князя далі нагоду для інтрыг, якія ў канчатковым выніку прычыніліся ды падзення княства Дрыгавічоў. Бо нішто так не паварочвае кола гісторыі, як пачуцце здрады ў сэрцы прыгожай, сталейшай, а да таго ж уплывовай жанчыны.

Далей гісторыя пайшла ўжо звычным, вядомым шляхам. Рэгнеда перад ўсімі абвінавацiла Васіля ў блюзнерстве, якое складалася ў абняслаўленні статуі Сварога – бажаства кіруючага Сонцам.

Не маючы надзейных, дарагіх Нью-Йоркскіх адвакатаў, такое абвінавачанне азначала для Васіля толькі адзіны вырак – смерць на вогнішчы.

Яшчэ распавядаюць, што падчас пакарання князя Праслава кінулася на вогнішча, каб памерці разам з Васілём. Але насуперак такому ўчынку ў імя кахання, пакараныя не былі пахаваныя разам.

Васіля пахавалі ва урочышча, званым Замчышчам, а яго адзінае сапраўднае каханне – у кургане, размешчаным ў некалькіх сотнях метраў на захад.

Каб прайсці пехатой ад аднаго з тых месцаў да другога спатрэбіцца некалькі гадзінаў. Маці дзяўчыны – Ксантыпа, з дапамогай вельмі моцных чараў зрабіла так, каб закаханыя маглі сустракацца раз на месяц пры святле поўні.

Калі Вы насамрэч добра пазнаёміцеся з жыхарамі Пушчы, яны распавядуць вам аб прамяністых зданях вандруючых у глухмені польскай часткі белавежскіх лясоў.

Раскажуць вам аб рыцары, які імчыць у бок палярнай зоркі, насустрач каханню свайго жыцця. Не забудуць распавесці і пра закаханую, якая спяшаецца ў бляску Месяца на сустрэчу з каханым чалавекам.

**Тадэвуш Хармушка**
**Ганчак**

Калі будзеце плыць на байдарцы па Чорнай Ганчы або пойдзеце ўздоўж берага гэтай пекнай ракі, асабліва звяртайце ўвагу на лясы, прыбярэжныя зараслі, вываратні і на ўсялякія іншыя таямнічыя закуткі, бо ў іх вас можа падпільноўваць не хто іншы, як рачны д'ябал, які завецца Ганчак.

акуткі, бо ў іх вас можа падпільноўваць не хто іншы, як рачны д'ябал, які завецца Ганчак.

Гэта невялікая, але незвычайна гарэзная істота з густой і жорсткай поўсцю, трохі падобнай ці то на бабровую футру, ці то на зубровы волас. Яго капыты падобныя на капыты лася, а хвост вельмі моцна нагадвае хвост каровы, а ў цвёрдых рагах ягоных закладзены характар горнай казы. Канец яго хваста заўсёды растрыбушаны. Хутчэй за ўсё з-за таго, што любіў ён апускаць яго ў ваду ракі, каб лавіць ракаў, а ракі клюшнямі сваімі яго атрыбут пашасталі так, што стаў ён нагадваць гетманскую булаву, толькі змешчаную зусім не ў тым месцы.

Адразу пасля таго, як Чорная Ганча сфармавала сваё рэчышча, гэты кадр, што быў з пекла родам, з прычыны сваёй незвычайнай схільнасці пялёскацца ў крыштальна чыстай вадзе, што любіў ён рабіць яшчэ з дагістарычных часоў – быў выкінуты з пекла самім Баалзебубам за тое, бо увесь час агонь пякельны вадой заліваў.

Выляцеў ён з грукатам з пякельнай брамы і так жорстка прызямліўся, што задам сваім дзіру глыбокую ў дне неглыбокага вадаёма выбіў, ды так што пырскі вады па ваколічных лясах разляцеліся, і паўсталі ад гэтага маляўнічыя азёрцы, званыя сухарамі. На месцы падзення д'ябла зараз знаходзіцца самае глыбокае возера Польшчы, і завецца яно Ганча, і да сённяшняга дня невядома, што насамрэч з дном гэтага возера адбываецца – так незвычайна загнаў яго д'ябал углыб зямлі.

Д'ябал ад таго, што з ім здарылася, некалькі тыдняў выў жудасным выем, а мясцовыя думалі, што гэта галоднае ваўкаўё па лясах так жудасна вые, і баючыся за быдла сваё перабілі ў гневе ўсіх прадстаўнікоў воўчага племені, а страшэнны роў усе не сунімаўся. Толькі тады зразумелі сяляне, што гэта нячыстая сіла так ім па вушах свідруе і схаваліся па хатах, некалькі дзён не падаючы прыкметаў жыцця нават дымам з комінаў.

Праз пэўны час д'ябал залізаў у адчаі свае раны і прыйшоў да разумнай

высновы, што сумаваць няма нагоды, бо мясцовасць навокал маляўнічая, пагоркі прыгожыя, зямля зарослая хмызамі і усеяная камянямі, па якой можна ўдосталь бесклапотна гарэзіць. І ад пекла мясцовасць дужа не розніцца, толькі вады мае больш, што яму, аднак, якраз і пасавала.

З тых часоў улюбёным шляхам яго вандровак стаў шлях Чорнай Ганчы, у водах якой ён ахалоджваў свае гарачыя жаданні ды мыў сваю выгаралую поўсць.

Сярод мясцовых жыхароў ён не выклікаў асаблівага захаплення з нагоды сваёй прысутнасці, бо смятану пастаўленую ў ваду мог злізаць адразу са збана, ды і малаком не грэбаваў, часам мог ускочыць у курнік і вынесці адтуль усё яйкі, а мог на поплаве кароў з ланцугоў для пустой забавы паспускаць.

У той жа час празмернай нядобразычлівасці да яго таксама не назіралася, бо ўсялякая басата і нягоднікі здалёк абыходзілі гэтыя землі.

Такі вось гэта быў дзіўны сімбіёз мясцовых з д'яблам.

Мусіць, так б і жылі людзі і д'ябал да гэтага часу, калі б не выпадак, які раз і назаўжды парушыў гэтую ідылію. А было гэта так. Калі па звычцы сваёй мясцовы чорцік бесклапотна гойсаў у рачных лозах, заўважыў, што ў рацэ купаецца дзяўчына. Перажыў ён сапраўдны шок, бо паненка тая купалася галышом, а была гэта дачка мясцовага млынара.

Д'ябал тыдзень сядзеў у хмызах ашаломлены, быццам бы хтосьці моцна выцяў яго абухом. Нарэшце адважыўся і вырашыў накіравацца да хаты той прыгажуні, якую заўважыў у рачным патоку. Пракраўся ў двор, зазірнуў асцярожна ў акно і да радасці сваёй пабачыў яе ў поўнай красе, калі тая рабіла локшыну для булёну на нядзельны абед. Мука для локшыны – ясная справа – была з бацькавага млыну, а дзяўчына раскачвала цеста з такім імпэтам, што нават яе грудзі падскоквалі як два прыгожых мячыкі. Д'ябал не мог адарваць захопленага погляду. Зарумяненая дзяўчына тым часам скручвала раскачанае цеста і ўмела рэзала яго на вузкія паскі. Д'ябал няўрымслівa перамінаўся з капыта на капыта – не мог дачакацца, калі дзяўчына ізноў пачне качаць цеста, а яе грудзі ізноў пачнуць дрыгацець, нібы балерыны ў танцы. Круціўся і мяўкаў напаўголасу ад нецярплівасці:

*„Ach, jeszcze jeden suw wałkiem,*
*A będę szczęśliwy całkiem ”*

Або таксама для разнастайнасці прыпяваў:

*„Dam za jeden suw wałkiem*
*Język posmarować białkiem*
*I przykleić do podniebienia,*
*Żebym na wieki oniemiał ”*

Пачуў гэта млынар, падкраўся да д'ябла і схапіў шалапута за рогі. Зацягнуў калматага падгледача да млына і ў пакаранне прывязаў да млынавага кола. Цяпер д'ябал атрымаў сапраўды д'ябальскі млын. Ён увесь час ныраў у ваду і вынырваў, ныраў і вынырваў, і відаць ад гэтага зусім крануўся розумам, бо ўвесь час паўтараў: *„jeszcze jeden suw wałkiem, ...suw wałkiem ”*. У выніку чуўся па ўсім наваколлі толькі незразумелы лопат: *„suw walk..., suw walk... ”*.

У той час вандравалі па гэтым суровым краі манахі ў пошуках месца на кляштар і на новае паселішча. Манахі з ордэну камедулаў пачулі дзіўны голас, які паўтарала рэха, што адбівалася ад лясоў і пагоркаў: „suw wałki..., suw wałki...”. Яны паняцця не мелі, адкуль далятае да іх гэты голас, і зачараваныя яго гучаннем і ўпэўненыя, што голас плыве з неба, заснавалі над Чорнай Ганчай паселішча, якое назвалі Сувалкамі, а для сябе на мысе возера Вігры пабудавалі кляштар, які заварожвае сваёй прыгажосцю і сёння.

Д'ябал жа, прывязаны да млынавага кола, пасля адной жудасна цёмнай, бязмесячнай ночы бясследна знік. Ці то можа вяроўкі, якімі быў прывязаны, саслаблі, а можа і пагнілі, ці то хтосьці яго наўмысна аслабаніў? Ніколі гэтую таямніцу ніхто нікому не раскрыў, нават камедулам на споведзі.

Цікава, што той жа ноччу знікла таксама прыгажуня-дачка млынара. Людзі ўсялякія рэчы на тую тэму па сакрэту распавядалі, але хто там да канца ў такія казкі верыць будзе… Няўжо ж такое магчымае, каб дзяўчына закахалася ў д'ябла і збегла з ім на край зямлі?

Ці праўда гэта, ці не, пэўне адзін д'ябал толькі і ведае, але дзе ён сёння? Ніхто ж не скажа.

Праўда, аднак, тое, што ў Сувалках на беразе Чорнай Ганчы, як і шмат гадоў таму, утульна і ціха, а рака па-ранейшаму імклівa бяжыць суровай плынню, у ёй па-ранейшаму жывуць ракі, якія сваімі клюшнямі могуць няблага пашастаць не адзін д'ябальскі хвост.

Ужо няма той бабкі, што распавядала гэтую гісторыю па вечарах. Можа яна была ўнучкай дочкі млынара, а можа ўсё сама навыдумляла?

Можа быць, уся гэтая гісторыя не вартая сёння згадкі, але калі вы ў роздуме зазірнеце ў халаднаватую плынь Чорнай Ганчы, а з грудзяў вашых вырвуцца ціхія ўздыхі, падумайце, а ці не сядзеў Ганчак на гэтых камянях, што ляжаць цяпер, пакрытыя мохам, на дне халоднага патоку.

**Барбара Пашкоўская**
**Пра тое, як хлеб усталяваў справядлівасць**

Пан у Скарушэве быў багаты, толькі надта сквапны, а пані наадварот, вялікай дабрыні жанчына. Яна заўсёды ратавала ад галоднай смерці людзей пры двары, што прыходзілі з просьбамі. Пачуў аб дабрыні пані народ і пайшоў з далёкіх краёў. Злаваўся дзедзіч, хоць і шмат багацця ў яго было, увесь час ён хацеў большага, збіраў усё для свайго адзінага сына. Сын пайшоў у маці — быў добры і спагадлівы. Часцей за ўсё кожны тыдзень прыходзілі селянін са сваёй старой, у іх было шмат дзяцей. Пані заўсёды давала ім на хлеб. Аднойчы раззлаваўся дзедзіч і кажа:

— Няма месца на зямлі таму, хто не ў змозе зарабіць сабе на хлеб

І загадаў пані ўкласці ў бохан атруты для пацукоў.

— Няхай яны здохнуць і не ўбачу іх больш у нас, — дадаў.

Пані не хацела гэтага рабіць, але час быў такі, што жонка павінна была мужа слухаць. Так і зрабілі, даўшы атручаны бохан хлеба. Тым часам сын дзедзічаў паляваў у лесе. Пагнаўшыся за аленем, адстаў ад сваіх сяброў і заблукаў. Блукаў паўночы, пакуль не пачуў галасы, — гэта селянін з жонкай вярталіся са двара. Прыгарнулі яны хлопца да сябе ў хату, баба і гаворыць:

— Паніч, пэўна, галодны, толькі ў нас, на жаль, няма нічога, апроч хлеба, які матуля паніча дала. Еш, паніч, на здароўе.

Хлопец быў галодны і хутка з’еў увесь хлеб, не пакінуўшы нават акрайчыка. А зранку сканаў у цяжкіх муках.

Калі пан аб усім даведаўся — ашалеў, бегаў па лясах і ўсім, каго б не спаткаў, казаў, каб прыйшлі да яго па хлеб. Можа, хацеў адкупіць віну? Людзі па начах чулі, як крычаў ён у лесе:

— Ласкі, ласкі

А пані? Сохла, пакуль не памерла. Двор змарнеў, усё абярнулася ў руіну і ад тых часоў месца, што засталося, стала звацца Скарушава-Труткі. А вёску назвалі Лаўск. Кажуць, што ў кожную гадавіну смерці сына пан скача праз лес на белым кані і крычыць:

— Ласкі

І так да сённяшніх дзён.Такім чынам, хлеб сам усталяваў справядлівасць. Ад тых часоў ніхто не можа адмовіць у хлебе таму, хто галодны і мае патрэбу.

*Аповесць паходзіць з вёскі Лаўск Граеўскага павету. Распавяла яе мая покойная Бабуля Юліяна з Лэпкоўскіх Саўчэнка. У тэксце я захавала арыгінальную лексіку бабулі, родам з вёскі Лаўск.*

**Тамаш Ліпаман**
**Імгла**
*Легенда з Кнышынскай пушчы*

Калісьці даўно на зямлі быў шчаслівы край. Усяго ў ім хапала і людзям, і жывёлам, грыбам, раслінам, і нават бактэрыям. Расліны радаваліся дастатку сонечнага святла, вады і таму ўсяму, што чэрпалі з глебы і паветра. Бо не было іх ні замала, ні зашмат. Траваедныя звяры не мелі недахопу ў раслінах, а драпежнікі – недахопу ў жывёлах, якія харчаваліся раслінамі. Людзі чэрпалі поўнымі далонямі багацце акаляючага іх свету, а грыбы і бактэрыі вярталі глебе ўсё тое, што ў ёй павінна знаходзіцца, пакідаючы сабе столькі, колькі ім для шчасця было патрэбна.

Гісторыя, якую я збіраюся вам распавесці, адбылася ў тыя часы, калі на Зямлі ўся ўлада належала лесу. Не было яшчэ ні гарадоў, ні нават сапраўдных вёсак. Не было шырокіх дарог, а людзі жылі ў сціплых хатах, якія тулячыся адна да адной утваралі невялікія паселішчы.

Гэта быў край, дзе не існавала паняцця прагрэсу, бо ўсё, што там адбывалася не пакідала пасля сябе ніякіх істотных зменаў. Ссечанае, а часцей паваленае ветрам дрэва замянялася наступным, а ўпаляваная чалавекам або іншым драпежнікам жывёла вызваляла абшар для чарговага звера, часта для блізкага родзіча таго, што пайшоў з гэтага ляснога жыцця. Тое ж адбывалася і з людзьмі, якія жылі ў такіх малых супольнасцях, што кожны ведаў вельмі шмат аб іншых.

Лясны свет рухаўся па прыкладна такіх жа кругавых арбітах, як зоркі або планеты.

Аднойчы, а было гэта позняй восенню, можа напрыканцы кастрычніка, а можа ўжо ў лістападзе, цяжка сказаць, бо каляндар не быў тут нікому для шчасця патрэбны, у Лясны край прыйшла імгла.

Гэта не была звычайная смуга, якая з'яўляецца перад самым світанкам або адразу пасля прыцемак, каб распусціцца ў прамянях узыходзячага сонца.

Была гэта, дарагія мае, Вялікая імгла, дакучлівая і жорсткая, імгла такая густая, што прамяні сонечнага святла адбіваліся ад яе і вярталіся назад у неба.

Аб такой імгле мы гаворым сёння, што яна густая як малако. З чым яе параўноўвалі ў той час, цяжка казаць. З малаком у тыя часы справу мелі толькі немаўляты, якія няшмат маглі распавесці, а дарослыя жыхары ляснога свету насычаліся пладамі або вадой, якую чэрпалі адразу з крыніцаў.

Імгла запоўніла лясны свет цалкам, яна была так непранікальная, што

чалавек не бачыў нават уласнай далоні выцягнутай рукі. Імгла абвівала і ахінала кожную галіну, кветку, дрэва і сцежку. Паветра стала імглой, а імгла паветрам.

Хто ведае, можа гэта хмары сышлі на Зямлю, каб зблізку разгледзець, як выглядае жыццё?

Насякомыя перасталі лётаць ад кветкі да кветкі і гінулі з голаду. Гінулі птушкі і яшчаркі, якія карміліся насякомымі. Гінулі кажаны, гінулі жабы і рапухі, якія, як вядома, харчуюцца галоўным чынам насякомымі.

Спачатку большасць сысуноў адчувала сябе няблага збіраючы ежу на зямлі, адшукваючы яе нюхам. Людзі, аднак, у хуткім часе спажылі сціплыя прыпасы, сабраныя ў хатах. Раней яны не мусілі рабіць прыпасы, бо лес круглы год даваў ім усё, што было трэба для жыцця ў дастатку.

Услед за голадам прыйшло неразуменне новай сітуацыі, а за неразуменнем прыйшоў роздум, да якога людзі не былі гатовыя.

Плач галодных дзяцей раздзіраў сэрцы і душы, аб існаванні якіх раней ніхто не задумваўся. Душы, у якіх ад іх нараджэння прарастала пачуцце віны.

У хуткім часе людзі пачалі забіваць дзяцей, каб не чуць іх плачу. Пачалі з'ядаць іх целы, каб выжыць. Пачуцце віны паглыблялася. Душы разрасталіся. Услед за пачуццем віны, што мацнела з кожным днём, з'явілася патрэба перанесці адказнасць на кагосьці іншага. Знешні свет быў імглой, імглой, да якой пачалі звяртацца, якую ўвасобілі і якой пачалі маліцца аб дастатку. Сцяжыны, па якіх перасталі хадзіць, зарасталі. Закаханыя не бачыліся са сваімі абранымі, жанчыны не сустракаліся пры крыніцах.

Міналі тыдні і месяцы. Імгла ў некаторых месцах пачала рассейвацца. У тых месцах жыццё вярталася да таго ладу, што быў падобны на парадак мінулага. Па Лясным краі, у пошуках лепшага жыцця, вандравалі людскія грамады, схуднелыя і ахопленыя жахам. Некаторыя знаходзілі тыя месцы, якія пакінула імгла. Там пачалі ўспыхваць войны за лепшае жыццё.

З часам людзі пачалі забываць на жыццё ранейшае, а адказнасць за незразумелыя змены перанеслі з імглы на лес. Лес стаў чалавеку ворагам. Таму яго сталі высякаць. Расчышчалі палі, на якіх апрацоўваліся расліны і гадаваліся жывёлы. За палі ішлі яшчэ больш крывавыя войны, чым за кавалак лесу, пакінутага імглой. Павялічваліся арсеналы зброі і прыладаў для земляробства. Будаваліся новыя храмы, войны за якія былі яшчэ больш крывыя за ранейшыя. Прагрэс укараняўся з пакалення ў пакаленне, хоць імгла ўжо даўно сышла і сёння, калі дзесьці з'яўляецца, то ўжо не мае такога драматычнага выгляду.

Калі-небудзь Вялікая імгла ізноў з'явіцца і зменіць свет настолькі, што зноў доўгія гады непадзельна будзе кіраваць лес, а прагрэс схаваецца дзесьці пад каранямі дрэваў.

**Вераніка Багалейша**
**Легенда пра Поразава**

Я часта наведваю сваю бабулю і дзядулю. Яны жывуць у Свіслацкім раёне, што на Гродзеншчыне, у вёсцы Каланая. Аднойчы я папрасіла свайго дзядулю расказаць мне цікавую гісторыю пра наш край. Ён пачаў расказваць пра Поразава. Я была вельмі задаволена расказам, бо часта прыязджала туды. Поразава знаходзіцца не вельмі далёка ад вёскі Каланая. А вось гэтая легенда.

Жыў тут у невялікім паселішчы небагаты, але хітры селянін. Звалі яго Фёдарам, а мянушку меў дзіўную Пораз, за тое, што часта любіў паўтараць «раз-пораз». Фёдар вылучаўся сярод астатніх вяскоўцаў тым, што любіў дражніць, асабліва тых, хто яму чымсьці не падабаўся. Так і жыў Фёдар. Сям'ю меў: жонку ды траіх дзетак. Жыў, як і ўсе, нават паспяваў і песню спець, і жартоўную гісторыю расказаць. Таму і працаваць побач з такім чалавекам адно задавальненне. Зямлі ў Фёдара было мала, жылі бедна. Зусім нечакана крыху ўзбагаціўся Пораз, і вось якая падзея гэтаму папярэднічала.

Мясцовы бацюшка разам з дзякам задумалі купіць у мястэчку вялікую хату. Сабралі грошы і паехалі, парку коней запрогшы. Едуць яны і вось бачаць на перакрыжаванні дарог Фёдар стаіць. Дзяк не вытрымаў і папрасіў у Пораза якую-небудзь смешную гісторыю расказаць. Спачатку яны спыталі ў Фёдара: «Чаму сабакі ўдзень меней брэшуць, чым уначы?». Фёдар ім адказаў: «Сабакі ўдзень меней брэшуць, бо ім жа бацюшка з дзякам дапамагаюць...». Дзяк спачатку добра не пачуў адказ і пачаў качацца са смеху, але потым прыкусіў язык. Пасля бацюшка і дзяк папрасілі яго цікавую штуку паказаць. Фёдар адказаў, што для гэтага патрэбны іхнія коні. Яны згадзіліся. Пораз залез у фурманку і паехаў дахаты. Дома ён сказаў сваёй жонцы, каб яна прыкінулася мёртвай. Яна згадзілася, бо Пораз сказаў, што, калі яна гэта зробіць, то ў іх будзе шмат грошай. Потым Фёдар адвёў коней да далёкіх суседзяў і папрасіў схаваць іх.

Бацюшка з дзякам сядзелі на раздарожжы, чакаючы Фёдара са сваімі коньмі. А потым зразумелі, што трэба бегчы да селяніна каней ратаваць. Прыбеглі яны да Фёдара, пытаюць, дзе коні. Фёдар да жонкі павярнуўся і спытаў у яе, а яна адказала, што за коньмі пільна глядзела, але ехалі па вуліцы нейкія цыганы, дык схапілі ў яе з рук лейцы і ўцяклі разам з коньмі. Тут Пораз выскачыў з-за стала з крыкам і пачаў жонку біць. Яна ўпала на падлогу і прыкінулася мёртвай. Дзяк і бацюшка, забыўшыся пра коней, спыталі, што будзе. Фёдар адказаў, што ў яго ёсць

чароўная папліска. Ён перацягнуў пару разоў сваю жонку, і тая ажыла. Жадныя бацюшка разам з дзякам захацелі сабе гэтую папліску, але Фёдар папрасіў за яе тысячу рублёў. Грошы вялікія, але што зробіш. І яны згадзіліся. Спяшаліся яны цяпер грошы зарабляць ажыўляць памерлых.

Вось надарылася смерць у наваколлі, ды не абы ў каго, а ў сям'і самага багатага памешчыка. Дзяк і бацюшка прыйшлі да памешчыка і сказалі, што змогуць ажывіць яго матулю. Пан узрадаваўся і адразу згадзіўся. Вось завялі іх у пакой і пакінулі адных. Дзяк ціхенька зашчапіў дзверы, а бацюшка дастаў папліску і пачаў біць, што нябожчыца ажно гэкнула так ім падалося. Падбадзёрыла гэта бацюшку і ён яшчэ мацней перацягнуў нябожчыцу.

Пану вельмі хацелася даведацца, што яны робяць, як яны мёртвага чалавека ажыўляюць. Тады ён загадаў слугам збегаць ды праз акно глянуць. Глядзяць яны і дзіву даюцца, ніяк не могуць зразумець, што робіцца. Спуджаныя, яны расказалі пану, што яго матулю папліскай дратуюць. Загадаў пан узламаць дзверы і расправіцца з лекарамі. Узламалі дзверы і давай біць бацюшку з дзякам. Тыя кінуліся ўцякаць, а сам пан са слугамі за імі. Пасля знайшлі бацюшку ледзь жывога ў карчах і паспрабавалі ўскінуць на воз. Той стаў прасіцца і сказаў, што гэта не яго задума, а Поразава.

Слухі пра цудадзейную папліску папаўзлі па ўсёй аколіцы. Пацягнуліся людзі з усяго наваколля і заставаліся там жыць. Так паступова стала засяляцца гэтае паселішча і ператварылася яно ў вялікую вёску, а пасля назвалі яе ў гонар незвычайнага лекара.

Вось адкуль пайшла назва цяперашняга Поразава.

**Юліта Сакоўская**
**Гісторыя Гаўрыіла**

Дакладна 323 гады таму ў сакавіку, у вёсцы Зверкі непадалёк Заблудава на свет прыйшоў хлопчык. Назвалі яго Гаўрыілам, што па-яўрэйску значыць столькі, што „Божы муж”. Родам ён быў з набожнай сям'і. Ягоныя бацькі Пятро і Анастасія Гоўдэль, незалежна ад таго, што жылі ў цяжкі для праваслаўя перыяд, калі унія станавілася дамінуючым веравызнаннем на гэтай тэрыторыі, захавалі сваю веру. Быўшы малым дзіцём хлопчык вылучаўся сярод іншых незвычайнымі, не на ягоны ўзрост, рысамі. Цікавілі яго малітва і вера больш, чым вясёлыя гульні з аднагодкамі на вуліцы. Гаўрыіл большасць свайго свабоднага часу праводзіў на размовах з нябачным Богам і Ісусам ды распытванні бацькоў на тэмы са сферы святасці, калі ягоныя аднагодкі бегалі адны за адным гуляючы ў „бэрка”. Маці і бацька ганарыліся сваім сынам і ахвотна растлумачвалі яму незразумелыя духоўныя факты ды расказвалі пра свет анёлаў.

З кожным днём хлопец рос, станавіўся ўсё старэйшым і разумнейшым дзіцём, якое не прыносіла бацькам ніякіх турбот, а нават наадварот напаўняла радасцю і аптымізмам пахмурныя дні. Калі Гаўрыіл стаў старэйшым хлопцам, Анастасія выпраўляла яго з абедам да бацькі Пятра, які працаваў непадалёк хаты. Хлопец ахвотна насіў ежу, назіраючы за акаляючым светам, які стварыў Бог. Аднойчы выйшаў з дому і ніколі ў яго не вярнуўся. Абылося гэта 11 красавіка 1690 года. Тады вось сям'ю Гоўдэляў сустрэла вялікае гора. Шасцігадовае дзіця стала ахвярай забойства. Бацькі спачатку, поўныя аптымізму, шукалі свайго сына. У пошуках дапамагалі ім таксама суседзі. І так міналі дні поўныя суму і бацькоўскага болю. Аж аднойчы дайшла да іх страшэнная вестка, якая разрывала матчына сэрца і выціскала слёзы з бацькавых вачэй: „Вашага сына знайшлі. На жаль, ён не жыве”. Віноўнік, хацеўшы схаваць сваё злачынства, патаемна вывез цела хлопца і пакінуў яго на ўскраіне лесу, недалёка ад вёскі Зверкі. Пасля дзевяці дзён пошукаў знайшлі цела спакутаванага дзіцяці. Не было б у гэтым, аднак, нічога дзіўнага, калі б не факт, што пасля такога працяглага часу цела хлопчыка не папсавался, а вакол яго сядзела свора сабак, якія пільна сцераглі яго ад птушак, аб тыя нічога яму не зрабілі. Цела забітага хлопчыка аддалі сям'і і пахавалі ў царкве, што стаяла непадалёк.

Трыццаць гадоў пасля каля месца спачыну Гаўрыіла часта хавалі дзяцей, што памерлі ў выніку пануючай там эпідэміі, ушаноўваючы такім чынам ягоную мучаніцкую смерць і адчуваючы незвычайную ласку, якая выпраменьвалася з

гэтага месца. У час аднаго з такіх паховін была нарушана магілка мучаніка і было адкапана цела, якое, як аказалася, незалежна ад доўгага часу не паддалося гніццю. Пры гэтай падзеі здзейснілася шмат аздараўленняў і эпідэмія спынілася.

Цела было перанесена ва ўрачыстай працэсіі ў царкву ў Зверках і змешчана ў склепе пад храмам. Не быў гэта канец лёсу гэтага дзіцяці. Вось у 1746 годзе ў выніку пажару царква згарэла датла. Аднак цела Гаўрыіла ўцалела. Часткова спаленая ручка цудоўна загаілася і пакрылася скурай. Па пажары мошчы святога былі перанесены ў Заблудаў. Пасля пачаўся доўгі час, калі мошчы святога часта былі пераношаны. У 1755 годзе цела было перанесена ў манастыр Святой Тройцы ў Слуцку. Толькі перад I сусветнай вайной мошчы вярнуліся народную старонку у кафедру святога Мікалая ў Беласток, адкуль пасля былі перанесены ў Супрасльскі манастыр. У час I сусветнай вайны ў рамках эвакуацыі мошчы зноў вывезлі ў Слуцк. Пасля ліквідацыі манастыра Св. Тройцы ў Слуцку бальшавіцкімі ўладамі мошчы былі перанесены ў Мінск, а ў 1944 годзе ў Гродна. Тут яны спачывалі аж да 21.09.1992 года. 21 22 верасня 1992 г. пры блаславенстве архіепіскапа Беластоцкага і Гданьскага Савы ды Гродзенскага і Ваўкавыскага Валянціна мошчы Святога Гаўрыіла былі ўрачыста перанесены з Гродна ў святамікалаеўскі сабор у Беластоку.

Святы Мучанік Гаўрыіл з'яўляецца Нябесным Заступнікам дзяцей і моладзі. Дзень памяці Св. Гаўрыіла ўрачыста адзначаецца 3 мая (20 красавіка па старым стылі) у Зверках. Дзень раней (2 мая) з Беластока ў Зверкі вырушае пешае паломніцтва ў гонар Святога Гаўрыіла, дзе ў нядаўна пабудаваным жаночым манастыры адбываецца багаслужба. На час урачыстасцей мошчы Святога перавозяцца ў Зверкі.

Свята перанясення мошчаў Св. Гаўрыіла (з Гродна ў Беласток) праводзіцца 22 верасня (9 верасня па старым стылі) багаслужба ў саборы святога Мікалая ў Беластоку. З гэтым святам звязаны Беластоцкія дні царкоўнай музыкі.

На хвалу гэтага святога напісаны Трапарыён, Кандакіён, велічанне ды „Песня да святога мучаніка Младзенца Гаўрыіла", якія спяваюцца ў час багаслужбаў у праваслаўнай царкве. Прыводжу словы песні на хвалу младзенца са Звяркоў:

***Песня да святога мучаніка Младзенца Гаўрыіла***

1. Ангела всесветлаго,
Гавріила чуднаго,
Ликуюшче верни хвальне воспоим.
*Прыпеў:* Гавріиле чистейшій
Смерть от лютых пріемший
Рая Иисусова дивная розго.
2. Церкве Православныя,
Земли Белостокскія,
Свете немерцающій Младенче Святый.
*Прыпеў.*
3. Сын селян беднейших,
Хрыистіян честнейших,
Христу сораспявшись блаженство вкуси
*Прыпеў.*

4. Господен избранниче,
Младенцев верховниче,
буди умоленіем нам  на небесах.
*Прыпеў.*
5. Даруй нам спасеніе,
Вражде умираніе,
Злыя богохульники к Богу прыиведи
*Прыпеў.*
6. Да верой, надеждою,
Любовію прилежною,
Бога Слово в век славим и Тебя.
*Прыпеў.*

**Станіслаў Беркус**
**Ліда.“Арлінае Гняздо”**

Кожны з жыхароў нашага горада хоць адзін раз у жыцці задаваў сабе пытанне: “А чаму наш горад называецца Ліда?”.

Прагледзеўшы кнігі (якіх на жаль няшмат), можна было даведацца, што назва вядзецца ад імя дзяўчыны Ліды альбо ад стараславянскага слова “лядя” — паляна, вырубка леса. У апошнія гады з’явілася новая версія, — назва горада Ліда паходзіць ад назвы ракі Лідзейка, што з пераклада з балцкага “шчупакова рака”. Кожны пункт гледжання вельмі цікавы і мае ў нейкім сэнсе сваю падставу.

...Ужо некалькі годоў вялікі князь Гэдымін кіраваў ВКЛ у Навагрудку. Усе гэтыя гады прайшлі ў цяжкіх вайсковых паходах супраць іншаземных ворагаў. На поўначы княства не было ніводнага абарончага збудавання супраць крыжакоў. Гэта потым будуць пабудаваны Віленскі, Трокскі і Крэўскі замкі; а зараз за Нёманам толькі лясы і балоты.

Гэдымін любіў Прынёманскі край: у рэках і возерах было шмат рыбы, у лясах дзікіх звяроў. Таму між вайсковымі паходамі князь часта праводзіў час на паляванні. Паляванне, акрамя вайсковых паходаў, тады лічылася праўдзівым мужчынскім заняткам. Вось і зараз набіўшы шмат дзічы Гэдымін вяртаўся ў Навагрудак. Конь Гэдыміна стаміўся і князь вырашыў напаіць яго, убачыўшы наперадзе невялікую раку. Падышоўшы да яе Гедымін пачуў дзіцячы плач. Паглядзеўшы навокал князь убачыў вялікі дуб, а на ім арлінае гняздо, вось адтуль і гучаў плач. Гэдымін загадаў сваім падначаленым зняць з дрэва дзіця, і калі вярнуўся ў Навагрудак аддаў хлопчыка на выхаванне ў княжецкі двор. Так, як дзіця было знойдзена ў гняздзе (па балцкі — lizdas), то хлопчыка празвалі Ліздейка. Ліздейка хутка рос і стаў адрозніваццa ад усіх дзяцей, ён тлумачыў сны, меў здольнасці да прадказання. Усё гэта дапамагло, што Лідзейка, стаў вярхоўным жрэцом Вялікага княства Літоўскага.

Аднойчы Гэдымін вяртаўся з паўночнага паходу. Адпачынак прызначыў ня ўзвышшы над ракой Вільня. Ноччу князь убачыў сон, што на гары стаіць жалезны воўк і раве як сотня ваўкоў. Гэдымін звярнуўся да жрэца, растлумачыць сон. Лідзейка сказаў “Воўк жалезны, значыць горад – сталіцу, а тое, што ён раве, як сто ваўкоў, значыць аб славе горада будзе ведаць увесь свет”. Так паўстала сталіца ў будучым мацнейшай еўрапейскай дзяржавы Вялікага княства Літоўскага — Вільня.

Месца для новай сталіцы паспрыяў вярхоўны жрэц Лідзейка. Думаў Гэдымін, як падзякаваць Лідзейку, і вырашыў пабудаваць замак на тым самым месцы, дзе знайшоў калісці маленькага хлопчыка на дрэве ў арліным гняздзе.

Шмат часу прайшло і па сённяшні дзень мы бачым падзяку Вялікага князя Гэдыміна галоўнаму жрэцу ВКЛ Лідзейку — прыгожы моцны замак, каля якога цячэ рака Лідзейка. А ўсе мы лідзяне з’яўляемся жыхарамі Ліды — жыхарамі “арлінага гнязда”.

**Станіслава Лаеўская-Шыплюк**
**Нёман і Свіслач дзве ракі**

Легенда аб дзвюх рэчках, я якіх адна Нёман упісалася ў культуру не толькі польскую, але і іншых народаў. Гэтая рака ў ніжнім цёку актуальна вызначае мяжу паміж Літвой і Расіяй, у сярэднім паміж Польшчай і Беларуссю. А выплываючая з тэрыторыі Польшчы Свіслач ягоны прыток, ды не толькі гэта спалучае гэтыя рэкі.

*

Жыхары Палесся здаўна вусна перадавалі прыгожую легенду, у якой вельмі калярытна прыкмечаны адменны характар гэтых рэк. Нёман, па-польску Немэн, па-літоўску Немунас, па-руску Неман, гэта рака па-рознаму ўфармаваная, даўжынёй у 937 кіламетраў, мае каля 180 прытокаў, а яе шырыня сягае нават паўкіламетра. Перацінае сваімі ўзвівамі Літоўскае паазер'е. Высокія берагі гэтай ракі парастаюць лясы, прыгожыя пераломы каля Друскенік незабыўныя краявіды і пір для кагосьці, хто любіць слухаць пошум хуткаплынных нёманскіх водаў, падвойваных рэхам і мяняючыхся ў гул быццам ільвіны роў. Свіслач карацейшая, не такая разнавідная, спакайнейшая і падпарадкаваня нёманскім водам.

*

Даўным даўно, пры сваіх вытоках, спрачаліся дзве рэчкі, якой плысці праз горы. Таму дамовіліся, што пакладуцца спаць, і той, хто першым устане, той паплыве далінай. Стомлены спрэчкай Нёман хутка заснуў цвёрдым сном, а Свіслач толькі прыжмурыла вочы, прытвараючыся, што спіць. Нёман ноччу спаў і гучна хроп. Тым часам Свіслач паціхеньку, памаленьку, цуркочучы, паплыла па лугах і далінах. Раніцай, калі прачнуўся Нёман, Свіслачы ўжо не было. Як зароў ён, як загудзеў! і з усёй моцай стаў прабівацца праз горы. І так да сённешняга дня Свіслач ціхенька плыве па далінах, а Нёман, рыкаючы, перамагае горы, толькі час ад часу адпачывае, ствараючы разлівы і мелі, ды ўсё часцей, спяшаючыся да мора, гучна раве, коціць свае воды. У гэтай спешцы і запальчывасці захоплівае ў сваю плынь таксама і воды Свіслачы.

**Уладзімір Прыхач**
**Легенда аб Крэве**

*Дадзенае паданне “**Гарадзішча**” было змешчана ў першым нумары часопіса вучняў (звычайны вучнёўскі сшытак) Ашмянскай гімназіі імя Я. Снядэцкага „Młoda myśl” за 1929 год.*

*Трэба адзначыць, што захаваўся адзіны вядомы паасобнік гэтага рарытэтнага гімназічнага выдыння. Яго рэдактарам быў І. Баранскі, а выдавалі ўдзельнікі філарэцкага гуртка імя Т. Зана ў Ашмянах. Дадзены экзэмпдляр захоўваецца ў рукапісным аддзеле бібліятэкі Віленскага ўніверсітэта.*

*Сярод разнабаковай хронікі жыцця навучальнай ашмянскай установы і яе выхаванцаў, у ім таксама змяшчаюцца вершы, гумарэскі, апавяданні і паданні. Апошнія збіраліся вучнямі гімназіі ў час адпачынку і вандровак па навакольных мясцінах Ашмяншчыны.*

*Прадстаўлены на конкурс матэрыял быў занатаваны вучнем 4 класа ашмянскай гімназіі Ежы Старасцяком і тычыцца невядомага эпізода з гісторыі Крэўскага Гарадзішча, станаўленню хрысціянства ў гэтым краі.*

***Гарадзішча***

За кіламетр ад Крэва знаходзіцца гара, на якой раней рос святы дуб. Яшчэ сёння мы можам бачыць яго струхлелы пень. Пасярод гары знаходзіцца яма памерам з касцёл, з гэтай гарой звязана наступнае паданне.

У часы паганскай Літвы калі людзі верылі, што боства праяўляе сябе ў абраным ім дрэве, у цені такога дрэва будавалі храм і насыпалі ўзгорак для правядзення абрадаў. У тыя часы ў велізарных пушчах, паблізу малога ляснога паселішча Крэва быў заўважаны вялікі дуб, які рос на вялікім узгорку. Калі вестка аб гэтым дайшла да галоўнага святара, ён загадаў у цені дуба збудаваць капішча і выслаць у яго паганскіх святароў, якія абвясцілі люду, што ў гонар пануючага князя гэтая гара будзе называцца гарой Міндоўга. Капішча на працягу доўгіх гадоў карысталася ў люду вялікай пашанай, а яго святарам нічога не бракавала. Прыходзілі штогод шматлікія натоўпы бедных, якія запаміналі сны, што ім сніліся пад дубовай каронай, тлумачылі іх і рабілі высновы на будучае.

У той жа час у ваколіцы жыў пустэльнік, які, пачуўшы аб паганскім

капішчы, пайшоў у імя Божае наварочваць атуманены люд на сапраўдную хрысціянскую веру. Чуючы з вуснаў манаха Божае Слова, люд пачаў вяртацца да Бога ў вялікай колькасці. Паганскія святары абвясцілі пустэльніка прычынай будучых няшчасцяў. У святочны дзень боства, у гонар якога было збудавана капішча, яны пажадалі ад пустэльніка, каб той апраўдаўся і падцвердзіў цудам сваю веру, а гэтакім цудам павінны быць знікненне капішча пад зямлёй. Пустэльнік згадзіўся пры ўмове, што яму дадуць тыдзень часу, і калі яму было дазволена, ён увесь гэты час пасціў і прасіў Бога аб цудзе. На сёмы дзень пагане са страхам заўважылі, што на месцы капішча знаходзіцца яма, якая сведчыла аб тым, што яно правалілася пад зямлю. Пустэльнік жа ўдзячны Богу за ўчынены цуд, разам з некалькімі хрысціянамі ўзвёў за нейкі кіламетр ад гарадзішча касцёл, які падобна, быў першым на Літве.

*Ашмяны, 01.02.1928г.*

**Ежы Старасцяк**

**Тамаш Ліпаман**
**Нятупа**

20 кастрычніка 1655 г. у Кейданах князь Януш Радзівіл разрывае уунію Літвы з Каронай і падпісвае дамову, якая звязвае Вялікае княства Літоўскае са Швецыяй.

Ян II Казімір з'язджае з Варшавы і ўцякае ў Кракаў, а пазней у Сілезію Шлёнск. Польшча, знясіленая войнамі з Турцыяй і бунтам Хмяльніцкага, становіцца лёгкай здабычай.

Пасля трыццацігадовай вайны скарбніца Шведскага каралеўства амаль пустая. Краіна, аднак, мае моцнае і добра размешчанае на паўднёвых берагах Балтыкі войска. Выпадак сам ідзе да шведаў у рукі. На працягу пяці гадоў шведы рабуюць край пры мінімальным супраціве шляхты.

Праз некалькі гадоў пасля шведскага патопу Рэч Паспалітая зноў увязваецца ў доўгую і спусташальную вайну з Турцыяй. Скарбніца дзяржавы пустая. Войска працяглы час не атрымлівае грошай. Вясной 1672 г., якраз перад турэцкім наступам, у харугвах, якія месціліся на Украіне, распачынаецца бунт. На працягу месяца ўсе, акрамя літоўскіх, татарскія харугвы пераходзяць на бок туркаў.

Літоўскія татары разам з атрадамі крымскіх татараў ды рэгулярным турэцкім войскам пустошаць усходнія межы Рэчы Паспалітай.

У 1674 г. польскія войскі здабываюць Бар. Ян III Сабескі абвяшчае амністыю для ўсіх мусульманаў, якія вернуцца на службу ў польскае войска. Польскія татары, прызвычаеныя да шляхецкіх свабод, ахвотна кідаюць службу ў інакш выхаваных туркаў. Спрыяла гэтаму і абяцанне даваць плату ім на роўні з жаўнерамі з іншых польскіх часцей.

Мінаюць гады. Скарбніца Рэчы Паспалітай па-ранейшаму амаль пустая. Ян III Сабескі вымушаны забіраць грошы, прызначаныя на ўтрыманне каралеўскага двара.

Вёскі Крушыняны, Лужаны і Нятупа, Багонікі, Драхле і шмат іншых пераходзяць ва ўласнасць польскіх татараў у якасці кампенсацыі за запазыку на плату.

Начальнікі атрымліваюць фальваркі, а звычайныя жаўнеры, якіх звалі таварышамі, кавалкі не вельмі ўраджайнай камяністай зямлі. Паўстаюць мячэці ў Багоніках, Крушынянах і Малевічах.

Адным з таварышаў быў Алі, дваццацігадовы, смуглявы, цёмнавалосы, адважны хлопец. Быў ён добрым жаўнерам, але ненайлепшым селянінам. Не хапала яму

цярплівасці і ўпартасці ў штодзённым змаганні з ўсюдыіснай Пушчай. Алі атрымаў зямлю паблізу сучаснай вёскі Грыбоўшчына Новая. Ён спрабуе гадаваць коней, аднак без вялікага поспеху. Міналі гады. Алі ўсё больш хацеў узяць за жонку якую небудзь Кахну Паплаўскую ці Ягну Клячкоўскую, якая акрамя прозвішча абдарыла б яго яшчэ і купай дзетак. Але як тут ажаніцца, калі кішэні пустыя?

Напярэдадні вясны 1682 г. зіма адступае са сваіх пазіцыяў. Вясна яшчэ ў сенцах, аднак ужо дае пра сябе знакі. Па палях ды мурагах паўсюль гуляюць усходнія ветры, пераносячы табуны бруднага снегу. У зацішках першыя плацдармы здабывае вясна. Падмоклыя альшанікі і ўрадлівыя граду пачынаюць квітнець купамі белых анемонаў, у равах распускаецца лотаць.
Сонца з кожным днём усё часцей запускае сваё праменне ў лясны гушчар, ператвараючы гурбы збітага снегу ў мільёны струменьчыкаў, якія на шляху да мора-акіяну ўтвараюць вялікія і малыя разлівы.

Алі сніць сон. Анёл з залатымі крыламі паказвае яму месца, дзе схаваны вялізны скарб. Поўная скрыня залатых манет, рубінаў, смарагдаў, пярлін закапаная непадалёк ад крыніцы.
З таго моманту наш герой кожную вольную хвіліну прысвячае пошуку скарбу. Задача, аднак, няпростая. Пушча надзвычай багатая крыніцамі. Зараз іх налічана каля 440. Аднойчы, у пачатку траўня, Алі натрапіў аднак на месца, якое здалося знаёмым. Пачаўшы капаць ля маленькай безыменнай пушчанскай крынічкі, метр пад зямлёй натрапіў ён на вялікі камень. Паспрабаваў яго адваліць, але валун аказаўся занадта цяжкім. На наступны дзень вярнуўся Алі сюды з наймацнейшым са сваіх канёў ды ільнянымі вяроўкамі. Абвязаў камень, запрог мышастага каня і цягне з усяе сілы. Усё марна. Бліжэй абеду вяртаецца сюды з двума конямі і новымі вяроўкамі. Ад вялікай напругі пагружаецца ў мяккі лясны мох. Камень сантыметр за сантыметрам саступае. З нутра Пушчы вырываецца магутны струмень. У апошні момант Алі пераразае лейцы кінжалам ды адцягвае коней на сухую зямлю. У імгненне вока крыніца залівае пні старых ялін і перапаўняе берагі былога ручая. Далейшы лёс Алі схаваны ў змроку часоў. Магчыма, рушыў ён на новую вайну з туркамі, каб узяць удзел у бітве пад Венай альбо Парканамі. Хто ведае?

Рэчка, якую ён ажывіў, называецца зараз Нятупа. Крутая, незвычайна прыгожая і разнастайная ў сваім кароткім бегу, плыве яна дваццаць кіламетраў ад крыніцы да Нёмана. У 1996 г. у даліне Нятупы створаны запаведнік фауны з мэтай аховы натуральнай папуляцыі баброў.

У рэзерваце Нятупы можна паназіраць за шматлікімі плацінамі і хаткамі гэтых прыгожых жывёлін, якія, падобна як людзі, здольныя прыстасаваць асяроддзе да сваіх патрэб. Бабры, аднак, заўсёды яго ўзбагачаюць. У гэтым невялікім рэзерваце, плошчай усяго каля 273 гектараў, знайшлі сваё прыстанішча птушкі 120 відаў, у тым ліку такія рэдкія, як скапа, малы арлец, малы зуёк, арэхаўка.

**Яцэк Даневіч**
**Легенда аб Дзіванне**

“Праўда стала гісторыяй, гісторыя легендай, легенда міфам...” так я хацеў бы пачаць свой расказ. Шмат легендаў і міфаў кружыць па нашых землях. Адны з іх фальшывыя, прыдуманыя, у іншых знойдзем зерне праўды. За шматат гадоў, перадаваная пакаленнымі, гісторыя крышку мянялася, што-небудзь дадавалі да яе новага або выціралі навекі, аднак гэта не мела ўплыву на яе змест і пераказ. Некаторыя легенды былі сапраўдныя і неслі ў сабе глыбокі сэнс, дзякуючы якому людзям жылося лепш, паколькі не рабілі памылак, пра якія чулі ад сваіх дзядоў. Бывала і так, што некаторыя міфы мелі за заданне палохаць марудных, невыносна непаслухмяных і цяжкіх для выхавання дзяцей. Выдумлялі аповесці аб прывідах і вупырых, каб людзі думалі, што за непаслухмянасць чакае пакаранне. Шмат ёсць легендаў і міфаў, ды шмат іх не выйшла па-за сцены родных хатаў. Ёсць такія людзі, што баяцца расказваць аб глыбокай мінуўшчыне, верачы ў тое, што сустрэне іх штосьці благое з боку незабытых легендамі дэманаў. Я хачу вас пазнаёміць з адной гісторыяй. Я да канца не ведаю, ці яна сапраўдная, тым не менш вельмі мяне яна зацікавіла і заінтрыгавала.

Легенда пра Дзіванну гэта аповесць, якой падзеі пачаліся даўно таму, ды ніхто не ведае калі. У старой хаце ў вёсцы Шумна царыў спакой. Дзеці не маглі заснуць і папрасілі ў дзедкі, каб ён расказаў ім гісторыю пра бабулю. Старэча пачаў ад пачатку, ад моманту, калі ўбачыў прыгожую дзяўчыну першы раз. Сустрэў яе ў адну раніцу пасярод лесу. Назваў яе Дзіванна, паколькі стаяла на паляне густа парослай гэтай кветкай. Захацеў быць з ёю, а і яна захацела, каб ён яе не пакінуў. На жаль, праз нейкі час пакінуў ён тую дзяўчыну. На хвіліну старэча сыніў расказ і задумаўся. Унукі хацелі даведацца больш і сталі штурхаць дзеда, каб працягваў аповед. Ды раптам, невядома адкуль, пачулі нейкае храбатанне. Гэта былі пацукі.

Агромная грамада гэтых грызуноў уціскалася ў хату. За імі крочыла цёмная постаць жанчыны. Гэта была постаць Дзіванны, жадаючай помсты на каханку, які гадамі таму яе падмануў. Праз дзень вёску абабегла вестка аб смерці Рыгора так называўся той стары. Людзі завельмі не пераняліся Рыгорам, паколькі не быў ён тутэйшым і ніхто не меў да яго даверу. Хутчэй пераняліся з'яўленнем Дзіванны, якую звалі Самотнай або Змрочнай Дамай.

Бацькі палохалі дзяцей яе вобразам, казалі, што Пані пачукоў забярэ

непаслухмяных дзяцей і зжарэ іх. Людзі хацелі спакою і рашылі параіцца ў солтыса старасты вёскі: што ж рабіць? Той, самы кемлівы ў вёсцы, сказаў, што найлепшы спосаб пазбыцца Змрочнай Дамы з вёскі гэта падацца да Ляснога Дзеда. Солтыс узяў з сабою Булу і Адама, двух найбольшых п'яніц у вёсцы, ды самых моцных і адважных, і накіраваліся яны ў цёмны лес. Вандравалі два дні, бо ж немагчыма было дабрацца да Ляснога Дзеда іначай як пешкі. Дарога была крутая. Мала хто ведаў гэтую ваколіцу. Солтыс, праходзячы побач месячнага валуна сказаў таварышам, што ўжо недалёка. Сустрэча мела адбыцца пры разбітай плакучай вярбе. Старац, якога звалі Савішам, запрасіў падарожнікаў у сваю пустэльню. Там расказаў ён гісторыю Пані Пацукоў. Была яна калісьці членам Брацтва Лесу, згуртавання шчыльна звязанага з прыродай. Пасля смерці кожны друід-братчык сваю душу мусіў аддаць у расліну. Дзіванна, якая жадала чалавечага кахання, уцякла, застаючыся нежывой, ды непамерлай ужо навечна. Савіш даў параду сялянам, каб толькі злітаваліся над ёю. Булу і Адаму гэта не было даспадобы. Меркавалі, што друід хоча яе ратаваць. Рашылі правучыць яго і забілі яго на вачах солтыса Мацея, які і не думаў паспачуваць старцу.

Вярнуўшыся ў вёску сказалі, што старац хацеў літавацца дад Самотнай Дамай, нічога аднак не сказалі аб забойстве Савіша. Гэтая вестка ўсё ж дайшла да Ляснога Брацтва. Друіды здзівіліся, паколькі Савішу наканавана было вечнае тулянне па свеце. Меў ён жыць у пастаянным болі. Аднак цешыліся ягонай смерці, паколькі азначала гэта, што пазбыліся Дзіванны. Яна мела жыць так доўга, як доўга будзе на гэтым свеце Савіш. Аднак, гэта легенда не спраўдзілася да канца. Самотная Дама, даведаўшыся аб смерці Ляснога Дзеда, які быў яе каханым, рашыла адпомсіць вяскоўцам. Штоноч наведвала вёску ды забівала па адной асобе. Неўзабавае ў жывых былі толькі Була і солтыс Мацей. Абдумвалі якраз план, як пазбыцца чараўніцы. Пачулі груканне ў дзверы. На парозе паказаўся Савіш. Рашылі яны зрабіць пастку на пацуковую панну. Мацей загадаў сябру, каб той распаліў у лесе касцёр і чакаў Дзіванну. Той так і зрабіў. Пасярод ночы Булу абудзіў трэск голля. Убачыў постаць жанчыны, Була сказаў ёй, што прыслаў яго друід, якога злавіў солтыс і якога Мацей хоча ўтапіць у возеры. Жанчына адышла, не пакідаючы аднак п'яніцы ў жывых. Адзіны жывы жыхар вёскі чакаў са звязаным друідам на лодцы, што дрэйфавала пасярод возера. Раптам з-пад вады вынырнула Яна. Узіралася ў каханага паўгадзіны, не прамовіўшы з ім ні слова. Калі Мацей хацеў штосьці сказаць Савішу, крануў яго, і той расплыўся ў паветры разам са сваёй любай.

Пасля шмат гадоў адзін журналіст, хацеўшы разнесці плёткі аб нейкім Лятаючым Ксяндзы, пачаў прынюхвацца вакол касцёла ў гэтай вёсцы. Звалі яго Шыман. Праходзячы каля замерзлага возера ўбачыў сляды на снезе. Ідучы па іх, дайшоў да невялікага касцёліка. Прывітаў яго ксёндз, які запрасіў шукальніка праўды ў сярэдзіну храма. Пачалі размову. Праз кароткую хвіліну аказалася, што гэта і ёсць той Лятаючы Ксёндз. Ды тая асоба, што хавалася ў змрочным храме, ксяндзом не была. Быў гэта Мацей, колішні друід з Ляснога Брацтва. Ён першы рассакрэціў, што друіды могуць жыць вечна, калі не заклянуць свае душы. Гэта ён загадаў прагнаць Савіша за сувязь з Дзіваннай. Журналіст хацеў даведацца чагосьці аб лятанні Мацея ды спытаўся пра сляды на снезе. Аказалася, што гэта адбіткі ступакоў закаханай пары, што ляжыць на дне возера; гэта тыя, што хочуць забіць былога солтыса. Лятаючы Ксёндз папрасіў журналіста, каб той застаўся ў касцёле,

уводзячы ў зман панурую пару. За той час Мацей вылецеў бы праз дзіру ў даху ды ўцёк ад Савіша і Дзіванны. Шыман згадзіўся. Хацеў яшчэ даведацца, чаму каханкі яго праследуюць, ды запозна - той ужо паляцеў. Назаўтра малады журналіст выйшаў перад касцёл і зноў пабачыў сляды. Вялі яны ў напрамку, куды паляцей Мацей. Не ўдалося іх падмануць! Закаханая пара надалей блукае па свеце, услед за віноўнікам свайго суму і гора.

Гэтая гісторыя выклікала ўва мне вялікае зацікаўленне міфамі і легендамі звязанымі з нашай зямлёй. Я пачаў ездзіць па тутэйшых ваколіцах і распытваць людзей, ці не ведаюць якіх цікавінак звязаных з месцам іх пражывання. Запісваю ўсе весткі і маю надзею, што праз год буду мець нагоду напісаць пра іх. Хочаца мне імі падзяліцца з усімі. А так увогуле ці і вы, так як я, бачыце час ад часу сляды на снезе, якія раптам не маюць працягу?

**Тамаш Ліпаман**
**Вёска Кондыцыя**
*Легенда з Кнышынскай пушчы*

Есць у Кнушынскай пушчы вёска Кандыцыя, якая складаецца толькі з адной хаты. У гэтай хаце жыве солтыс таго каралеўства з дзвюх асоб, якое складаецца з солтыса і солтысіхі. Насоўваецца пытанне, чаму веска Кандыцыя такая невялікая, і яшчэ больш цікавае, чаму яна аж такая шматлюдная?

Гэта было даўным даўно, калі гасцінцамі вандравалі рыцары ў зброі, а ў кнышынскіх нетрах жылі мядзведзі і расамакі. У самай сярэдзіне Пушчы, над ракой Слояй, жыў разам з сям’ей Войцех – сын боднара. Гаспадарка яго складалася амаль што з 30 маргоў урадлівай лебы. У склад маентку ўваходзілі сакавітыя лугі і значны кавалак ворнай зямлі каля самага лесу. Войцех быў чалавекам працавітым і дужым. У зачынены на салідныя, кованыя замкі свіронку з года ў год прыбывала маёмасці. Дзеці раслі, а разам з імі і гаспадарка. Гаспадар укладваў у землю запарцаваныя грошы, дакупляючы яе па кавалку ад меней спраўных суседзей. З цягам часу ён стаў гаспадаром амаль што два разы большага кавалку зямлі, чым той, што меў, калі асеў над Слояй. Любімым заняткам Войцеха было сядзець на невялікім пагорку каля лесу і любавацца сваей маёмасцю.

Пасля некалькіх дзесяткаў гадоў выкупіў ён у суседзяў усе палеткі паблізу і лічыўся мясцовым багацеем. І адчуваў бы ён сябе як пан на сваім, калі б не адна невялікая праблема. Клопат гэты называўся Марцін, які паходзіў з кавальскай сям’і і быў яго апошнім суседам. Сын бондара прасіў, спакушаў, настойваў, а нават і страшыў, але нічога не дапамагала. Марцін не меў намеру расстацца са сваей гаспадаркай. Войцех хадзіў, як у вадц апушчаны, схуднеў, учарнеў, але зусім не стаў больш шляхетным з выгляду. Сэрца яго перапаўняла ўсе большая нянавісць, а у галаве ўсе часцей з’яўляліся забойчыя думкі. Аднак сын каваля не быў дурань ні слабак, а да таго ж меў чатырох дужых сыноў.

Аднойчы снежанскім вечарам Войцех выбраўся на абход сваей маёмасці. Як звычайна, зайшоў ён на пагорак пад лесам. Усеўся на камяні і панурыўся ў чорныя думкі. Чым больш ён думаў, тым менш мог знайсці выхад з сітуацыі. Ужо сабраўся ісці дахаты, калі амаль самі выплылі з яго вуснаў словы: “Душу б д’яблу прадаў, абы толькі ад гада пазбавіцца”. Запахла серай і ў аблоку дыму явіўся Барута. – “Ты зваў мяне і я прыйшоў” – сказаў чорт з з мілай усмешкай і адразу выцягнуў з-за пазухі гатовы цыдылу, напісаную на свіной скуры. Войцех смяртельна перапужаўся і

спрабаваў уцячы дахаты. Аднак ногі адмовіліся яго слухацца. Стаў ё як слуп солі і слухаў прывабныя словы, якімі выбіў яго Злы. А д'ябал меў у гэтай справе немалы досвед. Ён намаўляў, спакушаў, маніў . Здурнелы мужык у рэшце рэшт паддаўся і падпісаў цыдулу ўласнай крывей. Д'ябал паабяцаў, што найпазней праз два тыдні пазбавіцца ад суседа з усёй ягонай сям'ей, а яго зямля дастанецца Войцеху.

Пасля некалькіх дзен надышло ў ваколіцу заразнае паветра.

Шмат людзей захварэла. Не мінула зараза і прыгожых палеткаў над Слояй. Як і абяцаў д'ябал, Марцін разам з сям'ёй цяжка захварэў і пасля некалькіх дзен памёр у пакутах. Тое самае адбылося з яго жонкай і сям'ёй. Д'ябал аднак аказаўся больш старанным, чым гэта было патрэбна, таму што хутка ўся сям'я Войцеха захварэла страшнай хваробай, і далучылася да іншых, якія памерлі з-за мору, а прыгожае месца стала бязлюдным і жахлівым.

Войцех застаўся адзін. На адлегласці 10 вёрст не было апроч яго ні адной жывой душы. Гісторыя маўчыць аб далейшым лесе прагнага селяніна. Вядома толькі, што памёр ён ад роспачы, не пакінуўшы праклятай зямлі. Цела яго раздзерлі дзікія звяры, а непахаваныя косці валяліся яшчэ доўга пасля дакананння марнага жыцця.

З тых часоў шмат людзей спрабавала асесць на слойскіх лугах аколіц цяперашней Кандыцыі. Аднак, усе яны ў поспешліва кідалі гэтае месца, нават не дакончыўшы хат. Вядома, што над ракой далей мэнчыцца дух Войцеха. У даждлівыя і ветраныя ночы, а асабліва ў час зімовага сонцастаяння, ён явіцца людзям у табуне снегу, пакрыты чорнай каростай. Час ад часу неспакойны дух жахліва вые і пасылае праклёны Боруце.

**Тамаш Ліпаман**
**Пунсовая карчма**

Ёсць на ўсходніх ускраінах Кнышынскай пушчы мястэчка Крынкі. Сёння яно хутчэй сціплае. Аб былой знакамітасці гэтага гарадка можа сведчыць герб грыф ды легенда з пачаткаў пятнаццатага стагоддзя. Легенда звязана з адным з найвялікшых польскіх уладароў ды маладзейшай ад яго на пару ладных дзесяткаў гадоў каралевай Ядвігай. Шматгалосая плётка распавядае, што ў час, калі Пушчу шматліка насялялі собалі, ваўкі, мядзведзі і расамахі, а людзей і шляхоў было няшмат, кнышынскімі бездарожжамі з Літвы ў Кракаў вандраваў князь разам са стражай вояў. Той атрад у дарозе ў Кракаў заграз у багне ў ваколіцы сённяшніх Крынак. Для пераправы збудавалі тымчасовы мост, а для лепшага прыёму ў Кракаве забралі згэтуль мясцовую жывую ваду.

Вада з мясцовай крыніцы аздаравіла Ядвігу, за што пазнейшы пераможца грунвальдскай бітвы, згодна логіцы эпохі, падараваў князю гэтыя землі.

За праўдзівасцю легенды прамаўляе факт, што Ягайла, як кароль Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў наведаў Крынкі ў 1434 годзе, аднаўляючы тут еднасць Літвы з Каронай.

Міналі гады, гасла дынастыя Ягелонаў, а разам з ёю патухала знакамітасць Рэчы Паспалітай. Гуманская разня была прэлюдыяй Таргавіцы звязанай з патранатам Кацярыны II, якая, як вядома, выцерла Польшчу з карты Еўропы. У той цяжкі час прабягаў праз Крынкі важны гандлёвы шлях з Гродна ў Бярэсце над Бугам і далей у Кракаў. Рускія, польскія ды нават і венецыянскія купцы вандравалі гасцінцам праз Крынкі, Белавежу, Камянец, везучы розны тавар, між іншым золата ды дарагія каштоўнасці.

Ля тракта дзейнічала аўстэрыя, якую вяла сям'я Лейбніцаў. Велікаваты драўляны будынак з аркадамі, накрыты мансардавым дахам і падперты ад фронту багата рэзбленым ганкам стаяў некалькі вёрст на захад ад Крынак, пры шляху ў Гарадок. Невядома, калі здудавалі гэты шынок, аднак падзея з канца XVIII стагоддзя, звязаная з гэтым месцам, да сёння жыве ў мясцовай легендзе. Карчму вёў, не горш і не лепш за сваіх продкаў Мошэ Лейбніц. Штосьці яго, аднак, вылучала з ланцуга генаў дачка Рахіля, дзяўчо вялікай красы. Валасы як бяззорная снежаньская ноч, вочы як у ялавіцы, поўныя вусны колеру спелых малін, зграбны невялічкі нос, твар колеру старога золата, грудзі стромкія, вузкі стан, попка як у кабылкі-двухгодкі, ножкі бы ў сарны. Адным словам кроў з малаком.

У той неспакойны час бушаваў у ваколіцы Мацей, паўсюдна званы Расамахам. Прафесійна займаўся ён, няшмат гаворачы, разбойніцтвам. Абдзіраў галоўным чынам купцоў. Рабаваў без пакарання, паколькі каралеўская ўлада сюды не сягала. Слова добрага аб ім не скажаш. Дзікія вочы, ускудлачаная барада амаль па пояс дый адзенне паскуднае -- усё адпаведнае паводзінам.

У час адной з папоек, якімі гэты бандзюга з любасцю аддаваўся ў гасподзе Мошэ Лейбніца, трапіла яму ў вока Рахіля. Бацька дзяўчыны не хацеў выдаць замуж дачкі за бандыта, да таго гоя. За сваю ўпартасць аддаў жыццё. Пры такой шлюбнай прапанове дзяўчыне цяжка было даўжэй адмаўляцца. Пасля вянца, які, кажуць, сам Барута даваў маладой пары, Расамах рашыў „пасталець". Нейкі час вёў спакойна інтарэсы. Раптоўная натура, неўтаймаваная пагарда да паўсюдна абавязваючых нормаў, а асабліва прагнасць маладажона ўзялі аднак неўзабаве верх, паклаўшы канец досыць пачцівай экзістэнцыі.

Расамах пачаткова хацеў нават вярнуцца ў лес, на рабаўніцкі шлях. Абдумаўшы справу, дайшоў ён да вываду, што няма сэнсу гнацца за звярынай, калі яна сама трапляе яму ў рукі. А звярыны хапала. Калі спыніліся напады на гандлёвым шляху, купцы штораз больш людна цягнулі з Гродна ў Берасце і далей у Кракаў. Госці ставалі ў карчме пад Чырвоным Пеўнем, славутай добрай кухняй, каб больш не ўстаць. Жорсткі гаспадар забіваў у сне кожнага багацейшага госця, а іх пасечанымі целамі карміў свіней, бо ж, як я ўжо казаў, быў вялікім скупечам. Мясцовыя называлі паціху гэты змрочны заезд Пунсовай карчмой. Прыезджых аднак не асцерагалі перад смяртэльнай небяспекай тэрарызаваныя Расамахам, які меў за нішто ні чалавечы, ні боскі закон.

Працягваўся гэты ганебны промысел некалькі гадоў. Карчмар сабраў вялікае багацце, якое, кажуць, закопваў у склепе складзе віна.

Аднойчы спынілася ў гасподзе Малгажата, блакітнавокая ўдавіца з парай малалетніх сыноў. Абяднелая з-за шматгадовай судовай валакіты шляхцянка кіравался ў Кракаў, каб выпрасіць у Яго вялікасці караля ласку для сябе і дзяцей, пакрыўджаных мясцовым правасуддзем у шматгадовым споры з хітрым і багатым суседам. Уся маёмасць жанчыны гэта была худая кеска з грашыма на далёкае падарожжа ды выпрашэнне прыхільнасці каралеўскіх шаптуноў.

Расамах прыкмеціў і ўдовін грош. Ветранай, цёмнай, снежаньскай ноччу закраўся ў сціплы пакойчык на паддашку, узброены ў азіяцкі кінжал.

Трэба вам, аднак, ведаць, што ноч гэта была асаблівая, ноч зімовага сонцастаяння. Для шмат еўрапейскіх народаў гэта нагода да святкавання адвечнага цыкла натуры. Якраз у гэтую ноч прыпадае адзін гэтак званы малы сабат, свята чараўніц званае Юле. У той час адпраўлялі яны магічныя абрады, прамаўлялі заклінанні, танцавалі ў бляску месяца, выклікалі таемныя моцы, кантактаваліся з духамі памерлых.

Усё ж, наша гісторыя здзяйсняецца, гляньце, у больш за восем стагоддзяў ад хрышчэння Польшчы! У бледным сяйве месяца жорсткі гаспадар крадзецца да ложа ўдавіцы і яе сыноў. Крывы кінжал ўздымае да смяртэльнага ўдару. Роспачны крык Рахілі падымае павекі Малгажаты. Маці глядзіць проста ў зрэнкі Расамаха.

Енкнула зямля, схілілася голле ясеняў, што цесным вянком акалялі падворышча Пунсовай карчмы. Заскрыпелі бэлькі сцен, сыпануўся пыл са столі. Жынчына сарвала з ложа дзяцей, піханула дзверы і збегла па стромых усходах. Расамаха застаўся ў ізбе. Знерухомелы, здзіўлены, у чаканні. Уздыхнула зямля,

раскрылася і праглынула аўстэрыю.

Мясцовыя кажуць, што там, у некалькіх вярстах на поўдзень ад Крынак, паміж Плебановам і Азяранамі, у снежаньскія ночы Барута, які быў мабыць Расамаху маршалкам на вяселлі, выносіць з зямлі золата. Выносіць, каб правеялася. Кажуць, у некаторыя зімовыя ветраныя ночы відаць у полі жоўтыя агеньчыкі, якімі палаюць скарбы забітых вандроўнікаў. Колькі ў гэтым праўды, цяжка дайсці, факт аднак застаецца фактам, што амаль сто гадоў пасля гэтых падзей, пра якія я вам расказаў, адзін пробашч спрабаваў адкапаць закляты скарб. Магілы гэтага духоўніка дарма шукаць на мясцовых могільніках. Засталася толькі назва вёскі: Плебанова.

**Сяргей Чыгрын**
**Слонімскія паданні і легенды**

**Чамяры**

Існуе дзве народныя легенды наконт паходжання вёскі Чамяры Слонімскага раёна. Паводле адной з іх, яшчэ ў XIV стагоддзі ў даліне ракі Валобрынкі пасяліліся 17 сем'яў з урочышча Падоськавічы. З Падоськавічаў людзі ўцяклі ад эпідэміі чумы, якая там успыхнула. Гэтую хваробы тады і цяпер на Слонімшчыне старыя людзі называлі і называюць чамер. Нават у сварцы сярод вяскоўцаў можна пачуць: “Ах, каб цябе чамер пабраў!”.

Паводле іншай легенды, назва вёскі Чамяры паходзіць ад расліны чамярыцы, якой тады шмат расло ў пойме ракі Валобрынкі. І калі пачалася эпідэмія чумы, людзі з Падоськавічаў хаваліся ў чамярыцы. І ядавітая чамярыца іх выратавала ад чумы. Тады на гэтым месцы яны засталіся жыць. І назвалі паселішча Чамяры.

**Падлужжа**

Так называецца урочышча недалёка ад вёскі Хадзявічы. Паводле легенды, якую расказваюць вяскоўцы, тут быў вялікі белы палац, дзе жыла пані Падлужанская. У яе было 50 гектараў зямлі. Высокая, худая, прыгожая пані была не замужам. Яна ездзіла на белым кані, была ганаровай і асцярожнай. Да сябе блізка пані нікога не падпускала, асабліва была асцярожнай у адносінах да мужыкоў. Аднойчы людзі заўважылі, што кудысьці пані Падлужанская знікла. Тыдзень яе не было, месяц... Так пані і не вярнулася. Тады людзі з суседніх вёсак сабраліся і пачалі рабаваць яе белы палац. Разцягнулі ўсё дашчэнту. А тое месца, дзе жыла пані Падлужанская сталі ў народзе называць Падлужжа.

**Вомшаро**

У лясным масіве недалёка ад вёскі Хадзявічы Слонімскага раёна і вёскі Сынковічы Зэльвенскага раёна ёсць урочышча, якое людзі называюць Вомшаро. Вяскоўцы расказваюць розныя легенды пра Вомшаро. Калі хто ішоў у лес па грыбы, ці гнаў у лес пасвіць каровы, ці ехаў па

дровы, яго папярэджвалі: “Каб не заходзіў і не ехаў у Вомшаро”. Бо той, хто туды трапляў, дамоў ужо не вяртаўся. У Вомшары жыў лесавік Вомшар, які летам, восенню і вясною хапаў людзей і цягнуў у сваё тарфянае балота. Зімою лесавік спаў, таму тады можна было на санях смела праехаць праз Вомшаро. Людзі баяліся і баяцца сёння Вомшара, стараюцца яго абыходзіць бокам.

**Расколаты камень-валун**

Расколаты камень ляжыць у лесе паблізу Альбярціна (мікрараён Слоніма, раней быў пасёлак) каля дарогі, калі ехаць на вёску Якімавічы. Ён больш за тры метры ў вышыню, тры з паловай метры ў шырыню і ў даўжыню.

Сярод слонімцаў бытуе легенда, што некалі тут жыў Янка-асілак. Аднойчы ён сустрэў дзяўчыну незвычайнай прыгажосці і моцна закахаўся. Дзяўчына таксама пакахала юнака. Але аб прыгажуні даведаўся двухгаловы змей і прыляцеў па яе. Насустрач змею выйшаў Янка-асілак і сказаў: “Трымаю бой на жыццё і смерць, але сваю дзяўчыну табе не аддам”.

Янка-асілак і змей сышліся ў чыстым полі. Загрымелі мячы і пачалася бойка. Яны доўга біліся і Янка бачыць, што перамога зусім блізка. Але ён раптам адчуў, што моцна прытупіўся яго меч. “Эх, і патачыць няма чым!  усклікнуў Янка.  Хоць бы камень які пад рукой аказаўся”.

І вырасла перад ім скала, як быццам шчытом закрыла. Не змог змей дастаць сваім мячом Янку, злосна секануў па камені што было сілы  раскалолася скала і выбіла меч з варожых рук. Тут Янка і дабіў змея. А расколаты валун да сённяшніх дзён ляжыць на слонімскай зямлі.

Пра слонімскі расколаты камень існуе і другая легенда. Неяк вяртаўся пан Пуслоўскі з лецішча ў свой маёнтак, што быў у Альбярціне. У дарозе яго застала навальніца. Фаэтон Пуслоўскага спыніўся каля самага каменя-валуна. У гэты момант моцна стукнула маланка і трапіла проста ў камень, які ад удару раскалоўся на дзве часткі.

Два тыдні ў маёнтку Пуслоўскіх гарэлі свечкі ў знак таго, што камень выратаваў пана. Ён пасля загадаў паставіць на камені крыж. А неяк слугі Пуслоўскага спрабавалі даведацца, на колькі метраў валун знаходзіцца ў зямлі. Яны пракапалі ўглыб на некалькі метраў, але асновы так і не знайшлі. Пан загадаў спыніць гэту работу і засыпаць яму. Што слугі і зрабілі.

Сёння людзі кажуць, што некалі ў шчыліну расколатага каменя магла ўлесці толькі рука. А сёння шчыліна стала шырынёй больш метра. Мабыць быў і на камені крыж, бо зверху яго ёсць паглыбленне.

**Возера Бяздоннае, камень-бацька і камень-сын**

Возера Бяздоннае знаходзіцца на поўдні вёскі Клепачы Слонімскага раёна. Жыхары гэтай вёскі пра возера расказваюць такую легенду. Даўным даўно на месцы сучаснага возера была вёска з дзвюма вуліцамі, якія перасякаліся. Аднойчы ў гэту вёску прыйшла бедная жанчына. Яна хадзіла па хатах і жабравала. Але людзі яе не вельмі ветліва сустракалі  зневажалі, некаторыя адмаўляліся даць кавалачак хлеба ці бульбінку, сякое-такое адзенне.

Жанчына добра разумела, што жыхары гэтай вёскі і самі жылі не вельмі багата. Тым не менш ёй было да болю крыўдна, што яе так зневажалі. Жанчына ішла і моцна плакала. Але раптам з крайняй хаты выйшаў мужчына і паклікаў незнаёмку ў хату, накарміў яе і даў яшчэ хлеба на дарогу. Здзіўленая жанчына была вельмі ўдзячна за такую дабрыню, шчырасць і міласэрнасць. Яна запытала гаспадара: "Хто яшчэ жыве з вамі ў гэтай добрай хаце?". Мужчына адказаў, што жонка яго памерла ўжо даўно, а ён жыве з сынам-падлеткам. Тады жанчына папярэдзіла: "Бярыце свайго сына і як мага хутчэй уцякайце з гэтай вёскі, бо ваша вёска хутка правaліцца ў бездань і загінуць усе людзі разам з усёй маёмасцю. Ідзіце з сынам на гару, якая бачна з вёскі на поўнач гледзячы, але не аглядайцеся на сваю хату".

Мужчына з сынам паслухалі жанчыну і хуценька выйшлі з вёскі на гару, але не вытрымалі і азірнуліся. Вёскі ўжо не было, а замест яе стала возера, а дзе былі дарогі там засталася гладзь вады. А бацька з сынам ператварыліся ў два камені-валуны, меншы камень-сын, большы камень-бацька. І цяпер гэтыя валуны ляжаць на ўскрайку вёскі Клепачы Слонімскага раёна. Людзі іх і сёння называюць бацькам і сынам. А возера сталі называць Бяздонным, бо вёска правалiся ў бездань. І да сённяшніх дзён ніхто ў ім не можа вымераць глыбіню і дастаць да дна.

**Гарадок**

Адно і гарадзішчаў каля вёскі Ніз Слонімскага раёна людзі называюць Гарадок. Паводле легенды, якую расказваюць жыхары вёскі Ніз, калісьці тут быў горад, у якім жылі вельмі моцныя і дужыя людзі. Яны вырывалі сасновыя дрэвы з каранямі і хадзілі, абапіраючыся на іх, як на кійкі. А ў паўднёва-ўсходнім раёне Гарадка збіраліся бесы і спявалі "бандуркі". Іх страшэннае выццё наводзіла страх на ўвесь Гарадок. А непадалёк ад Гарадка на "страпчым перавозе" адбываліся забойствы і рабаўніцтвы. А побач стаяў тракцір, дзе ў якасці ежы прадавалі чалавечае мяса. Адзін святар пракляў гэтую мясцовасць. Пасля праклящця каля Гарадка ўтварылася вялікая адтуліна, якая вяла ў бездань. З бездані ўсе чулі рыканне жывёл і д'ябальскія енкі. Пасля ўсяго гэтага, моцныя і дужыя людзі з Гарадка спалохаліся і разбегліся хто куды і пасяліліся яны ў іншых месцах. А тое месца цяпер называюць Гарадок.

**Бяздонка**

Паміж вёскамі Ісаевічы і Дзераўной Слонімскага раёна ёсць прыгожае лясное возера Бяздонка. Ні адзін ручай не ўпадае ў гэта возера і не выцякае з яго. А зімою возера ніколі не замярзае. Пра Бяздонку жыхары вёскі Дзераўная расказваюць такое паданне. Даўным даўно жыў у вёсцы Ісаевічы багаты і ганаровы пан. Трымаў у сваім маёнтку вельмі шмат нявольніц прыгожых беларускіх дзяўчат. Жылося ім тут вельмі цяжка. Пан і яго падпанкі здзекаваліся з дзяўчат. Аднойчы гаспадар моцна зазлаваўся на прыгажунь, а ў адной з іх ён схапіў трохгадовага сына і кінуў у возера. Да возера пан нікога не падпускаў, пакуль хлопчык не захлынуўся вадою. Маладая маці доўга шукала сына, каб пахаваць. Але возера было такое глыбокае, што дна ніхто не мог дастаць. Возера страшна шумела, вада была чорная, як сажа. Не вытрымала маці свайго вялікага гора і ўтапілася. Вада ў возеры з таго часу чыстая-чыстая і падобная да матчыных

слёз. Ды і да дна ніхто не можа дастаць.

**Гарадзішча каля Збочна**

Паводле мясцовай легенды гарадзішча каля вёскі Збочна Слонімскага раёна звязана з закапаным скарбам, які ноччу свеціцца. А была справа так. Нейкі салдат, які ў гэтай мясцовасці прымаў удзел у бітве, аднойчы закапаў ваенны залаты скарб. Прайшло шмат гадоў. Калі ён стаў старым, то успомніў закапаны скарб і прыехаў сюды, каб яго адшукаць. Калі ён падышоў да гарадзішча, то ўбачыў, што ўжо не растуць альховыя дрэвы, пад якімі быў закапаны скарб. Стары салдат пачаў шукаць скарб, але дарэмна. І тады ён сказаў мясцовым людзям пра золата і, калі хто яго знойдзе, то хопіць ім і іх нашчадкам. Людзі кажуць яшчэ, што чатыры разы ў суткі  вечарам, ноччу, раніцай і ў поўдзень  многія бачылі, як прасушвалі скарб.

P.S. *Паданні запісаныя ад маці  Чыгрын Евы Захараўны, ад слонімскага настаўніка Ракевіча Мікалая Іванавіча і ад жыхароў тых вёсак, пра якія згадваюцца паданні.*

**Тамаш Ліпаман**
**Легенда аб плакучай вярбе**

У малой хацінцы над Нарвай жыла з трыма дарастаючымі сынамі блакітнавокая ўдава. Яе ільняныя валасы срэбрам асыпалі клопаты. Дом, распаложаны на высокім рачным адхоне акалялі шырокія аж па гарызонт вільготныя лугі, парослыя купамі вербаў, бяроз і вольх. Цяжка было пракарміцца жанчыне з трыма хлопцам з малой гаспадларкі. Маці наймалася на службу ў багацейшых гаспадароў, каб гарантаваць сям'і прыстойнае жыццё. Адзінай мэтай жыцця ўбогай жанчыны было выхаваць сыноў на сумленных людзей. У свабодныя ад цяжкай працы марыла аб хвіліне шчасця на іх вяселлях ды каб пабачыць перад смерцю ўсміхнутыя тварыкі ўнучанят.

На пачатку красавіка над блакітнай плынню ракі загасцявала вясна, напаўняючы свет спевам жаўрукоў, колерам лотаці і пахам аеру. Не была, аднак, гэта вясна, якая несла адно толькі радасць. Разам з вяртаючыміся над нарваўскія балоты буслямі несла яна злавесна гучаўшы пошчак капыт набліжаючайся арміі. Вораг з усходу напоўніў ідылічную краіну брэзгатам зброі, енкамі жанчын, поблескам пажараў. Наезнікі не шкадавалі ні дзяцей, ні жанчын. Грабілі гарады і вёскі, усюды шукаючы здабычы і задаволення дзікіх жарсцяў.

У той час толькі шляхетна народжаныя мелі прывілею несці абарону межаў Айчыны. Сітуацыя перарасла аднак пануючыя звычаі. Пры пагрозе каралеўскай вялікасці паклікалі на ваенную службу ўсіх юнакоў, здольных насіць зброю. Тых, хто выжыве, чакала вялікая ўзнагарода герб які быў роўны вызваленню ад паншчыны ды ідучыя за гэтым рыцарскія прывілеі. Першы на ваенную службу накіраваўся сярэдні сын трынаццацігадовы Дабраслаў. Такіх маладых хлопцаў, аднак, на службу не бралі. Найстарэйшы брат Збышка быў прыняты пад харугву без засцярог. Хлопец, якому было толькі пятнаццаць вёсен, меў выгляд старэйшага. Матуля дала яму бохан хлеба, скібку сыра і блаславенства на дарогу. Праз некалькі месяцаў прыйшла страшная навіна. Збышка загінуў у адной з сутычак з ворагам. Не мінула шмат часу і армія прыгарнула сярэдняга Дабраслава, які рашыў
помсціць брата. Непадрыхтаваны да ваеннага рамяства юнак загінуў неўзабавае ў ваколіцах Тыкоціна. Маці хлопца, атрымаўшы вестку аб смерці другога сына, асівела за адну ноч. Сэрца ён лопнула б ад жалю, калі б не адзіная надзея залатавалосы Мсьціслаў, самы ўлюбёны сын. Убогая жанчына рашыла любой цаной ратаваць ад раптоўнай смерці сваё самае меншае дзіця. Вораг, аднак, не

пакідаў межаў Рэчы Праспалітай.

Зарыва пажараў рассвятляла амаль штоноч шырокія па гарызонт наднарваўскія мурагі. Кожны дзень прыносіў весткі аб новых гвалтах і грабяжах у спакойнай гадамі краіне. Людзі жылі ў пастаянным страху перад ардамі наезнікаў з усходу. Ніхто не араў урадлівую зямлю. Ніхто не збіраў плёну. Людзі хаваліся па лясах, пакутуючы ад страшнага голаду і паняверкі. Надышла суворая зіма. Навакольныя мужыкі, пазбаўленыя запасу зерня, вырэзвалі рэшткі статкаў, каб пракарміць аслабленыя голадам сем'і. Убогая ўдава, разам са сваім апошнім з сыноў, трапіла ў страшную нэндзу. Усё, што ёй засталося, гэта была хацінка над берагам ракі і залатавалосы Мсьціслаў. Пад канец снежня жанчына стала перад найцяжэйшым жыццёвым выбарам. Або абое памруць ад голаду, або вышле сваё апошняе дзіця на вайну. Армія гарантавала салдатам, нават у такі страшны час, харчаванне і шанц гонараў рыцарскага стану. Жанчына, маючы перад сабой магчымасць галоднай смерці абодвух, адправіла апошняга сына ў армію.

Чарговая вясна не прынесла шмат надзей. Неабсеяныя палеткі парaслі пустазеллем. Навакольныя аборы і хлявы не запоўніліся чарговым пакаленнем хатніх быдлят. Палявымі дарогамі вандравалі людзі ў пошуках уцёкаў перад лютым ворагам. Разам з надыходам лета чарговы страшэнны ўдар зваліўся на бедную ўдаву. Мсьціслаў загінуў на полі бою. Жанчына, страціўшы апошнюю надзею, пабегла на бераг Нарвы, каб у яе плыні знайсці патолю. На беразе рвала валасы з галавы і праклінала багоў, якія так бязлітасна з ёю абышліся. Плач і праклёны пачула русалка Нірвэ, якую ўпадабаў сабе гадамі таму нарваўскі Топнік і даў ёй моц заклінання людзей. Водная німфа, ці то ад літасці, ці для звычайнага капрызу, бо ж вядома, чалавечыя справы русалкам абыякавы, перамяніла маці ў роспачы ў плакучую вярбу.

Хто верыць, што ў такіх вербах чэрці маюць хаты і хаваюць там скарбы. Цяжка сказаць, колькі ў гэтым праўды, тым не менш вядома, што з вярбовай драўніны ніколі не рабілі зброі, ці то з-за яго крохкасці, ці па іншай прычыне.

**Анна Шпакоўская**

**Чорная Вёска, Залатая Вёска, Рудая Рэчка**

Легенду, якая гаворыць аб маёй вёсцы і найбліжэйшых ваколіцах я пачула ад бабулі, калі я была яшчэ дзіцём. А бабця расказвала так: Некалькі стагоддзяў таму адзін з літоўскіх князёў, што любіў паляванні і пушчанскія прыемнасці, рашыў заглыбіцца ў агромністыя бары (якія сёння належаць Белавежскай і Кнышынскай пушчам) каб пераканацца, як далёка яны даходзяць. А выбраўся ён на паўднёвы захад.

Перыяд паляванняў пачынаўся познай восенню, калі на звярах была добрая зімовая футра. Хацеўшы пакарыстацца прыгожай асенняй парой, выбраўся той князь у паход з усёй сваёй світай. З харчамі не было цяжкасцей, бо і коней было чым папасвіць, а і сабе ўпаляваць у лесе звяра.

Абыходзячы агромністыя бары, натыкаючыся на розныя натуральныя перашкоды ў выглядзе багнаў і струмянёў, позняй восенню дайшлі яны да нашага старония. Зноў нарваліся на багны, з якіх брала выток рэчка. Вада ў ёй была цёмная не было відаць дна  ды добрая. Назвалі тую рэчку Чорнай і рушылі з яе плынню. Дайшлі да ваколіцы, дзе канчаўся лес, пачыналіся палеткі і немалое паселішча. Жыхары паселішча займаліся вырабам посуду, дахоўкі і іншых рэчаў з гліны. Князь са світай былі цешыліся  маглі адпачыць, запасціся ў корм для коней і страву для сябе. Маглі аддыхнуцца і збірацца ў дарогу назад, бо ж набліжаліся Каляды. Гэтыя святы князь рашыў правесці дома, адпачнуць, а пад канец зімы рушыць зноў. Падганяла яго цікаўнасць: калі дайсці яму да канца лесу, якія людскія сялібы ўбачыць. Ад'язджаючы, князь назваў безыменнае паселішча Чорнай Вёскай, ад Чорнай рэчкі, якая сюды іх прывяла.

Зіма была цяжкая, марозная, снежная ды да таго працяглая. Нецярплівы князь рушыў, калі яшчэ ўсюды ляжаў снег, а календарная вясна ўжо была блізка. Хацеў дабрацца ў тыя бакі, куды даехаў быў восенню і рушыць далей. Снег, які стаў тапіцца і топкая тэрыторыя прымусілі збочыць яго з абранага шляху. Натрапілі на агромныя багны, залітыя ў некаторых месцах ржавай вадой. З вялікімі цяжкасцямі перабрылі гэтыя багны і дабраліся да месца, дзе жылі людзі. Не было гэта вялікае паселішча, адно пара хатаў паміж дрэвамі, дзе жылі людзі, апрацоўваючыя зямлю выдзертую ад лесу, якія карміліся тым, што далі ім зямля і лес.

Князь, стомлены вандроўкай праз багонны лес,  назваў маленькае паселішча Рудая Рэчка. Раздумваў: чаму вада ў багне і ў патоку, які з яе выплываве,

такая рудая і на ёй такія тлустыя плямы: ці не ад зямнога алею, а, можа, ад жалезнай руды?

Каля Рудой Рэчкі былі раскінуты тры гаспадаркі. Жылі тут роды з трыма прозвішчамі. Кожны род дбаў аб свой быт, каб сям'я развівалася, была шматлюднай і згоднай. Князь жартам назваў гэтыя тры сем'і Златорыяй, бо згода ў сям'і і яе развой золата. Былі гэта роды Бучынскіх, Вільчэўскіх і Сікорскіх.

Наступіла вясна. Час веснавых пасеваў і блізкага свята Уваскрэсення Гасподняга. Князь, шчаслівы, хацеў дабрысці да канца лесу і павярнуць дамоў. Засталося яшчэ крыху твані і рэчка. З імі ў паўднёва-ўсходнім напрамку даехаў князь на высокую гару, мінаючы ля яе падножжа малое паселішча. За гэтай гарой і яшчэ кавалкам лесу былі ўжо палеткі і ўжо не дробныя паселішчы, а стаяў агромны град. Князь вярнуўся ў безыменнае, амаль лясное паселішча, каб там правесці Вялікдзень, адпачыць і вярнуцца дамоў. Быў рады, што ўдалося яму дайсці да мэты і назваў гэтае паселішча Залатой Вёскай.

**Ала Петрушкевіч**
**Антанёва. Легенды і былі лясной вёскі**
***(Фрагменты)***

Антанёва – вёска ў глыбіні Налібоцкай пушчы, дзівосная казка майго дзяцінства, Радзіма матулі. Мая светлая радасць, але і глыбокі смутак: Антанёва памірае. Як даўно няма ні бабулі і дзеда, і назаўсёды пайшла мая мама. Усё тут для мяне – адна цікавая, таямнічая легенда, што вырасла з аповедаў бабулі і мамы.

***Пачатак***

Пра заснаванне Антанёва ў нетрах вялікай, тады не абжытай пушчы, расказвае легенда, у аснове якой – рэальныя падзеі. Было тое ў XIX ст. Гаспадар тых абшараў, незадаволены паводзінамі сваіх прыгонных, беларусаў, што яшчэ здольны былі прагнуць волі, вырашыў высяліць з недалёкай вёскі пяцярых самых непаслухмяных мужыкоў разам з сем’ямі. Выбраў у пушчы паляну, яе пазней расшырылі, павысякаўшы дрэвы (лес у большасці сваёй хваёвы), прыказаў перасяліцца туды Бандарыку, Ульянку, Клаўсуцю, Лядэцкаму, Васілеўскаму. Усе паляўнічыя, народ працавіты, гаспадарлівы, у кожнага дзетак поўная хата. Паціху пабудаваліся, землі падзялілі, гэткія ж паляны між лесу, і сталі жыць. Зрэшты, у гэтай легенды два варыянты: у аснове сваёй песімістычны, антыгуманны і, наадварот, светлы, гуманны, аптымістычны. Быццам адсяліў пан у лес мужыкоў па іх волі, дапамагаючы працавітым і самастойным мужчынам стаць на ногі, адчуць сябе гаспадарамі, пазбавіцца цеснаты і беззямелля – спрадвечных прычынаў нядолі беларускага народа. А яшчэ жадаючы, каб гэтая непраходная пушча ажыла, каб загучалі тут чалавечыя галасы. Гэтак і сталася. Да сярэдзіны XX ст., апроч Антанёва, існавала мноства лясных хутароў, маёнткаў, цэлыя паселішчы, такія, як Рудня, Чорная. У 30-я гады пабудавалі нават шашу – прамы шлях да Стоўбцаў. Гэты варыянт легенды мне асабліва блізкі.

А звалі таго пана Антон. Адсюль – Антанёва. З пашанай і ўдзячнасцю да мудрага гаспадара.

***Ціхова***

Ужо сама назва гучыць як песня. Таямнічае, загадкавае месца. Колішні багаты маёнтак між пушчы, непадалёку ад Антанёва. Мне ў дзяцінстве давялося пабачыць толькі сляды былой велічы: здзічэлыя кусты бэзу, зарослая сажалка,

падмурак палацу, скеп, у якім жыў чалавек – апошні жыхар Ціхова, яго верны слуга, што мог вартаваць толькі мінулае, які не пажадаў сыйсці адсюль, калі, пакінуты гаспадарамі ў 1939 годзе, маёнтак быў разрабаваны і знішчаны.

Мы з бабуляй хадзілі туды па сон – яшчэ адзін цуд, таямнічая кветка, дасканала прыгожая, колеру няяркага блакіту, што цвіце толькі там, дзе няма тлуму, гáласу, дзе заўсёды спакой і ціш. Таму ўсялякія спробы перасадзіць сон у гародчык – марныя. Ціхова ж было месцам ідэальным для кветкі сон. Мне прыкра чуць “правільную” назву – “сон-трава”, бо гэта ніякая не трава, а менавіта кветка. Ніхто і ніколі ў Антанёве не абазваў сон травою. У параўнанні з іншымі першымі вясновымі праскамі гэтая ўяўлялася мне велічнай княгіняй ці соннай царэўнай між сціплых пралесак-пакаёвак ці жоўтай лотаці-ахмістрыні.

У 30-я гады Ціхова належала слаўнаму доктару-мецэнату, што быў спецыялістам хіба ва ўсіх галінах медыцыны. Мама ўспамінала, як прыйшлі яны аднойчы з бабуляй да пана доктара. Мама — маленькая, вельмі кволая. Прызнаў залатуху. Сказаў лячыць праз добрае харчаванне. Даў пігулкі, вітаміны. І да бабулі: “У Вас прыгожыя зубы. Але — камні. Давайце здыму”. І тут жа зрабіў гэтую стаматалагічную працэдуру. Глянуў у вакно: “А вось ідзе чалавек, усе праблемы якога знікнуць, калі ажэніцца”. Развітаўшыся, мама з бабуляй сустрэлі ў двары старога вясковага кавалера. Які і праўда, хутка ўзяў шлюб. І стаў здаровым. Мама ўсё дзівілася, як лекар, не ведаючы чалавека, толькі глянуўшы здалёк, гэткі своеасаблівы дыягназ паставіў і лячэнне вызначыў. За лячэнне доктар грошай не браў. Клікаў вяскоўцаў на працы ў поле. Ішлі з ахвотаю, бо кожны быў удзячны добраму пану лекару.

Ціхова было набыта для хворага на лёгкія малодшага лекаравага брата, бо сасновы бор — найлепшыя мясціны для сухотнікаў. Каб падоўжыць жыццё любаму брату. Аднак ад лёсу не ўцячэш. Тут малады лекараў брат знайшоў сваю пагібель.

У Антанёве ў тым часе (30-я гады) у школе працавала вельмі прыгожая маладая настаўніца. Антанёўцы любілі тую мілую дзяўчыну. На ўсе вяселлі запрашалі яе як ганаровую, жаданую госцю. Казалі: “На вяселлі самымі прыгожымі былі маладая і пані вучыцéлька”. Гэтая прыгажуня і стала згубай для лекаравага брата. Пані настаўніца ўжо мела суджанага. Гэта была яе таямніца. Ніхто не ведаў. Жаніх быў дзесьці далёка. Вайсковец, афіцэр. Невядома, як ставілася настаўніца да кахання лекаравага брата. Падаецца, гэта было шчырае шкадаванне. Была шляхетнай, прыстойнай, спагаднай дзяўчынай. Ад свайго суджанага даставала лісты. Сама атрымоўвала на пошце ў мястэчку. Відаць, баялася, каб не трапілі ў чужыя рукі. І тым разам пайшла па чаканую вестачку. Узяла ліст і пачала чытаць. А ў гэтую хвіліну на пошту літаральна ўрываецца той, хто кахае яе, хто без яе не ўяўляе свайго жыцця. Вырывае з яе рук ліст, чытае. А там — мары пра будучае, размова пра шлюб, дамова пра ад’езд... Дастае рэвальвер і страляе ў сваю каханую, якая і гіне на месцы. А сам вяртаецца ў Ціхова. Адна з соснаў стала ягонай шыбеніцай...

Вось жа — сёння здзічэлыя бэзавыя кусты былі сведкамі таго цікавага, часам трагічнага, багатага на падзеі жыцця.

Не заўсёды ў Ціхове было ціха…

***Дзякуй табе, сястрычка…***

Гэта таксама было ў трыццатыя гады. У адной сям’і нарадзіўся хлопчык.

Прыгожы тварык, разумныя вочкі. Але замiж ручак і ножак – неразвітыя кульці. Вырашылі бацькі: не мусіць ён жыць, бо і сам будзе пакутаваць і ім гэткае гора перад вачыма трываць праз усё жыццё. Няхай Божанька забярэ яго. Вырашылі не даваць ні есці, ні піць.

Хлопчык увесь час плакаў. Засынаў, знямогшыся. Пасля ізноў. Сыходзілі з хаты, каб не чуць. Была ў той сям'і маленькая дзяўчынка. Дзіцячае сэрца спагадлівае. Калі ніхто не бачыў, падышла да брацiка і дала яму з лыжкі вадзічкі напіцца.

Дзіцятка памерла на трэція суткі.

А ноччу прыснілася яно дзяўчынцы. Маленькі брацік сказаў: "Дзякуй табе, сястрычка, што вадзіцы мне дала. Адна ты мяне пашкадавала…"

Вось жа гэткім было ў антанёўцаў разуменне гуманізму.

***Айцец Віталь***

Гэтае імя мелі многія хлапчукі не толькі ў Антанёве, але і ў іншых вёсках Ярэміцкай парафіі. Гэтак назвалі і майго дзядзьку. Праўда, у вёсках іх клікалі Віцямі.

Гэтак звалі святара Ярэміцкай царквы. Вельмі шанаваў тутэйшы люд свайго бацюшку. Ласкавым, спагадлівым быў. Віталь Арсенавіч Жалезняковіч, родны брат праслаўленага Янкам Брылём Паўла Арсенавіча Жалезняковіча, героя нарыса "Сэрца камуніста". Рознымі шляхамі пайшлі браты. На долю айца Віталя выпала шмат выпрабаванняў. І гулагаўскія пакуты таксама.

Вельмі сумавалі вернікі, калі перавялі яго ў далёкія ад нашай Карэліччыны Гудзевічы.

Мама згадвала, як аднойчы яны з бабуляй правініліся. Мелі ладны кавалак зямлі далёка ад Антанёва, кіламетраў дзесяць будзе, паміж Турцом і Ярэмічамі. Бабуліна пасажнае поле, недалёка ад яе родных Лядак. Было тое ў разгар жніва. Жалі пры самай дарозе, старадаўнім шляху між двума мястэчкамі. За пільнай працай бабуля, шчырая верніца, зусім забылася, што на той дзень выпадала вялікае хрысціянскае свята. Разагнулі спіны і застылі на месцы: па шляху ідзе цэлая працэсія святароў з Ярэмічаў у Турэц. Да іх набліжаюцца. І хавацца ўжо не выпадала. Які сорам, ганьба, грэх І найперш няёмка перад шаноўным айцом Віталем. А ён, параўняўшыся з збянтэжанымі жнеямі, толькі са скрухай спытаў: "Няўжо Вы не хрысціяне?" Гэтае яго ціхае пытанне-ўшчуванне было для маіх родных цяжэй за ўсякую абразу ці крык. Такога ярэміцкі святар не дазваляў сабе ніколі…

Колькі еду па гэтым шляху, столькі перад вачыма маімі стаяць пры дарозе ў недажатым збожжы дзве дарагія мне жнейкі: прыгожая, статная, моцная, тады яшчэ зусім маладая, якой мне яе ведаць не давялося, мая бабуля Маня і зусім яшчэ маленькая, дэбютантка на жніве, кволая дзяўчынка гадоў шасці з маленькім сярпом – мая мама Валя, будучая настаўніца Валянціна Пятроўна...

*Напісана паводле ўспамінаў маёй бабулі, Марыі Рыгораўны Бандарык, ураджонай Кеды з вёскі Лядкі, і мамы, Барэйка Валянціны Пятроўны, ураджонай Бандарык з вёскі Антанёва. Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.*

**Тамаш Ліпаман**
**Два браты**
***Легенда з Кнышынскай пушчы***

Некалькі кіламетраў на паўночнам захадзе ад Беластока, на возеры Камоса знаходзіцца невялікі зарослы востраў. Подступы да яго бароніць гушчар шыпшыны і цёрну.

З даўніх часоў жыў тут у ваколіцы стэльмах, якога называлі Рудабародым. Быў ён чалавекам працавітым і з часам набыў сабе прыгожы дом з вялікім кавалкам зямлі і садам навокал. І быў бы ен, пэўна, задаволены жыццём, калі б не ягоная вялікая нясмеласць яго да супрацьлеглага полу. І менавіта гэта яго рыса была прычынай таго, што нягледзячы на ўзрост, ен веў самотнае жыцце. Рудабароды меў брата Збышко, гуляку і буяна. Збышко любіў віно, жанчын і спевы, а жанчыны любілі яго вясёлую кампанію.

Аднойчы вясною Рудабароды спаткаў на беразе возера незвычайна прыгожую дзяўчыну і закахаўся ў ей без памяці. Аднак жа яго нясмеласць не дазволіла яму прасіць яе рукі, хаця ен вельмі прагнуў гэтага. Гэтай самай вясной і Збышко пазнаеміўся з Галенай, так менавіта звалі дзяўчыну, на гулянцы ў Супраслі. Маладыя людзі спадабаліся сабе адно аднаму і хутка сталі каханкамі. Збышко хацеў нават ўзяць шлюб з дзяўчынай і пасталець, але не меў ніякага маёнтку. Бацька дзяўчыны не хацеў нават слухаць нічога а шлюбе з галадранцам, і каханкі сустракаліся патаемна. Месцам сходак выбралі яны горку, парослую бярозамі на самым беразе возера Камоса. Рудабароды, пераносячы пякельныя мукі, хаваўся паблізу вечарамі і падглядваў за каханкамі. Чым даўжэй гэта цягнулася, тым больш злосць і нянавісць раслі ў сэрцы нясмелага брата. Ен перажываў мукі няздзейсненага кахання і адчуваў, як як спальвае яго ўнутраны агонь.

Аднойчы вераснёвай ноччу, падглядаючы за каханкамі, ён зразумеў, што толькі смерць можа пакласці канец яго пакутам. Спачатку ён хацеў забіць сябе. Купіў канапляны шнур і выбраў салідное дрэва паблізу возера. Але калі дайшло да здзейснення самагубства, Рудабароды спужаўся пякельных мук, якія чакаюць самазабойцаў і рашыў забіць брата, а потым дабіцца Галены. Наступнай ноччу стаіўся паблізу месца сходак і чакаў калі з'явіцца брат. Над востравам уставаў месяц, калі з бору паблізу данесліся першыя крокі маладых. Рудабароды адчуваў, як кашуля прыліпла да яго плячэй, а пальцы дранцвеюць пад цяжарам вялікага камня, якім ён хацеў забіць брата. Калі змоўклі совы, да вушэй стэльмаха даляцеў шэлест набліжаючыхся ў цемры крокаў. У той момант, калі постаць прыблізілася да

дрэва, за якім хаваўся Рудабароды, ён выскачыў на сцежку і, равучы як звер, імгненна ударыў. Першы раз ад часу таго ракавога вясенняга вечару, калі ён упершыню ўбачыў Галену, Рудабародаму стала лягчэй. Месяц асвяціў ляжачую постаць. У бледным месячным сяйве ляжала Галена.

Аб тым, што было далей, ведаюць толькі лясныя дрэвы. Ніхто з ваколіц не бачыў больш Рудабародага. Аднак людзі кажуць, што ў вераснёвыя ночы, калі месяц у поўні, з вострава на возеры чуваць дзіўныя водгаласы. Часам плач, часам жудасны крык.

**Генадзь Прудзілка**
**Сіцыліянская абарона**

У невялікай вёсачцы на Лідчыне жылі дзядзька Васіль і цётка Марыля. Абодва размянілі ўжо восьмы дзесятак, але ж трымалі хатнюю гаспадарку – кароўку, пару парсючкоў, такую-сякую птушку. А як жа жыць у вёсцы і не мець гаспадаркі, калі яшчэ ёсць сілы. Дзеці жывуць у горадзе, але прыязджаюць дапамагчы бульбу выбраць, альбо кароўку адпасвіць. На лета прывозяць унукаў, каб дзядуля з бабуляй не сумавалі.

Цётка Марыля на працу ў саўгас ужо даўно не хадзіла, але дзялку буракоў брала. Дзядзька Васіль таксама на заслужаным адпачынку быў, але ж улетку па просьбе дырэктара саўгаса дапамагаў пры нарыхтоўцы саломы. Ніхто так хараша не мог паставіць сцірту саломы як ён. Гэта зараз практычна ўсё робіцца сельскагаспадарчымі прыладамі аўтаматычна, а тады не. А ўзімку ў яго таксама быў занятак – догляд саўгаснай бульбы ў капцах.

Гэта праца была не вельмі цяжкая, але ж адказная. У капцах ляжала апрача насеннай яшчэ і бульба, якая ішла на перааприцоўку на саўгасны спіртзавод. Дзядзька Васіль тупаў амаль цэлы дзень каля капцоў. Пры марозным надвор’і шчыльна зачыняў саломай і падсыпаў снегу, а пры адлізе адчыняў, каб бульба не спарылася.

Узімку светавы дзень вельмі кароткі, але ж яго хопіць, каб стаміцца старому чалавеку, трохі змерзнуць. Старая кроў, як кажуць, ужо не грэе. Вось таму дзядзька Васіль заходзіў ў памяшканне да вартаўніка, каб крыху сагрэцца. Але ж які абагрэў без гарэлкі? Збіралася невялічкая кампанія, скідваліся па яшчэ тады савецкаму рублю – куплялі некалькі пляшак гарэлкі альбо віна. Гэтым грэліся. Бывала, што і дырэктар спіртзаводу даваў дзядзьку Васілю за працу паўлітра спірту, як ён казаў “на націранне”. Але ж гэты спірт дзядзька бадай ніколі да хаты не прыносіў. Бо колькі гарэлкі не бяры, заўжды ў кампаніі пры выпіўцы яе мала бывае.

Апасля такога “сугрэву” дзядзька Васіль прыходзіў да хаты добра п’яны. І вось каб жонка-цётка Марыля не сварылася, ён абыходзіў разы з тры вакол сваёй сядзібы па снезе і толькі апасля гэтага заходзіў у хату. Суседзі як убачаць, што дзядзька Васіль топча снег вакол хаты – ведаюць – Васіль п’яны, будзе ў яго хаце лаянка. Дзядзька  цётку Марылю не баяўся – гаспадар жа ён у сваёй хаце. Але як гаворыцца ў прымаўцы “воўк сабакі не баіцца, звягі не хоча”. Бывалі выпадкі, што лупцаваў ён цётку Марылю, але ж гэта было ў маладосці. Але ж зараз не тая сіла і не

тыя гады…
Ну дык вось, заходзіў дзядзька ў хату і адразочку крычаў на цётку з парогу:

— Марыля Трасца табе ў бок, хто ў цябе быў?

— Ды нікога, Васілёчак Суседка забягала за запалкамі, — адказвала цётка Марыля.

— Да цябе прыходзіў твой каханы з суседняй вёскі. Не мані мне, я бачыў сляды вакол хаты Дзе ты яго схавала? Адказвай — гнуў сваё дзядзька Васіль і як завяршальны аргумент — стукаў кулаком па сталу.

— Ну супакойся, Васілёчак Нікога ў мяне не было. Я праўду табе кажу. Ляж адпачні, ты ж стаміўся на працы, а я хуценька прыйду, — казала цётка Марыля, а сама бегла ў камору і там, з толькі ёй адной вядомай хованкі, даставала прыхаваную на "чорны" дзень бутэльку гарэлкі, і хуценька несла дзядзьку Васілю. Дзядзька ўжо ведаў: пабегла ў камору — сварыцца не будзе. Дзядзька выпіваў кілішак-другі і клаўся спаць.

Але вось што дзіўна: адкуль мог ведаць дзядзька Васіль — гэта малапісьменны — пра "Сіцыліянскую абарону"? Пэўна, нутром адчуваў, што найлепшая абарона — гэта нападзенне. Дзядзька ў сваім жыцці ніколі не быў у Сіцыліі, не іграў у шахматы, на той час не меў тэлевізара, але ж проста меў нейкую жыццёвую сялянскую мудрасць. Вось такая сялянская "Сіцыліянская абарона". Што характэрна — гэтую абарону ён рабіў кожны раз, калі нап'ецца. Узімку выходзіла значна лепш, бо быў "доказ" здрады цёткі Марылі — сляды, якія сам жа і таптаў вакол сваёй сядзібы.

Гэтую гісторыю я чуў ад сваёй бабулі Надзеі Васільеўны Фіясь, якая жыла ў адной вёсцы з дзядзькам Васілём і цёткай Марыляй. Вёска гэта завецца Гасцілаўцы Лідскага раёна Гродзенскай вобласці. Потым як падрос сам быў сведкам гэтай "Сіцыліянскай абароны", бо прыходзіў гуляць да ўнука дзязькі Васіля і цёткі Марылі. Усе дзеянне прыкладна так і было, толькі словы лаянкі і іх размовы трохі з цягам часу цалкам змянілася — не запамятаў дзіцячы розум. Маёй бабулі Васіль сапраўды быў дзядзькам — радня. Ну а мне як вядома ўжо лічыць яго прадзедам. Дык вось што датычыцца асобы дзеда Васіля — гэта быў дзіўны чалавек. Дзіўны чалавек. Ён нават здымаўся ў кінастужцы "Анюціна дарога", дзе іграў лічы адну з галоўных роляў — кулака Васіля. На пляцоўцы панавала вясёлая атмасфера. І па словах сведкаў з дзедам Васілём здаралася многа гісторый.

Вось таму я вырашыў расказаць пра гэтага простага чалавека, які ўсё жыццё працаваў. Таму што з такіх вось маленькіх гісторый, здарэнняў і складваецца ГІСТОРЫЯ ўсёй Беларусі.

# Змест

Рафал Сянко. Златарыя.......................................................................................
Канстанты Казлоўскі. Дзе Плоскай вада рве берагі............................................
Тамаш Здрайкоўскі. Бераг.....................................................................................
Тамаш Ліпаман. Пазначаны дзік...........................................................................
Сільвія Русіняк. Пра чалавека, які не пайшоў у неба, а
і ў пекле на хапіла месца для яго............................................................................
Тамаш Пётр Краўчук. Татка, чапаная!...................................................................
Тамаш Ліпаман. Сыч..................................................................................................
Альжбета Андрулевіч. Златарыя.............................................................................
Тамаш Ліпаман. Легенда пра каралеву дрэў.........................................................
Таццяна Трахімчык. Легенда пра Услонім-гарадок..................................................
Генрык Цыпрыян Конкаль. Над Прэголай і Нёманам............................................
Тамаш Ліпаман. Аповед пра белавежскія курганы................................................
Тадэвуш Хармушка. Ганчак......................................................................................
Тамаш Ліпаман. Белавежскія месцы моцы.............................................................
Барбара Пашкоўская. Пра тое, як хлеб усталяваў справядлівасць.......................
Тамаш Ліпаман. Імгла................................................................................................
Вераніка Багалейша. Легенда пра Поразава..........................................................
Юліта Сакоўская. Гісторыя Гаўрыіла.......................................................................
Станіслаў Беркус. Ліда. „Арлінае гняздо”...............................................................
Станіслава Лаеўская-Шыплюк. Нёман і Свіслач дзве ракі.....................................
Уладзімір Прыхач. Легенда аб Крэве.......................................................................
Тамаш Ліпаман. Нятупа.............................................................................................
Яцэк Даневіч. Легенда аб Дзіванне...........................................................................
Тамаш Ліпаман. Вёска Кандыцыя.............................................................................
Караліна Шарлат. З Падляшша...................................................................................
Тамаш Ліпаман. Пунсовая карчма.............................................................................
Сяргей Чыгрын. Слонімскія паданні і легенды.........................................................
Тамаш Ліпаман. Легенда аб плакучай вярбе............................................................
Анна Шпакоўская. Чорная Вёска, Залатая Вёска, Рудая Рэчка..............................
Ала Петрушкевіч. Антанёва. Легенды і былі лясной Вёскі.....................................
Тамаш Ліпаман. Два браты........................................................................................
Генадзь Прудзілка. Сіцыліянская абарона................................................................